Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў

**Ж. Л. Раманава**

# ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ РЭСУРСЫ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

Вучэбна-метадычны дапаможнік

*Рэкамендавана вучэбна-метадычным аб'яднаннем*
*па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў*
*у якасці вучэбна-метадычнага дапаможніка*
*для студэнтаў спецыяльнасці*
*1-23 01 11 Бібліятэчна-інфармацыйная дзейнасць (па напрамках)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2020

УДК 025:004:821.161.3(075.8)
ББК 78.555:84(4Беи)я73+78.555:83.3(4Беи)я73+78.373.8:84(4Беи)я73+78.373.8:83.3
(4Беи)я73
Р 21

Р э ц э н з е н т ы:
*Ю. А. Пераверзева,* загадчык аддзела камплектавання фонду
ДУ «Нацыянальная бібліятэка Беларусі»,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт;
*кафедра* культуралогіі і псіхолага-педагагічных дысцыплін
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Раманава, Ж. Л.**

Р21 Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства : вучэб.-метад. дапам. / Ж. Л. Раманава ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2020. – 139 с.

ISBN 978-985-522-256-0.

Разгледжаны асноўныя тэарэтычныя пытанні інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства: азначэнне, уласцівасці, прынцыпы, функцыі, класіфікацыя. Прыведзены асаблівасці дакументных патокаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства на сучасным этапе. Сфармуляваны складнікі прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкара-бібліёграфа ў сферы папулярызацыі інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

Для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі бібліятэчна-інфармацыйнай галіны.

**УДК 025:004:821.161.3(075.8)**
**ББК 78.555:84(4Беи)я73 + 78.555:83.3(4Беи)я73 + 78.373.8:84(4Беи)я73 + 78.373.8:83.3(4Беи)я73**

ISBN 978-985-522-256-0

© Раманава Ж. Л., 2020
© Афармленне. Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», 2020

ЗМЕСТ

**СПІС УМОЎНЫХ СКАРАЧЭННЯЎ** ………………….……..……..… 5
**ПРАДМОВА**……………………………………………..……..…… 6

**РАЗДЗЕЛ 1**
**ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА**

1.1. Паняцце і структура інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства ……………………..……….…… 9
Заданні для самастойнай работы па тэме 1.1. …. 20
1.2. Уласцівасці інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства …………….……………………….…… 22
Заданне для самастойнай работы па тэме 1.2. ….. 37
1.3. Прынцыпы фарміравання інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства …………………….…… 38
Заданне для самастойнай работы па тэме 1.3…… 43
1.4. Функцыянальная структура інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства…………..……..……….. 44
1.4.1. Функцыі інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры ……………………………………………………..…. 45
1.4.2. Функцыі інфармацыйных рэсурсаў літаратуразнаўства ……………………………………………………….. 53
Заданне для самастойнай работы па тэме 1.4….. 61
1.5. Класіфікацыя інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства………………………..…………..… 62
1.5.1. Неабходныя і дапаўняльныя прыметы класіфікацыі ІРМЛЛ ………………………………………………………. 62
1.5.2. Уплыў спецыфікі мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства на класіфікацыю ІРМЛЛ ……………..………… 64
1.5.3. Монакамунікацыйныя і полікамунікацыйныя ІРМЛЛ 66
Заданне для самастойнай работы па тэме 1.5…. 75

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## РАЗДЗЕЛ 2
## СУЧАСНЫ СТАН І КІРУНКІ РАЗВІЦЦЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА


2.1. Асаблівасці дакументных патокаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства ........................................ 77

2.1.1. Дакументны паток беларускага літаратуразнаўства… 78

2.1.1.1. Мікрапаток беларускага літаратуразнаўства сферы навукі .................................................... 79

2.1.1.2. Даведачныя дакументы ў складзе дакументнага патоку беларускага літаратуразнаўства ..................... 83

2.1.1.3. Дакументны паток сферы адукацыі ................ 86

2.1.2. Адметныя характарыстыкі дакументнага патоку беларускай мастацкай літаратуры ..................................... 90

Заданні для самастойнай работы па тэме 2.1...... 97

2.2. Спецыфіка патоку бібліяграфічных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства ................................ 105

Заданне для самастойнай работы па тэме 2.2...... 109

2.3. Характарыстыка інтэрнэт-рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства......................................... 111

Заданне для самастойнай работы па тэме 2.3.... 118


## РАЗДЗЕЛ 3
## ПРАФЕСІЙНАЯ КАМПЕТЭНТНАСЦЬ БІБЛІЯТЭКАРАЎ-БІБЛІЁГРАФАЎ У СФЕРЫ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА


3.1. Папулярызацыя беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства як праблема і адзін з асноўных кірункаў дзейнасці публічных бібліятэк ................................................... 119

3.2. Прафесійная кампетэнтнасць бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства: азначэнне, структура, крытэрыі і ўзроўні сфарміраванасці ........................................................................... 122

Заданні для самастойнай работы па тэме 3.2. ..... 127

**ВЫНІКОВЫ ТЭСТ** ................................................ 131

**СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ** ......................... 136


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПІС УМОЎНЫХ СКАРАЧЭННЯЎ

БД – база даных

БЛ – беларускае літаратуразнаўства

БМЛ – беларуская мастацкая літаратура

БР БМЛЛ – бібліяграфічныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства

ДП – дакументны паток

ДП БЛ – дакументны паток беларускага літаратуразнаўства

ДП БМЛ – дакументны паток беларускай мастацкай літаратуры

ІБР БМЛЛ – інфармацыйна-бібліяграфічныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства

ІР – інфармацыйныя рэсурсы

ІРМЛ – інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры

ІРЛ – інфармацыйныя рэсурсы літаратуразнаўства

ІРМЛЛ – інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства

ІР БМЛЛ – інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства

ІР БЛ – інфармацыйныя рэсурсы беларускага літаратуразнаўства

ІР БМЛ – інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры

МЛЛ – мастацкая літаратура і літаратуразнаўства

НББ – Нацыянальная бібліятэка Беларусі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРАДМОВА

Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства (ІР БМЛЛ) – адзін з кампанентаў метасістэмы інфармацыйных рэсурсаў, які адыгрывае важную ролю ў выхаванні, адукацыі і фарміраванні культурнага патэнцыялу грамадства. Гэтая роля абумоўлена асаблівасцямі мастацкай літаратуры як моцнага сродку пазнання рэчаіснасці і ўздзеяння на эмацыянальную сферу чалавека, развіцця яго асобы, выхавання нацыянальнай свядомасці, захавання культурнай і моўнай ідэнтычнасці беларускага народа.

Дзейснае выкарыстанне ў грамадстве ІР БМЛЛ непасрэдна звязана з дакладнымі ведамі пра іх сутнасць, склад, спецыфічныя ўласцівасці, прынцыпы фарміравання, функцыі, асаблівасці класіфікацыі, іх рацыянальную арганізацыю. Актыўнае спажыванне ІР БМЛЛ залежыць таксама і ад эфектыўнасці іх распаўсюджання, прыцягнення чытачоў. Вядучая роля ў гэтым належыць бібліятэцы, таму неабходна падрыхтаваць бібліятэкараў-бібліёграфаў, якія ведаюць асаблівасці сістэмы інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, разумеюць важнасць прамоцыі нацыянальнай літаратуры і могуць рабіць гэта на высокім прафесійным узроўні. Вучэбна-метадычны дапаможнік «Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства» накіраваны на дасягненне азначанай мэты, што ажыццяўляецца праз вырашэнне наступных задач:

– сфарміраваць у студэнтаў веды пра метасістэму інфармацыйных рэсурсаў і месца ў ёй рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства;

– растлумачыць спецыфіку, прынцыпы, функцыі, класіфікацыю інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства;

– паказаць асаблівасці галіновых дакументных патокаў на сучасным этапе;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– даць студэнтам уяўленне пра гісторыю і сучасны стан бібліяграфічных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства;

– акрэсліць паняцце прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

Студэнты, якія паспяхова засвоілі дысцыпліну «Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства», павінны ведаць:

– асноўныя паняцці тэорыі інфармацыйных рэсурсаў;

– уласцівасці інфармацыйных і бібліяграфічных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства;

– прынцыпы, функцыі і класіфікацыю інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства;

– асаблівасці дакументнага патоку беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства;

– інтэрнэт-рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства;

– складнікі прафесійнай кампетэнтнасці ў сферы папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

У выніку засваення дысцыпліны студэнты павінны ўмець:

– арыентавацца ў інфармацыйных рэсурсах беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, як на традыцыйных, так і на электронных носьбітах, у прасторы Інтэрнэт;

– ажыццяўляць іх класіфікацыю ў адпаведнасці з пэўнымі мэтамі;

– праводзіць бібліяметрычны аналіз галіновых рэсурсаў;

– выкарыстоўваць вынікі бібліяметрычнага аналізу для выпрацоўкі найбольш эфектыўных метадаў папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры і прыцягнення чытачоў.

Дысцыпліна «Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства» мае міжпрадметныя сувязі з такімі дысцыплінамі, як «Беларуская літаратура», «Педагогіка», «Сацыяльная псіхалогія», «Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк», «Інфармацыйныя рэсурсы мастацка-эстэтычнай сферы» і інш.

Кожная тэма вучэбна-метадычнага дапаможніка суправаджаецца пытаннямі для самаправеркі і заданнямі для самастойнай работы. Пытанні акцэнтуюць увагу на найбольш важных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

момантах, дапамагаюць сістэматызаваць веды і вызначыць ступень засваення матэрыялу. Заданні арыентаваны на арганізацыю самастойнай работы студэнтаў пры засваенні дысцыпліны і ўключаюць: 1) знаёмства з тэарэтычнымі крыніцамі; 2) аналіз дакументных патокаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства; 3) знаёмства з методыкай падрыхтоўкі бібліятэчных выстаў і мерапрыемстваў, прысвечаных папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры і дасягненняў беларускага літаратуразнаўства; 4) вывучэнне інтэрнэт-рэсурсаў, якія садзейнічаюць распаўсюджанню ведаў у галіне беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства. Выкананне заданняў служыць выпрацоўцы наступных уменняў і навыкаў: 1) аналіз сістэмы інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства; 2) выяўленне праблем і перспектыў працы бібліятэкара-бібліёграфа пры фарміраванні азначанай сістэмы ў бібліятэцы; 3) папулярызацыя беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства ў практычнай дзейнасці; 4) выкарыстанне інтэрнэт-тэхналогій для далучэння карыстальнікаў да здабыткаў і каштоўнасцей нацыянальнай літаратуры.

Засваенне дысцыпліны вядзе да фарміравання агульнакультурных, адукацыйных, камунікатыўных, прафесійных кампетэнцый бібліятэкараў-бібліёграфаў.

Вучэбна-метадычны дапаможнік адрасаваны студэнтам дзённай і завочнай форм навучання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РАЗДЗЕЛ І
# ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

## ТЭМА 1.1. ПАНЯЦЦЕ І СТРУКТУРА ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першыя спробы акрэсліць паняцце «інфармацыйныя рэсурсы» (ІР) былі здзейснены ў 90-я гады XX ст., калі аформіўся рэсурсны падыход да вывучэння інфармацыі. Згодна з гэтым падыходам, ІР уяўляюць сабой шырокую метасістэму, што ахоплівае ўсе галіны чалавечай дзейнасці. Кожная з іх мае свае, уласцівыя толькі ёй ІР, спецыфіка якіх залежыць ад інфармацыйнага асяроддзя.

Інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства (ІРМЛЛ) утвараюць частку метасістэмы ІР, таму іх азначэнне аналагічнае метасістэмнаму, хаця і мае пэўную галіновую спецыфіку. У першую чаргу неабходна разгледзець ІР як метасістэмнае паняцце.

Нягледзячы на тое, што тэрмін «інфармацыйныя рэсурсы» з'яўляецца на сёння агульнаўжывальным, яго дакладнага азначэння няма. У навуковай, даведачнай літаратуры, у заканадаўчых дакументах існуе пэўны разнабой пры акрэсленні катэгорыі, праз якую трэба дэфінаваць ІР. Неабходна, каб фармулёўкі былі стандартызаваны, бо ад таго, які сэнс укладаецца ў паняцце ІР, залежаць і тэорыя прадмета, і практычная дзейнасць.

Калі абагульніць усе асноўныя падыходы, то можна вылучыць шырокую і вузкую трактоўкі ІР. *У шырокім сэнсе* прапануецца разглядаць іх як *веды*, падрыхтаваныя людзьмі для сацыяльнага выкарыстання ў грамадстве і зафіксаваныя на матэрыяльным носьбіце. *У вузкім сэнсе* пад інфармацыйнымі

рэсурсамі разумеюць толькі *сеткавыя рэсурсы*, даступныя праз камп'ютарныя сродкі сувязі[1].

Базавай з'яўляецца дэфініцыя ІР, замацаваная ў нацыянальным заканадаўстве. У той жа час, палажэнні заканадаўчых актаў грунтуюцца на навуковых распрацоўках і азначэннях, зафіксаваных у нарматыўных і даведачных дакументах галіны.

У беларускім заканадаўстве знайшла адлюстраванне трактоўка інфармацыйных рэсурсаў у вузкім сэнсе. Так, Закон Рэспублікі Беларусь «Об информации, информатизации и защите информации» азначае ІР як «асобныя дакументы і асобныя масівы дакументаў у інфармацыйных сістэмах (бібліятэках, архівах, фондах, банках даных і іншых інфармацыйных сістэмах)»[2]. На першы погляд відавочна, што пад ІР тут разумеюцца дакументы і іх масівы, аднак на самай справе маюцца на ўвазе толькі электронныя ІР. Па-першае, сам закон апісвае правазносіны ў сферы электронных камунікацый, а па-другое, да такой высновы прыводзіць дэфініцыя інфармацыйнай сістэмы: «…сукупнасць інфармацыі, якая ўтрымліваецца ў базах даных, і інфармацыйных тэхналогій, якія забяспечваюць яе апрацоўку, і комплексу праграмна-тэхнічных сродкаў»[3].

Аналагічная трактоўка паняцця ІР давалася і ў Законе Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь»[4], які дзейнічаў да 20.07.2016. У Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб культуры[5], які на сёння з'яўляецца асноўным заканадаўчым дакументам у галіне бібліятэчнай справы, азначэнне паняцця «інфармацыйныя рэсурсы» адсутнічае.

---

[1] Справочник библиографа / науч. ред.: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб., 2014. – С. 40.

[2] Об информации, информатизации и защите информации [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь, 10 нояб. 2008 г., № 455-З : с изм. и доп. : текст по сост. на 4 янв. 2014 г. // Эталон. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2014.

[3] Тут і далей пераклад наш.

[4] Аб бібліятэчнай справе ў Рэспубліцы Беларусь [Электронны рэсурс] : Закон Рэсп. Беларусь, 22 сак. 1995 г., № 3680-XII : у рэд. Закона Рэсп. Беларусь ад 1 ліп. 2014 г., № 173-З // Эталон. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь / Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь. – Мінск, 2014.

[5] Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронны рэсурс] : 20 ліп. 2016 г. № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. // Эталон. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь / Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь. – Мінск, 2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак аналіз артыкула 149 паказвае, што пад ІР у дадзеным заканадаўчым акце разумеюцца электронныя рэсурсы (напрыклад, да іх аднесены Зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі).

У вузкім сэнсе ІР трактуюцца і ў пастанове Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь «О Государственной регистрации информационных ресурсов»[6], дзе да іх аднесены рэсурсы, прадстаўленыя ў форме баз даных, баз ведаў, банкаў даных і іншай форме, якая дае магчымасць іх апрацоўкі з дапамогай электронна-вылічальнай тэхнікі. Такім чынам, пад ІР у заканадаўчых дакументах разумеюцца толькі электронныя.

Азначэнне ІР у афіцыйных дакументах толькі як электронных самым адмоўным чынам уздзейнічае на забеспячэнне карыстальнікаў інфармацыяй, бо ад таго, які змест укладаецца ў дадзенае паняцце, залежыць кампанентная структура ІР і магчымасці доступу да іх. Разгледзім выпускі каталога Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь «Информационные ресурсы Беларуси»[7]. Зыходзячы з яго назвы, лагічна дапусціць, што ў ім адлюстраваны як электронныя, так і друкаваныя рэсурсы. Між тым, аналіз паказвае, што ўкладальнікі разумеюць пад інфармацыйнымі рэсурсамі толькі электронныя. Такім чынам, у назве выкарыстоўваецца шырокае паняцце, а ў змесце каталога прадстаўлены інфармацыйныя рэсурсы толькі ў вузкім сэнсе, што на практыцы прыводзіць да непаразуменняў і супярэчнасцей.

Аналагічна азначэнню ІР у заканадаўчых актах Рэспублікі Беларусь азначаліся ІР да 2006 г. і ў Законе Расійскай Федэрацыі «Об информации, информатизации и защите информации»[8], што выклікала крытыку з боку Ю. М. Сталярова[9].

---

[6] О Государственной регистрации информационных ресурсов : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 28 авг. 2000 г., № 1344 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2000. – № 84. – 5/3953.

[7] Информационные ресурсы Беларуси : каталог [Электронный ресурс]. – Вып. 11. – Режим доступа: http://infores.mpt.gov.by/download/catalog11.pdf. – Дата доступа: 25.12.2013.

[8] Об информации, информатизации и защите информации [Электронный ресурс] : закон от 20 февр. 1995 г. № 24-ФЗ : с изм. : текст по сост. на 10 янв. 2003 г. – Режим доступа: http://www.economy.gov.ru/minec/activity/sections/fcp/doc1117794 877094. – Дата доступа: 16.02.2014.

[9] Столяров Ю. Н. Документный ресурс. – М., 2001. – С. 18–20.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

З ліпеня 2006 г. у Расійскай Федэрацыі дзейнічае новы закон «Об информации, информационных технологиях и о защите информации»[10], у якім такі тэрмін увогуле не ўжываецца.

Важным для навукова-практычнай і вучэбнай дзейнасці з'яўляецца азначэнне, замацаванае ў міждзяржаўным стандарце «Информационно-библиотечная деятельность. Библиография. Термины и определения» (2004), дзе даводзіцца, што ІР – гэта «сукупнасць даных, арганізаваных для эфектыўнага атрымання дакладнай інфармацыі»[11]. Гэта азначэнне было раскрытыкавана Ю. М. Сталяровым[12], які палічыў, што ў дадзеным выпадку «інфармацыйныя рэсурсы» і «дакументныя рэсурсы» выступаюць як сінанімічныя паняцці. Спрэчным з'яўляецца таксама палажэнне аб атрыманні праз ІР толькі «дакладнай інфармацыі». З пункта гледжання А. П. Вярэўчанкі, «рэсурсам з'яўляецца ўся назапашаная інфармацыя, у тым ліку і інфармацыя недакладная, прадстаўленая сумніцельнымі фактамі, ілжывымі палажэннямі, а таксама састарэлая інфармацыя, "дэзінфармацыя"», бо «толькі такі падыход да вызначэння інфармацыйных рэсурсаў стварае перадумовы для выяўлення супярэчлівых даных, выключаюцца выпадкі пропуску "нязручнай" інфармацыі і складаных сітуацый…»[13]. Палажэнне пра неабходнасць лічыць ІР толькі тыя, якія ўтрымліваюць дакладную інфармацыю, апрыёры робіць немагчымым ужыванне гэтага паняцця для рэсурсаў мастацкай літаратуры, для якіх дакладнасць – не галоўнае.

Разыходжанні ў азначэнні ІР існуюць у даведачнай і навуковай літаратуры. «Терминологический словарь по библиотечному делу и смежным отраслям знания» трактуе ІР як «трэці, найважнейшы від рэсурсаў сучаснага грамадства (разам з матэ-

---

[10] Об информации, информационных технологиях и о защите информации [Электронный ресурс] : Федер. закон, 29 июля 2006 г., № 149-ФЗ. – Режим доступа: http://base.garant.ru/12148555/. – Дата доступа: 15.02.2014.

[11] Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения : СТБ ГОСТ 7.0-2004. – Взамен ГОСТ 7.0-84, ГОСТ 7.26-80; введ. 01.07.2005. – Минск, 2004. – 35 с.

[12] Столяров Ю. Н. Документный ресурс. – М., 2001. – С. 17–18.

[13] Веревченко А. П. Информационные ресурсы: определение, основные понятия, параметры, особенности открытого потока информации, помехи, возникающие в каналах поступления информации [Электронный ресурс] // Текстархив. – Режим доступа: http://textarchive.ru/c-2317715.html. – Дата доступа: 25.08.2020.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рыяльнымі і энергетычнымі), які забяспечвае збор, апрацоўку, захаванне, пошук і выкарыстанне інфармацыі»[14]. У гэтай дэфініцыі не ўдакладняецца, з чаго складаецца дадзены від рэсурсаў, а толькі ўказваецца, для чаго яны прызначаны[15].

Тэрміналагічны слоўнік «Библиотечное дело» азначае ІР як сукупнасць інфармацыйных даных на традыцыйных і машыначытальных носьбітах, якія захоўваюцца ў бібліятэках і іншых інфармацыйных установах і складаюць інтэлектуальны і матэрыяльны патэнцыял, які выкарыстоўваецца для задавальнення інфармацыйных патрэбнасцей грамадства[16]. Як слушна заўважыла Г. М. Швяцова-Водка, сумненне тут выклікае словазлучэнне «інфармацыйныя даныя». Па азначэнні гэтага ж слоўніка даныя – гэта «інфармацыя, прадстаўленая ў фармалізаваным выглядзе», а значыць, ІР тут разумеюцца як «інфармацыя, прадстаўленая ў фармалізаваным выглядзе»[17].

«Справочник библиографа» азначае ІР як «запасы інфармацыі, зафіксаванай на якім-небудзь носьбіце і прыдатнай для яе захавання і выкарыстання»[18]. У дадзеным азначэнні, як і ў папярэднім, ІР разумеюцца ў шырокім сэнсе і дэфінуюцца праз паняцце «інфармацыя», але яно само з'яўляецца дыскусійным і мае больш за 300 азначэнняў. Такім чынам, зроблена некарэктная дэфініцыя аднаго недакладнага паняцця праз другое.

У «Толковом словаре по основам информационной деятельности» пад ІР прапаноўваецца разумець «сукупнасць даных, якія ўяўляюць сабой каштоўнасць для ўстановы (прадпрыемства) і выступаюць у якасці матэрыяльных рэсурсаў. Да іх адносяцца асноўныя і дапаможныя масівы даных, якія

---

[14] Терминологический словарь по библиотечному делу и смежным отраслям знания. – М., 1995. – С. 76.

[15] Швецова-Водка Г. Н. Изучение библиографических ресурсов в курсе общего библиографоведения // Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк і іх кадравае забеспячэнне : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 23–26 мая 2000 г. – Мінск, 2000. – С. 200.

[16] Библиотечное дело : терминологический словарь / Рос. гос. б-ка. – 3-е изд., перераб. и доп. – М., 1997. – С. 168.

[17] Швецова-Водка Г. Н. Изучение библиографических ресурсов в курсе общего библиографоведения // Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк і іх кадравае забеспячэнне : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 23–26 мая 2000 г. – Мінск, 2000. – С. 200.

[18] Справочник библиографа / науч. ред.: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб., 2014. – С. 40.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

захоўваюцца ў знешняй памяці, і ўваходныя дакументы»[19]. Можна пагадзіцца з пазіцыяй Г. М. Швяцовай-Водкі, якая лічыць, што дадзенае азначэнне выклікае больш пытанняў, чым раскрывае сутнасць ІР. Так, у ім інфармацыйнымі лічацца толькі рэсурсы, якія маюць каштоўнасць для ўстановы. Аднак паняцці «інфармацыйныя» і «каштоўныя» не з'яўляюцца сінонімамі і не могуць узаемазамяняцца. Незразумела таксама, як даныя могуць выступаць у якасці матэрыяльных рэсурсаў? Выходзіць, што ІР – гэта матэрыяльныя рэсурсы, што зусім не так. Не ясна, чаму ІР называюцца толькі тыя, якія захоўваюцца ў знешняй памяці[20].

У «Тлумачальным слоўніку бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў» ІР трактуюцца як «сукупнасць даных, арганізаваных для эфектыўнага атрымання дакладнай інфармацыі»[21], што аналагічна азначэнню ў міждзяржаўным стандарце «Информационно-библиотечная деятельность. Библиография. Термины и определения»[22].

Некаторыя аўтары дэфінуюць ІР праз паняцце «веды». Напрыклад, Н. Б. Зіноўева лічыць, што ІР – гэта веды, зафіксаваныя на матэрыяльных носьбітах, інакш кажучы, створаная інтэлектуальнай дзейнасцю людзей сацыяльная інфармацыя[23].

Аўтары «Основ теоретической информатики» лічаць, што ІР – гэта сімбіёз ведаў і інфармацыі (дзе інфармацыя выступае ў якасці паняційных ведаў)[24].

---

[19] Толковый словарь по основам информационной деятельности / Укр. акад. информатики, Укр. ин-т науч.-техн. и экон. информ. ; под. ред. Н. Н. Ермошенко. – Киев, 1995. – С. 80.

[20] Швецова-Водка Г. Н. Изучение библиографических ресурсов в курсе общего библиографоведения // Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк і іх кадравае забеспячэнне : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 23–26 мая 2000 г. – Мінск, 2000. – С. 200.

[21] Лявончыкаў В. Е., Дзямешка Л. А., Саматыя Р. І. Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, УА «Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў». – 3-е выд., выпр. і дап. – Мінск, 2012. – С. 105.

[22] Информационно-библиотечная деятельность, библиография. Термины и определения : СТБ ГОСТ 7.0-2004. – Взамен ГОСТ 7.0-84, ГОСТ 7.26-80 ; введ. 01.07.2005. – Минск, 2004. – 35 с.

[23] Зиновьева Н. Б. Информационная культура личности. – Краснодар, 1996. – С. 87.

[24] Каныгин Ю. М., Калитич Г. И. Основы теоретической информатики. – Киев, 1990. – С. 21–24.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, праведзены аналіз дэфініцый вышэйзгаданага паняцця паказвае, што пад «інфармацыйнымі рэсурсамі» разумеюцца: 1) электронныя рэсурсы; 2) інфармацыя; 3) сукупнасць дакументаў; 4) веды, зафіксаваныя на матэрыяльных носьбітах.

Найбольш дакладным з'яўляецца азначэнне праз навуковую катэгорыю «веды». Гэтая пазіцыя грунтуецца на тым, што веды – не проста інфармацыя ўвогуле, а вынік пазнання чалавекам прадметаў і з'яў рэчаіснасці, законаў прыроды і грамадства[25]. Яны адрозніваюцца структураванасцю, магчымасцю ўнутранай інтэрпрэтацыі, звязанасцю і актыўнасцю[26]. Неабходнай умовай пераўтварэння ведаў у інфармацыйныя рэсурсы з'яўляецца магчымасць іх шырокага выкарыстання ў камунікацыйным працэсе, для чаго патрабуецца іх фіксацыя на матэрыяльным носьбіце, як традыцыйным, так і электронным. Матэрыяльнай формай прадстаўлення ведаў і распаўсюджання іх у грамадстве з'яўляюцца дакументы.

Такім чынам, вылучэнне паняцця «веды» – катэгорыі, праз якую генеруецца дэфініцыя паняцця «інфармацыйныя рэсурсы», дазваляе пазбегнуць неадназначнасці і расплывістасці фармулёвак, характэрных для тэрміна «інфармацыя», і ўключыць у іх склад рэсурсы на любым носьбіце, бо ў дадзеным выпадку яго спецыфікацыя не з'яўляецца вызначальным фактарам.

Аналагічна і інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства (ІРМЛЛ) уяўляюць сабой сукупнасць ведаў, замацаваных на разнастайных матэрыяльных носьбітах, але яны маюць спецыфічны характар, абумоўлены такімі асаблівасцямі мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, як агульнацікавасць, мастацка-вобразная форма ўвасаблення, эстэтычны характар, наяўнасць інтэлектуальнага і навуковага кампанентаў у іх змесце. Гэтыя ўласцівасці дазваляюць адрозніваць ІРМЛЛ ад іншых відаў інфармацыйных рэсурсаў і вызначыць, што іх утвараюць *мастацка-вобразныя* і *навуковыя веды*.

---

[25] Большая Советская Энциклопедия : в 30 т. / гл. ред. А. М. Прохоров. – 3-е изд. – М. : Сов. энцикл., 1969–1978. – Т. 28 : Франкфурт – Чага. – 1978. – 608 с.

[26] Кузьмініч Т. В. Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк як сродак захавання гісторыка-культурнай памяці беларускага грамадства // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., г. Мінск, 10–11 лістап. 2011 г. – Мінск, 2011. – С. 361–365.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мастацка-вобразныя веды* – веды асобага роду, вынік пазнання законаў быцця і з'яў рэчаіснасці з пазіцый эстэтыкі і гармоніі з дапамогай суб'ектыўных пачуццяў і ўспрымання. Гэта форма асэнсавання і асваення жыцця праз мастацкія вобразы, што вызначаюцца як «аснова мовы мастацкай літаратуры; як яе галоўны выразны сродак; як увасобленае творчае ўяўленне пісьменніка; як духоўная (мастацкая) каштоўнасць; як адзін з найбольш выразных і дзейсных сродкаў сацыялізацыі асобы; як фрагмент сацыяльнай памяці, які ўдзельнічае ў фарміраванні мастацкай традыцыі і грамадскай свядомасці цалкам; як мэта і вынік мастацкага пошуку»[27]. Мастацкія веды не абавязкова з'яўляюцца дакладнымі, іх прырода дапускае магчымасць мастацкай выдумкі, перабольшання станоўчага ці адмоўнага пры стварэнні вобразаў.

*Навуковым літаратуразнаўчым ведам* уласціва сістэматызаванасць, абгрунтаванасць, доказальнасць. Іх атрымліваюць праз адпаведныя метады пазнання, яны павінны быць ацэнены спецыялістам ці калектывамі і мець асобую структуру. Генерацыя навуковых ведаў – прэрагатыва літаратуразнаўства, якое дакладна тлумачыць факты літаратурнага жыцця і творчасці, абагульняе і асэнсоўвае іх у сістэме сваіх паняццяў і катэгорый, вывучае літаратурны працэс у яго мінулым, сучасным і будучым[28].

Мастацка-вобразныя веды з'яўляюцца неабходным элементам *эстэтычнай камунікацыі* – працэсу інтэлектуальна-творчага ўзаемадзеяння адрасанта (аўтара) і адрасата (чытача), праз які ажыццяўляецца перадача апошняму ведаў, што адлюстроўваюць пэўныя адносіны да рэчаіснасці, мастацкую канцэпцыю, устойлівыя каштоўнасныя арыентацыі.

Літаратуразнаўчыя веды – гэта важны складнік *навуковай камунікацыі* – сістэмы сацыяльных узаемадзеянняў, накіраваных на пошук, назапашанне і распраўсюджанне навуковых ведаў у галіне мастацкай літаратуры, што ажыццяўляюцца праз розныя каналы, сродкі, формы камунікацыі.

---

[27] Суминова Т. Н. Художественная культура как информационная система (мировоззренческие и теоретико-методологические основания). – М., 2006. – С. 29. – (Технологии культуры).

[28] Большая Советская Энциклопедия : в 30 т. / гл. ред. А. М. Прохоров. – 3-е изд. – М. : Сов. энцикл., 1969–1978. – Т. 28 : Франкфурт – Чага. – 1978. – 608 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, ІРМЛЛ – *гэта сукупнасць мастацка-вобразных і навуковых ведаў, замацаваных на розных матэрыяльных носьбітах для іх трансляцыі і ажыццяўлення эстэтычнай і навуковай камунікацыі ў грамадстве.* Можна адзначыць, што ІРМЛЛ – паняцце, якое яднае ў сабе дзве сутнасныя для існавання і функцыянавання мастацкай літаратуры катэгорыі – духоўна-інтэлектуальную (мастацка-вобразныя і навуковыя веды) і матэрыяльную (матэрыяльны носьбіт).

*Ключавыя характарыстыкі ІРМЛЛ* – іх структура, уласцівасці, прынцыпы фарміравання, функцыі. Паколькі ІРМЛЛ выступаюць адначасова элементам метасістэмы ІР і сістэмай, утворанай шэрагам кампанентаў, то вылучаюцца іх метасістэмныя і спецыфічныя катэгорыі.

Характэрнай асаблівасцю ІРМЛЛ з'яўляецца наяўнасць у іх складзе дзвюх падсістэм, якія ўтрымліваюць веды рознага характару: падсістэмы *інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры (ІРМЛ)* і падсістэмы *інфармацыйных рэсурсаў літаратуразнаўства (ІРЛ)*. Такім чынам, уласцівасці, прынцыпы фарміравання, функцыі кожнай падсістэмы вызначаюцца асобна. Разгляд вызначаных тэарэтычных катэгорый ІРМЛЛ дазваляе дакладна ўстанавіць іх склад, вылучыць агульнае і адметнае.

Пры вызначэнні структуры ІР прынцыповым з'яўляецца пытанне пра матэрыяльную адзінку, якая іх утварае (што гэта: асобны дакумент, дакументны паток, масіў дакументаў?). Адказ на яго дапамагае сфармуляваць наступныя характарыстыкі ІР: уласцівасці, прынцыпы, функцыі, класіфікацыя. Істотна тое, што ІР існуюць у «пэўнай інфармацыйнай сістэме»[29] як яе элемент. У адпаведнасці з сістэмна-дзейнасным падыходам ІР можна вызначыць як метасістэму, так і сістэму больш вузкага кшталту.

У вузкім сэнсе да інфармацыйнай сістэмы ІР адносіцца любая ўстанова, якая ўтрымлівае масіў дакументаў пэўнай галіны ці сукупнасці галін чалавечай дзейнасці – бібліятэка або іншы інфармацыйны орган.

У шырокім сэнсе метасістэмай для ІР з'яўляецца *сістэма сацыякультурных камунікацый* – арганізацыйна ўпарадкаваная

[29] Суминова Т. Н. Информационные ресурсы художественной культуры (артосферы). – М., 2006. – С. 27. – (Технологии культуры).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сукупнасць дакументаў (масіваў дакументаў) і інфармацыйных тэхналогій, якія рэалізуюць інфармацыйныя працэсы збору, апрацоўкі, назапашання, захавання, пошуку і распаўсюджання інфармацыі. Згодна з гэтым, любая інфармацыйная сістэма – гэта «прасторава-часавая сукупнасць»[30] *масіваў дакументаў* універсальнага ці галіновага зместу. Такім чынам, паколькі ІР з'яўляюцца элементам інфармацыйнай сістэмы, трэба разглядаць іх як сукупнае паняцце, веды, замацаваныя на матэрыяльным носьбіце і лакалізаваныя ў пэўных дакументных масівах. Менавіта *дакументныя масівы* і ёсць матэрыяльная адзінка ІР. Дынамічную частку дакументных масіваў складаюць дакументныя патокі, даследаванне якіх дазваляе выявіць стан, асноўныя характарыстыкі і праблемы развіцця сістэмы галіновых рэсурсаў у пэўны перыяд.

У дачыненні да ІРМЛЛ можна акрэсліць тры ўзроўні сістэмы масіваў. На першым узроўні вызначаецца метасістэма для іх – сістэма сацыякультурных камунікацый з галіновым масівам дакументаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

На другім узроўні інфармацыйнай сістэмай для ІРМЛЛ з'яўляецца мастацкая літаратура як від мастацтва і чалавечай дзейнасці, дзе ствараецца масіў тэкстаў літаратурных твораў і літаратуразнаўчых прац.

На трэцім, нізавым узроўні ў якасці інфармацыйнай сістэмы азначаных рэсурсаў можа выступаць бібліятэка, архіў, музей з масівамі літаратурных і літаратуразнаўчых дакументаў.

Такім чынам, паколькі ІР – гэта сукупнае паняцце, куды ўваходзяць масівы дакументаў у інфармацыйных сістэмах, то можна вызначыць іх структуру, арыентаваную на будову дакументных масіваў, аднолькавую і для традыцыйных, і для электронных дакументаў.

Згодна з бібліяграфічным падыходам, структура ІРМЛЛ складаецца з двух узроўняў, вылучаных у адпаведнасці са спосабам перадачы інфармацыі: 1) масіў першасных дакументаў (традыцыйных і электронных); 2) масіў другасных дакументаў (традыцыйных і электронных рэфератыўных, аглядных, бібліяграфічных).

---

[30] Суминова Т. Н. Информационные ресурсы художественной культуры (артосферы). – М., 2006. – С. 27. – (Технологии культуры).



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Першы ўзровень ІРМЛЛ* складае масіў першасных дакументаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства на ўсіх існуючых матэрыяльных носьбітах. Сюды адносяцца першасныя апублікаваныя, неапублікаваныя і непублікуемыя дакументы на традыцыйных носьбітах і паўнатэкставыя базы даных *(БД)*. Паўнатэкставыя базы даных з'яўляюцца першаснымі ІРМЛЛ на электронным носьбіце.

*Другі ўзровень ІРМЛЛ* – масіў другасных дакументаў галіны. Ён ствараецца на базе першасных дакументаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства (МЛЛ). Яго ўтвараюць: 1) рэфератыўная і аглядная інфармацыя і рэфератыўныя базы даных, якія з'яўляюцца вынікам аналізу і абагульнення звестак, прадстаўленых у першакрыніцах; 2) бібліяграфічная інфармацыя (бібліяграфічныя дапаможнікі розных тыпаў, відаў і жанраў і бібліяграфічныя базы даных); 3) фактаграфічная інфармацыя (энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі і фактаграфічныя базы даных) (табл. 1.1).

*Табліца 1.1*

**Структура інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства**

| Інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства | | | |
|---|---|---|---|
| узроўні | | | |
| першы | другі | | |
| першасныя апублікаваныя, неапублікаваныя і непублікуемыя дакументы на традыцыйных носьбітах і паўнатэкставыя базы даных | рэфератыўная і аглядная інфармацыя, рэфератыўныя базы даных | бібліяграфічная інфармацыя (бібліяграфічныя дапаможнікі розных тыпаў, відаў і жанраў, бібліяграфічныя базы даных) | фактаграфічная інфармацыя (энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі і інш., фактаграфічныя базы даных) |

## Пытанні для самакантролю

1. Калі ўзніклі першыя спробы даць азначэнне паняццю «інфармацыйныя рэсурсы»?
2. Які падыход ужываецца пры вывучэнні ІР?
3. Акрэсліце розныя азначэнні тэрміна «інфармацыйныя рэсурсы».



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Як IP трактуюцца ў заканадаўчых актах?

5. Як азначаюцца інфармацыйныя рэсурсы ў навуковай і даведачнай літаратуры?

6. Якія асноўныя падыходы (іх 4) можна вылучыць пры тлумачэнні паняцця інфармацыйных рэсурсаў? Які з іх найбольш мэтазгодны?

7. Якія веды ўтвараюць ІРМЛЛ? Назавіце іх асаблівасці.

8. Дайце азначэнне ІРМЛЛ.

9. Назавіце ключавыя характарыстыкі ІРМЛЛ.

10. Якія дзве падсістэмы ўтвараюць ІРМЛЛ?

11. Што з'яўляецца матэрыяльнай адзінкай ІРМЛЛ?

12. Назавіце структуру ІРМЛЛ.

**Заданні для самастойнай работы па тэме 1.1.**

Заданне № 1

*Мэта* – атрымаць уяўленне аб важнасці нацыянальнай культуры і месцы ў ёй нацыянальнай мастацкай літаратуры, вызначыць спецыфічныя асаблівасці беларускай мастацкай літаратуры як складніка мастацтва і нацыянальнай культуры, літаратуразнаўства як навукі, выявіць розніцу паміж навуковым і мастацка-вобразным пазнаннем рэчаіснасці.

*Пры дапамозе прапанаваных і знойдзеных самастойна крыніц сфармулюйце свае ўяўленні па наступных праблемах.*

1. Нацыянальная культура як важны фактар захавання нацыянальнай адметнасці, культурнай разнастайнасці ў глабалізаваным свеце.

2. Беларуская мастацкая літаратура як від мастацтва і частка нацыянальнай культуры. Роля бібліятэк і бібліятэкараў у распаўсюджанні і захаванні культурных дасягненняў беларусаў праз папулярызацыю беларускай мастацкай літаратуры.

3. Навуковы, адукацыйны і навукова-папулярны патэнцыял беларускага літаратуразнаўства.

4. Агульнае і рознае ў мастацка-эстэтычным і навуковым пазнанні жыцця.

*Літаратура*

1. *Бабко, А. І.* Ігнат Абдзіраловіч і сучасны культуралагічны кантэкст [Электронны рэсурс] / А. І. Бабко // Рэпазіторый БДУКМ. – Рэжым доступу: http://repository.buk.by/bitstream /123456789/4369/3/IGNAT%

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

20ABDZIRALOVICH%20I%20SUCHASNYI%20KUL%27TURALAGICHNYI%20KANTE%27KST.pdf. – Дата доступу: 22.08.2017.

2. *Гребень, Н. Ф.* Роль культуры в обеспечении психологического благополучия белорусской нации / Н. Ф. Гребень // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтва : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 20–21 ліст. 2014 г. / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; уклад. Ю. В. Пацюпа ; гал. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2014. – С. 406–407.

3. Уводзіны ў літаратуразнаўства : вучэб. дапам. : у 2 ч. / пад рэд. В. П. Рагойшы. – Ч. 1 : Літаратуразнаўства як навука. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка. – Мінск, 2009. – С. 4–29, 63–77, 88–91, 92–108.

4. *Шаўлякова-Барзенка, І.* Беларуская літаратура ў інфармацыйным грамадстве: пагрозы як гарантыя перспектыў [Электронны рэсурс] / І. Шаўлякова-Барзенка // Звязда. – Рэжым доступу: http://zviazda.by/be/news/20170222/1487766632-belaruskaya-litaratura-u-infarmacyynym-gramadstve. – Дата доступу: 22.08.2017.

## Заданне № 2

*Мэта* – навучыцца аналізаваць падыходы спецыялістаў да азначэння і структуры ІР і прымяніць іх пры акрэсленні паняцця і структуры ІРМЛЛ.

*Пры дапамозе прапанаваных крыніц прааналізуйце:*

1. Сучасныя падыходы да азначэння паняцця «інфармацыйныя рэсурсы». Як можна прымяніць іх пры распрацоўцы тлумачэння тэрміна «інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства»?

2. Спосабы ўстанаўлення структуры ІР і іх выкарыстанне пры выбудове структуры ІРМЛЛ.

### *Літаратура*

1. *Леончиков, В. Е.* Информационные ресурсы. Теоретический аспект / В. Е. Леончиков // Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк і іх кадравае забеспячэнне : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., г. Мінск, 23–26 мая 2000 г. – Мінск, 2000. – С. 62–65.

2. Справочник библиографа / науч. ред.: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб., 2014. – С. 40–42.

3. *Столяров, Ю. Н.* Документный ресурс / Ю. Н. Столяров. – М., 2001. – С. 17–20.

4. *Суминова, Т. Н.* Информационные ресурсы художественной культуры (артосферы) / Т. Н. Суминова. – М., 2006. – С. 27. – (Технологии культуры).

5. *Суминова, Т. Н.* Художественная культура как информационная система (мировоззренческие и теоретико-методологические основания) / Т. Н. Суминова. – М., 2006. – С. 29. – (Технологии культуры).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМА 1.2. УЛАСЦІВАСЦІ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

Уласцівасці – гэта сутнасныя катэгорыі, якія даюць магчымасць адрозніваць ІРМЛЛ ад іншых відаў рэсурсаў і з'яў рэчавага свету. Уласцівасці інфармацыйных і дакументных рэсурсаў разглядаюцца ў працах В. Е. Лявончыкава[31], Ю. М. Сталярова[32] і інш. Н. Б. Зіноўева[33] і Н. М. Кушнарэнка[34] засяроджваюць увагу на вызначэнні ўласцівасцей дакументаў.

Аўтары па-рознаму вылучаюць склад уласцівасцей і дакументаў, і інфармацыйных рэсурсаў. Прапануюць іх лінейную структуру, або структуру, якая складаецца з некалькіх узроўняў. Напрыклад, Н. Б. Зіноўева[35] падзяляе ўласцівасці дакументаў на тры ўзроўні: сутнасныя, эксплуатацыйныя і каштоўнасныя. Сутнасныя ўласцівасці характарызуюць дакумент як сацыяльны феномен, з'яўленне якога выклікана патрабаваннямі сацыяльнай практыкі на пэўным этапе развіцця грамадства. Да іх аўтар адносіць адпаведнасць псіхафізіялагічным магчымасцям чалавека, масавасць і кампактнасць. Пярэчанне выклікае першая з іх. Яна трактуецца як «магчымасць (дакумента) быць успрынятым, а таксама здольнасць захоўваць інфармацыю ў пасіўнай форме і лёгка трансфармаваць яе ў актыўную і наадварот»[36]. Гэтую ўласцівасць нельга лічыць прэрагатывай толькі дакументаў ці шырэй інфармацыйных рэсурсаў. Ніводная рэч ці з'ява ў свеце не можа быць успрынята і выкарыстана чалавекам, калі яна не адпавядае яго псіхафізіялагічным магчымасцям.

Эксплуатацыйныя ўласцівасці, якія з'яўляюцца на этапе стварэння дакументаў (доўгатэрміновасць, трываласць, эластычнасць, біяўстойлівасць і інш.), характарызуюць яго пры-

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

---

[31] Леончиков В. Е. Информационные ресурсы. Теоретический аспект // Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк і іх кадравае забеспячэнне : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., г. Мінск, 23–26 мая 2000 г. – Мінск, 2000. – С. 62–65.

[32] Столяров Ю. Н. Документный ресурс. – М. : Либерия, 2001. – 149 с.

[33] Зиновьева Н. Б. Документоведение. – М. : Профиздат, 2001. – 207 с. – (Серия «Современная библиотека»).

[34] Кушнаренко Н. Н. Документоведение. – 4-е изд., испр. – Киев, 2003. – С. 36–37. – (Высшее образование XXI века).

[35] Зиновьева Н. Б. Документоведение. – М., 2001. – С. 78–80. – (Серия «Современная библиотека»).

[36] Там жа.

датнасць да выкарыстання і пастаяннага захоўвання. Гэта ўласцівасці тэхналагічнага кшталту, якія не характарызуюць дакумент як з'яву.

Да каштоўнасных уласцівасцей Н. Б. Зіноўева адносіць наступныя: актуальнасць, арыгінальнасць, паўната, сапраўднасць, даступнасць, нагляднасць, дакладнасць.

У адрозненне ад Н. Б. Зіноўевай, Ю. М. Сталяроў[37] і аўтары «Справочника библиографа»[38] разглядаюць уласцівасці інфармацыйных рэсурсаў толькі на адным узроўні. Адметнымі ўласцівасцямі ІР аўтары называюць невычарпальнасць, тыражаванне і папаўняльнасць. Ю. М. Сталяроў дадае таксама безальтэрнатыўнасць, адлюстраванне і агульнасць. Аўтары «Справочника библиографа» адзначаюць зменлівасць складу ІР як рэакцыю на змяненне інфармацыйных патрабаванняў грамадства і абумоўлены гэтым дынамізм прадукцыі і паслуг, прапанаваных на інфармацыйным рынку; цяжкасць вылучэння актыўнай і пасіўнай часткі рэсурсаў з-за розных тэмпаў старэння інфармацыі; непарыўнае адзінства элементаў, якія складаюць сукупныя ІР грамадства, і таму немагчымасць ці немэтазгоднасць выкарыстання толькі адной іх часткі (аднаго рэгіёна, краіны і г. д.).

Разглядаць уласцівасці ІРМЛЛ неабходна комплексна, на некалькіх узроўнях. Па-першае, трэба вызначаць агульныя метасістэмныя ўласцівасці (аднолькавыя для ІР любой галіны, якія характарызуюць ІР як з'яву) і спецыфічныя ўласцівасці ІРМЛЛ (тыповыя толькі для ІРМЛЛ, што дазваляюць адрозніваць іх ад ІР іншай галіны).

Па-другое, у адпаведнасці з філасофскім разуменнем прыроды рэчаў і з'яў, агульныя метасістэмныя ўласцівасці трэба падзяляць на атрыбутыўныя (якія на субстанцыянальным узроўні дазваляюць адрозніваць і распазнаваць рэчы і з'явы і неабходныя для іх існавання) і прагматычныя (звязаныя з выкарыстаннем рэчаў і з'яў). Атрыбутыўныя ўласцівасці, сутнасныя для ІР, маюць статычны, нязменны характар. Прагматычныя ўласцівасці, наадварот, рухомыя, склад іх можа змяняцца.

---

[37] Столяров Ю. Н. Документный ресурс. – М. : Либерия, 2001. – 149 с.

[38] Справочник библиографа / науч. ред.: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб. : Профессия, 2014. – 768 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Атрыбутыўныя ўласцівасці, як сутнасныя характарыстыкі ІРМЛЛ, аднолькавыя для падсістэм ІРМЛ і ІРЛ. Да іх адносяцца:

– *невычарпальнасць* – выкарыстанне ІРМЛЛ не прыводзіць да знікнення ці змяншэння ведаў, якія ўтрымліваюцца ў іх, а наадварот, садзейнічае прыросту ведаў, што сінтэзуюцца на базе ўжо існуючых;

– *папаўняльнасць* – веды, замацаваныя на матэрыяльным носьбіце, не знікаюць з цягам часу (можа знасіцца носьбіт, але веды магчыма перавесці на іншы), а маюць тэндэнцыю да пастаяннага прыросту;

– *адлюстраванне* – ІРМЛЛ утрымліваюць веды, назапашаныя ў сферы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, і такім чынам паказваюць агульныя і лакальныя дасягненні і праблемы галіны;

– *безальтэрнатыўнасць* – выкарыстанне ІР з'яўляецца адзіным спосабам ліквідацыі дэфіцыту ведаў у галіне мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства. Ніякія іншыя рэсурсы (матэрыяльныя, палітычныя, ваенныя і г. д.) не будуць альтэрнатыўнымі інфармацыйным;

– *генерацыйны эфект* (С. А. Чазава) – на падставе аднаго прадукту мастацкай літаратуры ці літаратуразнаўства можна стварыць якасна іншы. Творы мастацкай літаратуры становяцца базісам для напісання літаратуразнаўчых прац, бібліяграфічных паказальнікаў, тэкстаў тэатральных пастановак і сцэнарыяў фільмаў, карцін і інш. ІРЛ могуць служыць падставай для стварэння бібліяграфічных, вучэбных дапаможнікаў і г. д.

Прагматычныя ўласцівасці не ўсе прымаюцца для падсістэм ІРМЛ і ІРЛ. Іх склад трэба разглядаць асобна. Для падсістэмы ІРМЛ прагматычнымі ўласцівасцямі з'яўляюцца:

– *актуальнасць* – характэрна для ІРМЛ, паколькі праз літаратурныя творы можна атрымаць веды, у іх ёсць адказы на вострыя праблемы сучаснасці, а іх героі – блізкія і зразумелыя як сучаснікам, так і людзям будучых пакаленняў;

– *карыснасць* – пры чытанні мастацкай літаратуры карыстальнік дасягае пастаўленай мэты, адбываецца яго духоўнае і інтэлектуальнае развіццё. Асноўная мэта чытання мастацкіх твораў – прыемнае правядзенне вольнага часу, адпачынак,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэлаксацыя. Акрамя гэтага мастацкая літаратура выхоўвае чалавека, развівае яго розум;

– *арыгінальнасць* – звязана з майстэрствам аўтара, яго магчымасцю своеасабліва і непаўторна ўвасобіць тэму, якая ўжо знайшла адлюстраванне ў разнастайных творах многіх іншых пісьменнікаў (тэма вайны, розная ў творах В. Быкава і М. Лынькова; тэма кахання ў вершах М. Багдановіча, А. Міцкевіча).

Такія ўласцівасці, як навізна, сапраўднасць прысутнічаюць у ІРМЛ, але носяць спецыфічны характар. Мастацкія творы адлюстроўваюць свядомасць і светаадчуванне аўтара. Рэальныя факты ў іх упрыгожваюцца, змяняюцца, дапаўняюцца аўтарскай выдумкай і асабістай кропкай гледжання пісьменніка. Сюжэт увогуле можа быць поўнасцю выдуманым, а тэмай твора выступаюць пачуцці, шмат разоў увасобленыя ў творах іншых аўтараў. Таму і патрабаванні навізны і сапраўднасці становяцца ў дадзеным выпадку адноснымі і саступаюць месца актуальнасці, арыгінальнасці і карыснасці. Адначасова з гэтым існуюць мастацкія творы гістарычнага, мастацка-дакументальнага, мемуарнага жанраў, у якія ўключаюцца аўтэнтычныя матэрыялы, сапраўдныя дакументы, а таксама творы навуковай фантастыкі, дзе аўтарская выдумка спалучаецца з навуковымі данымі і фактамі.

Для падсістэмы ІРЛ прынцыпова значнымі прагматычнымі ўласцівасцямі, як для ІР навуковага характару, з'яўляюцца:

– *актуальнасць* – характэрна для ІРЛ, паколькі для іх запатрабаванасці ў грамадстве аб'ектыўна неабходна, каб яны ўтрымлівалі навуковыя веды па пытаннях і праблемах, значных для соцыума і развіцця навукі ў пэўны момант часу;

– *карыснасць* – паколькі ІР могуць эфектыўна выкарыстоўвацца толькі пры ўмове задавальнення патрэбнасці карыстальнікаў у навуковых літаратуразнаўчых ведах і магчымасці іх ужытку ў адпаведнасці з пастаўленымі мэтамі;

– *навізна* – ІР толькі тады могуць задаволіць інфармацыйныя патрэбнасці і выканаць сваю місію, калі ў іх упершыню даследуюцца літаратуразнаўчыя аб'екты і з'явы ці ўносіцца нешта істотна новае ў іх вывучэнне;

– *сапраўднасць* – веды, адлюстраваныя ў ІР, могуць быць прызнаны фактычнымі, навуковымі толькі тады, калі атрыманы праз адпаведныя метады пазнання, аргументавана дака-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

заны, станоўча ацэнены спецыялістамі, іх сапраўднасць не выклікае сумненняў і праверана на практыцы.

ІРЛ уключаюць навуковыя, вучэбныя, даведачныя дакументы, і ўласцівасці, прыярытэтныя для кожнага з гэтых відаў, будуць розныя. Для навуковых дакументаў галоўнымі з'яўляюцца актуальнасць, навізна, сапраўднасць і карыснасць. Для вучэбных – сапраўднасць і актуальнасць. Для даведачных – сапраўднасць. Для дакументаў літаратуразнаўства любога віду такая ўласцівасць, як карыснасць, будзе заўсёды ў шэрагу найбольш значных.

*Каштоўнасць* – інтэгратыўная, або эмержэнтная, уласцівасць, якая спалучае ўсе вышэйназваныя: карыснасць, навізну, сапраўднасць, арыгінальнасць і актуальнасць.

Наяўнасць дадзеных прагматычных уласцівасцей ІРМЛ і ІРЛ дазваляе ім адпавядаць патрабаванням, што прад'яўляюць да іх карыстальнікі.

ІРМЛЛ маюць і спецыфічныя, характэрныя толькі для іх уласцівасці. Склад іх розны для падсістэм ІРМЛ і ІРЛ.

Да спецыфічных уласцівасцей падсістэмы ІРМЛ адносяцца:

*1) эстэтычны характар ведаў*, якія ўздзейнічаюць на эмацыянальную сферу чалавека – гэта галоўная ўласцівасць ІРМЛ. Яна характэрна і для бібліяграфічных паказальнікаў, дзе апісаны творы мастацкай літаратуры;

*2) вобразна-мастацкая форма прадстаўлення матэрыялу.* Эстэтычныя веды перадаюцца праз мастацкія вобразы, якія ўздзейнічаюць на чалавека на эмацыянальна-псіхалагічным узроўні, на яго свядомасць. Сэнс твора ўспрымаецца праз вобразную сістэму, у якой аўтар абагульняе і суб'ектыўна адлюстроўвае рэчаіснасць. Пры гэтым чытачы ўспрымаюць не толькі рэальны тэкст, але і падтэкст, закладзены аўтарам. Вобразна-мастацкая форма прадстаўлення матэрыялу характэрна і для рэкамендацыйных бібліяграфічных паказальнікаў, адрасаваных шырокаму колу чытачоў, асабліва дзецям;

*3) духоўна-асобасны характар.* Асоба аўтара, яго светапогляд, духоўныя каштоўнасці, талент, арыгінальнасць мовы і стылю робяць літаратурны твор сапраўды ўнікальным. Адна і тая ж тэма, увасобленая рознымі людзьмі, ніколі не будзе выглядаць аднолькава. Кожны надасць ёй свае рысы і асаблівасці, утрыманыя ў свядомасці аўтара, якая «фарміруецца пад

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

уздзеяннем яго індывідуальнага быцця і ладу жыцця»[39], а таксама культурнай традыцыі эпохі. Гэта ўлічваецца пры стварэнні навукова-дапаможных і рэкамендацыйных бібліяграфічных прадуктаў. Сярод іх шмат персанальных паказальнікаў, біябібліяграфічных даведнікаў і г. д. Аўтарская прымета ўлічваецца таксама пры сістэматызацыі матэрыялу ўнутры бібліяграфічных паказальнікаў – у большасці з іх матэрыял змяшчаецца па персаналіях у алфавітнай паслядоўнасці;

*4) інтэлектуальны кампанент ведаў.* Акрамя эстэтычных ведаў, літаратурныя творы ўтрымліваюць і навуковыя, арыентаваныя на інтэлектуальнае ўспрыманне, якія аказваюць на чытача эфектыўнае пазнаваўчае ўздзеянне. Як адзначыў М. А. Лазарук, «літаратура, як ніводзін з відаў мастацтва, непасрэдна судакранаецца, змыкаецца з навукай, і, як бы мы не фетышызавалі яе як эстэтычны феномен, ад гэтага яна не перастае быць крыніцай ведаў, разлічаных, зусім не абавязкова ў кожным выпадку, на эмацыянальнае ўспрыманне»[40]. Напрыклад, у мастацкіх творах сустракаюцца матэрыялы дакументальнага характару, узятыя з архіваў, фондаў, якія з’яўляюцца рэсурсам дакладных ведаў. Такой жа асновай выступае мемуарная літаратура, публіцыстыка. Для бібліяграфічных крыніц таксама характэрна адлюстраванне навуковых ведаў нароўні з эстэтычнымі. Гэта праяўляецца ў дакладна прадуманай і пабудаванай характарыстыцы мастацкіх твораў, якая абапіраецца на дасягненні літаратурнай навукі і базуецца на ацэнках вядучых спецыялістаў;

*5) унікальнасць і інварыянтнасць мастацкага тэксту.* Толькі арыгінальныя тэксты, апублікаваныя згодна з творчай воляй пісьменніка, з’яўляюцца аўтэнтычнымі і перадаюць сэнс матэрыялу ў той форме, у тым значэнні, якое надаў яму аўтар. «Публікацыі твораў у перакладзе, пераказе, адаптаваным выглядзе маюць эстэтычныя ўласцівасці копіі»[41] і з’яўляюцца варыянтамі асноўнага тэксту.

---

[39] Суминова Т. Н. Художественная культура как информационная система (мировоззренческие и теоретико-методологические основания). – М., 2006. – С. 44. – (Технологии культуры).

[40] Лазарук М. А. Навучанне і выхаванне творчасцю: педагагічныя роздумы і пошукі. – Мінск, 1994. – С. 38.

[41] Справочник библиографа / науч. ред.: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб., 2014. – С. 259.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для бібліяграфічных рэсурсаў мастацкай літаратуры (навукова-дапаможных і рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў) таксама характэрна дадзеная ўласцівасць, паколькі ўсе існуючыя тэксты мастацкай літаратуры, у тым ліку і пераклады, з'яўляюцца аб'ектамі бібліяграфавання. Існуе «бібліяграфія тэкстаў», дзе пералічваюцца ўсе надрукаваныя творы пісьменнікаў. Такія паказальнікі ствараюцца з навуковымі мэтамі і дапамагаюць пры распрацоўцы пытанняў літаратуразнаўства, тэксталагічных даследаваннях, падрыхтоўцы навуковых выданняў сачыненняў класікаў, калі першаснае значэнне мае адшуканне і публікацыя ўнікальнага інварыянтнага аўтарскага тэксту. Бібліяграфія тэкстаў шчыльна звязана з тэксталогіяй, якая дае магчымасць літаратуразнаўцам вывучаць творчасць пісьменніка, а бібліяграфія – прадукаваць тэксталагічныя працы;

*6) магчымасць варыянтнага ўспрымання і інтэрпрэтацыі тэкстаў мастацкай літаратуры.* Прачытанне мастацкага тэксту і яго далейшая інтэрпрэтацыя не з'яўляюцца аднолькавымі для ўсіх чытачоў і залежаць ад асаблівасцей кожнага канкрэтнага чалавека ў пэўны момант. Ад яго індывідуальнага мыслення, развіцця інтэлекту, эмацыянальнай сферы, здольнасцей разумення семантыкі мастацкага тэксту і распрадмечвання яго культурнага сэнсу, асабістага жыццёвага досведу. Мастацкі тэкст «выдае розным чытачам розную інфармацыю – кожнаму ў меру яго разумення, ён жа дае чытачу мову, на якой магчыма засвоіць наступную порцыю звестак пры паўторным чытанні. Ён паводзіць сябе як нейкі жывы арганізм, які знаходзіцца ў зваротнай сувязі з чытачом і навучае гэтага чытача»[42]. Што тычыцца бібліяграфічных рэсурсаў, то гэтая ўласцівасць характэрна для гібрыдных жанраў бібліяграфічных паказальнікаў, у якіх спалучаюцца элементы аўтарскага тэксту з рэкамендацыяй літаратурна-мастацкіх твораў;

*7) дыялагічнасць.* Тэксты мастацкай літаратуры ўяўляюць сабой дыялагічную камунікатыўную сістэму, у якой узаемадзейнічаюць аўтар паведамлення і яго адрасат – чытач. Цягам засваення мастацкіх тэкстаў адбываецца дыялог паміж аўтарам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[42] Лотман Ю. М. Структура художественного текста // Об искусстве / Ю. М. Лотман. – СПб., 1998. – С. 15.

і чытачом праз сістэму вобразаў і сэнсаў мастацкага твора. Пры гэтым чытач становіцца актыўным удзельнікам працэсу камунікацыі праз інтэрпрэтацыю твора, актуалізацыю яго семантыкі ў канкрэтны гістарычны перыяд. Названая ўласцівасць характэрна таксама для рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі;

*8) уласцівасць агульнацікавасці.* Мастацкая літаратура знаходзіць водгук у розных сацыяльных, прафесійных і ўзроставых груп. Бібліяграфічныя дапаможнікі, што дапамагаюць арыентавацца ў творах, таксама цікавыя для розных груп карыстальнікаў;

*9) статычнасць знакавай формы* – немагчымасць пераводу вобразна-мастацкай формы прадстаўлення ведаў у іншую знакавую сістэму, паколькі ў гэтым выпадку яны пазбаўляюцца сэнсу і арыгінальнасці. Мастацкі вобраз, пачуцці, уражанні, якія ён абуджае, можна адлюстраваць толькі пры дапамозе слоў, што выступаюць інструментам творчасці аўтара[43]. Тое самае тычыцца і мастацка-вобразных характарыстык выданняў у рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможніках;

*10) макразгортванне* – для акрэслення зместу твораў мастацкай літаратуры выкарыстоўваецца толькі агульнае апісанне, анатаванне, сістэматызацыя. Формы мікразгортвання матэрыялу (рэферыраванне, канспектаванне і інш.) для перадачы сэнсу мастацкага твора не ўжываюцца, паколькі сутнасныя скарачэнні, якія адбываюцца пры гэтым, не дазваляюць у поўным аб'ёме перадаць сэнс і падтэкст[44].

У адрозненне ад твораў мастацкай літаратуры, для рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў магчыма як макразгортванне, так і мікразгортванне заключанага ў іх матэрыялу, а для навукова-дапаможных – толькі макразгортванне;

*11) адсутнасць старэння тэкстаў мастацкай літаратуры нароўні з адносна павольным старэннем ІРМЛ.* Тэксты мастацкай літаратуры ўвогуле не дапускаюць ужывання ў адносінах да сябе тэрміна «састарэлы». Іх каштоўнасць, цікавасць да іх вызначаюцца не перыядам часу, які прайшоў з моманту іх напісання, а духоўна-эстэтычным патэнцыялам, закладзеным

[43] Справочник библиографа / науч. ред.: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб., 2014. – С. 253.

[44] Там жа.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аўтарам[45]. Безумоўна, некаторыя ідэі, спосабы складання вершаў, мова мастацкіх твораў могуць з цягам часу станавіцца неактуальнымі, паводзіны і ўчынкі герояў – дзіўнымі і незразумелымі, але гэта не прычына для выключэння такой літаратуры з рэестру культурных каштоўнасцей. Наадварот, калі дадзеныя творы з'яўляюцца высокамастацкімі для свайго часу, напісаны па правілах тагачаснага вершаскладання ці прозы, выказваюць светапогляд, мараль, якія не супярэчаць агульначалавечым ідэалам, не маюць дэструктыўных элементаў, то яны складаюць літаратурную спадчыну нацыі, чалавецтва і вывучаюцца ў кантэксце гісторыі літаратуры. На думку Ю. Лотмана, «няма састарэлых твораў, ёсць састарэлыя паведамленні», якія мастацтва ў сваім развіцці выключае з культурнага кантэксту ў пэўны перыяд часу, але «настойліва захоўвае ў сваёй памяці мастацкія мовы мінулых эпох», бо нельга «атаясамліваць спецыфіку мовы канкрэтнай эпохі з каштоўнасцю перадаванай на ёй інфармацыі»[46].

У адрозненне ад тэкстаў мастацкай літаратуры, для ІРМЛ і рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў характэрна адносна павольнае старэнне, бо для іх, як і для першасных ІРЛ, характэрна такая ўласцівасць, як залежнасць зместу ад культурнага кантэксту пэўнай эпохі, што прыводзіць да паступовага старэння матэрыялаў, змешчаных у навукова-дапаможным апараце выдання (анатацыі, прадмовы, пасляслоўя, каментарыяў і інш.) і рэкамендацыйнай характарыстыкі твораў.

Найбольш важнымі ўласцівасцямі ІРМЛ з'яўляюцца нацыянальная спецыфіка мастацкай літаратуры і яе мова.

*Нацыянальная спецыфіка мастацкай літаратуры* дазваляе праз літаратурна-мастацкія творы знаёміцца з культурай, мовай, звычаямі пэўнай нацыі, папулярызаваць нацыянальныя каштоўнасці сярод іншых народаў. Нацыянальная літаратура адлюстроўвае асобы характар, духоўную сутнасць, менталітэт народа, а таксама спрыяе фарміраванню нацыянальнай свядомасці і ідэнтычнасці. Нацыянальная спецыфіка мастацкай літаратуры накладае адбітак на навукова-дапаможную і рэкамендацыйную бібліяграфічную інфармацыю, што дазваляе праз

[45] Справочник библиографа / науч. ред.: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб., 2014. – С. 258.

[46] Лотман Ю. М. Структура художественного текста // Об искусстве / Ю. М. Лотман. – СПб., 1998. – С. 10.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бібліяграфічныя дапаможнікі папулярызаваць самабытныя рысы нацыянальнай культуры.

*Мова ІРМЛ* характарызуецца «мастацкай вобразнасцю і накіраванасцю на мастацкі пошук; змешваннем стыляў; прысутнасцю аўтара і залежнасцю ад задумы і зместу літаратурнага твора; нацыянальным каларытам»[47]. Яна ўяўляе сабой сістэму, угрунтаваную на нацыянальнай літаратурнай мове, і мае пэўную адметнасць у залежнасці ад жанру, стылю, мастацкага кірунку, а таксама ад асаблівасцей пэўнай эпохі, культуры, нацыі.

*Мова ІРМЛ* адрозніваецца ад звычайнай літаратурнай мовы асобай лексікай. У ёй шырока ўжываюцца эпітэты, параўнанні, сінонімы, дыялектызмы, жарганізмы, гістарызмы і многія іншыя лексічныя формы, якія робяць яе вобразнай. Творам мастацкай літаратуры ўласціва асобая гукавая арганізацыя, рытм, рыфмы, інтанацыя і інш.[48]

Адметным для мовы ІРМЛ з'яўляецца яе сінтаксіс, асабліва вершаваных твораў, для якога характэрны паўторы, парушэнні звычайнай лагічнай сувязі паміж словамі ўнутры вершаваных радкоў або празаічных фраз, супастаўленне і супрацьпастаўленне вершаваных радкоў, групоўка асобных фрагментаў літаратурнага выказвання ў пэўныя інтанацыйна-сінтаксічныя адзінствы. Адрозніваюцца паміж сабой лексічны склад мовы, сінтаксіс і стыль напісання кожнага пісьменніка[49].

Акрамя гэтага, мова – найбольш важная нацыянальная прымета ІРМЛ. Яна дапамагае глыбей пранікнуць у нацыянальную культуру, звычаі, гісторыю, псіхалогію, лепш адчуць іх своеасаблівасць.

ІР падсістэмы літаратуразнаўства маюць зусім іншыя спецыфічныя ўласцівасці, якія дазваляюць адрозніваць іх ад ІР падсістэмы мастацкай літаратуры:

*1) навукова-эстэтычны характар ведаў,* ці адлюстраванне эстэтычных ведаў праз навуковыя. Гэта значыць, што ІРЛ, якія паказваюць эстэтычныя веды, самі з'яўляюцца носьбітамі

---

[47] Суминова Т. Н. Художественная культура как информационная система (мировоззренческие и теоретико-методологические основания). – М., 2006. – С. 29. – (Технологии культуры).

[48] Рагойша В. П. Слоўнік-мінімум па літаратуразнаўству. – Мінск : БДУ, 2000. – 123 с.

[49] Там жа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

навуковых ведаў, арыентаваных на сферу лагічнага мыслення і прызначаных галоўным чынам для навукоўцаў і спецыялістаў, па роду заняткаў звязаных з літаратурнай дзейнасцю, а таксама для студэнтаў профільных факультэтаў і вучняў. Гэта тычыцца і навукова-дапаможных бібліяграфічных прадуктаў, якія дэманструюць эстэтычныя веды, але прызначаюцца галоўным чынам для навукоўцаў і спецыялістаў;

*2) мікра- і макразгортванне інфармацыі.* На літаратуразнаўчыя працы могуць быць складзены рэфераты, анатацыі, агляды і г. д. Гэта тычыцца і рэкамендацыйных бібліяграфічных паказальнікаў, якія прысвечаны анонсу літаратуразнаўчых прац. Навукова-дапаможныя бібліяграфічныя паказальнікі падлягаюць толькі макразгортванню;

*3) адносна павольны працэс старэння літаратуразнаўчых прац*. Паўперыяд жыцця гэтых дакументаў складае 28,4 гады[50]. Зразумела, што таксама павольна старэюць і навукова-дапаможныя бібліяграфічныя паказальнікі, якія ўтрымліваюць інфармацыю пра літаратуразнаўчыя працы;

*4) мадэляванне* – літаратуразнаўчыя працы з'яўляюцца свайго роду адбіткамі ці мадэлямі свету мастацкай літаратуры, у якіх прадстаўлена яго разнастайнасць і супярэчлівасць з пазіцый сучаснай навукі і грамадскага жыцця. У бібліяграфічных рэсурсах літаратуразнаўства ёсць звесткі пра адпаведныя дакументы, і тым самым яны мадэлююць дакументныя масівы і патокі літаратуразнаўства.

Спецыфічнай уласцівасцю ІРЛ з'яўляецца залежнасць іх зместу і вызначэння якасных характарыстык літаратурных твораў ад двух элементаў: ад творчых і інтэлектуальных здольнасцей аўтара, ад культурнага кантэксту пэўнай эпохі. Гэтыя элементы аказваюць уплыў на вытлумачэнне і ацэнку літаратурных з'яў і твораў у літаратуразнаўчых працах, а таксама ў бібліяграфічных паказальніках (асабліва рэкамендацыйных), і ўвогуле, на ўключэнне тых ці іншых тэкстаў у іх. Гэта выклікана тым, што, з аднаго боку, мастацкі твор напісаны ў пэўную гістарычную эпоху, а таму мае канкрэтны гістарычны сэнс. З іншага боку, кожны інтэрпрэтатар – чытач, літаратурны крытык, літаратуразнаўца дабаўляюць новы сэнс, разуменне

---

[50] Справочник библиографа / науч. ред.: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб., 2014. – С. 114.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

твора, якое абумоўлена інтэлектуальнымі і творчымі асаблівасцямі чалавека, а таксама кантэкстам культурнай традыцыі, якая існуе ў момант інтэрпрэтацыі тэксту[51].

Акрамя ўсіх вышэйпералічаных уласцівасцей ІРЛ, неабходна разгледзець яшчэ некалькі, характэрных толькі для інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў галіны.

Па-першае, спецыфічнай уласцівасцю бібліяграфічных рэсурсаў літаратуразнаўства з'яўляецца наяўнасць вялікай колькасці ўнутрыкніжных і прыартыкульных бібліяграфічных матэрыялаў у гісторыка-літаратурных і літаратуразнаўчых даследаваннях, у выданнях твораў пісьменнікаў і манаграфіях пра іх.

Па-другое, бібліяграфічныя рэсурсы літаратуразнаўства маюць адносную самастойнасць, што праяўляецца ў існаванні «памежных» ці «гібрыдных» жанраў[52], напрыклад, папулярных энцыклапедый, дзе другасная інфармацыя існуе разам з першаснай, якую стварае сам бібліёграф у працэсе працы над паказальнікам. Асаблівасць дадзенага жанру ў тым, што ў творах спалучаюцца элементы папулярнага літаратуразнаўчага аналізу з бібліяграфічнымі формамі рэкамендацыі кніг. Змест такіх папулярных энцыклапедый уяўляе сабой звязны тэкст, які мае самастойнае пазнавальнае значэнне і ўтрымлівае звесткі пра кнігі ў форме асобных запісаў ці спісаў літаратуры[53]. Да літаратуразнаўства адносяцца агляды літаратуразнаўчых прац. Яны ўтрымліваюць вялікі бібліяграфічны матэрыял, грунтоўныя абагульненні, высновы спецыялістаў. Вынікі такога даследавання можна лічыць прыналежнымі і да літаратуразнаўчай, і да інфармацыйнай сфер дзейнасці.

У рэкамендацыйнай бібліяграфіі да гібрыдных форм прылічваюцца кнігі пра творчасць і лёсы пісьменнікаў з бібліяграфічнымі спісамі выданняў мастацкіх тэкстаў і літаратуразнаўчых прац, з невялікімі анталогіямі – вершамі, фрагментамі з празаічных твораў[54].

---

[51] Суминова Т. Н. Информационные ресурсы художественной культуры (артосферы). – М., 2006. – С. 195. – (Технологии культуры).

[52] Давыдова М. И. Библиография художественной литературы и литературоведения: объект, специфика, функции, научная основа. – М., 2002. – С. 7–8.

[53] Давыдова М. И. Рекомендательная литературная библиография как средство формирования художественной культуры общества. – М., 1993. – С. 45.

[54] Давыдова М. И. Библиография художественной литературы и литературоведения: объект, специфика, функции, научная основа. – М., 2002. – С. 8–9.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бібліяграфічныя паказальнікі таксама ўтрымліваюць шмат звестак літаратуразнаўчага і бібліяграфічнага характару – біяграфічныя даныя пісьменнікаў, спісы псеўданімаў, выданняў, у якіх публікаваліся творы, паказальнікі перакладчыкаў, узоры аўтографаў. Многія з іх маюць гістарыяграфічныя агляды пэўных перыядаў развіцця літаратуры. Усё гэтае дазваляе выкарыстоўваць іх не толькі як крыніцы другаснай, але і як самастойнай літаратуразнаўчай інфармацыі.

Агульнай для падсістэм ІРМЛ і ІРЛ з'яўляецца ўласцівасць выхаваўча-педагагічнага эфекту ІРМЛЛ. Рэсурсы выкарыстоўваюцца не толькі ў цікавым правядзенні вольнага часу і навуковай дзейнасці, але і ў педагагічнай працы, у працэсе духоўнага выхавання асобы.

Веды, закладзеныя ў творах мастацкай літаратуры, уплываюць на інтэлект, пачуцці, волю, светапогляд чалавека, фарміруюць свет яго эстэтычных і маральных каштоўнасцей. Яны ўзбагачаюць яго мову, фантазію, развіваюць эстэтычны густ, здольнасць да праяўлення пачуццяў, гуманнасць, нацыянальную свядомасць, патрыятызм. Такім чынам, чытанне твораў мастацкай літаратуры, а таксама выкарыстанне іх у педагагічнай дзейнасці дазваляе ўплываць на адукацыю, выхаванне і развіццё чалавека.

Выкарыстанне ІРЛ у педагагічнай працы дапамагае фарміраванню ведаў, уменняў і навыкаў, якія забяспечваюць успрыманне і глыбокае засваенне мастацка-эстэтычных, нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей мастацкай літаратуры, якія неабходны для яе разумення.

Выхаваўча-педагагічны эфект маюць навукова-дапаможныя, вучэбна-дапаможныя і рэкамендацыйныя бібліяграфічныя выданні мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства. Ён праяўляецца ў фарміраванні ўменняў і навыкаў аналізу і разумення літаратурных твораў і з'яў, дапамозе ў авалоданні ведамі па тэорыі, гісторыі літаратуры, у выхаванні асобы, яе маральным, эстэтычным, эмацыянальным развіцці.

У рэкамендацыйнай, вучэбна-дапаможнай бібліяграфіі выкарыстоўваецца педагагічная методыка. У паказальніках для маладых карыстальнікаў ужываецца індуктыўны метад навучання, які дазваляе ісці ад чытання мастацкіх твораў да іх аналізу. Дэдуктыўны метад навучання для больш сталых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чытачоў заключаецца ў руху ад агульнага да прыватнага, ад характарыстыкі пэўнага літаратурнага перыяду або жанру да рэкамендацыі пэўных твораў, якія адносяцца да апісанага перыяду ці жанру[55].

Рэкамендацыйная і вучэбна-дапаможная бібліяграфія ўтрымліваюць рэкамендацыі літаратуразнаўчых і літаратурна-крытычных прац, што спрыяюць паглыбленню эстэтычнага ўспрымання твораў і павышэнню эстэтычнага ўзроўню чытачоў[56]. Галоўнае – арыентаванне карыстальнікаў у літаратурных каштоўнасцях, кірунках, жанрах, далучэнне да вывучэння літаратуры, засваення спецыялізаваных ведаў, у тым ліку і шляхам самаадукацыі.

Навукова-дапаможныя бібліяграфічныя рэсурсы літаратуразнаўства апасродкавана аказваюць выхаваўча-педагагічны эфект – праз адлюстраванне літаратуразнаўчых дакументаў. Выключэнне складае семінарый, у якім акрамя бібліяграфічнага спісу таксама дадзены метадычныя парады і распрацоўкі тэм, прызначаных для самастойнага вывучэння.

Вышэйпрыведзеная класіфікацыя метасістэмных і спецыфічных уласцівасцей інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства абагульнена ў табл. 1.2. і 1.3.

*Табліца 1.2*

**Метасістэмныя ўласцівасці інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства**

<table>
<tr><td colspan="3">Метасістэмныя ўласцівасці інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства</td></tr>
<tr><td rowspan="2">атрыбутыўныя</td><td colspan="2">прагматычныя</td></tr>
<tr><td>інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры</td><td>інфармацыйныя рэсурсы літаратуразнаўства</td></tr>
<tr><td rowspan="2">– невычарпальнасць;<br>– папаўняльнасць;<br>– безальтэрнатыўнасць;<br>– адлюстраванне;<br>– генерацыйны эфект</td><td>– актуальнасць;<br>– арыгінальнасць;<br>– карыснасць</td><td>– актуальнасць;<br>– навізна;<br>– сапраўднасць;<br>– карыснасць</td></tr>
<tr><td colspan="2">каштоўнасць</td></tr>
</table>

[55] Давыдова М. И. Рекомендательная литературная библиография как средство формирования художественной культуры общества. – М., 1993. – С. 11–13.

[56] Библиография художественной литературы и литературоведения / под. ред. С. А. Трубникова. – М., 1985. – С. 72–73.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 1.3*

**Спецыфічныя ўласцівасці інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства**

| Спецыфічныя ўласцівасці інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры | Спецыфічныя ўласцівасці інфармацыйных рэсурсаў літаратуразнаўства | |
|---|---|---|
| | уласцівасці першасных інфармацыйных рэсурсаў літаратуразнаўства | уласцівасці інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў літаратуразнаўства |
| – эстэтычны характар ведаў;<br>– інтэлектуальны кампанент ведаў;<br>– вобразна-мастацкая форма прадстаўлення матэрыялу;<br>– статычнасць знакавай формы;<br>– духоўна-асобасны характар;<br>– унікальнасць і інварыянтнасць мастацкага тэксту;<br>– варыянтнае ўспрыманне і інтэрпрэтацыя тэкстаў мастацкай літаратуры;<br>– дыялагічнасць ІРМЛ;<br>– агульнацікавасць;<br>– макразгортванне інфармацыі;<br>– адсутнасць старэння тэкстаў мастацкай літаратуры;<br>– нацыянальная спецыфіка;<br>– мова | – навукова-эстэтычны характар ведаў;<br>– мікра- і макразгортванне інфармацыі;<br>– адносна павольны працэс старэння літаратуразнаўчых прац;<br>– мадэляванне;<br>– залежнасць зместу літаратуразнаўчых прац і вызначэння якасных характарыстык літаратурных твораў ад творчых і інтэлектуальных здольнасцей аўтара і культурнага кантэксту эпохі | – наяўнасць вялікай колькасці ўнутрыкніжных і прыартыкульных бібліяграфічных матэрыялаў у гісторыка-літаратурных і літаратуразнаўчых даследаваннях, у выданнях твораў пісьменнікаў і манаграфіях пра іх;<br>– адносная самастойнасць бібліяграфічных рэсурсаў літаратуразнаўства, якая праяўляецца ў існаванні так званых памежных, ці гібрыдных, жанраў, накшталт папулярных энцыклапедый |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Пытанні для самакантролю

1. Якія ўласцівасці можна вызначыць для любых ІР?

2. Што такое агульныя метасістэмныя ўласцівасці? Пералічыце іх.

3. Дайце азначэнне паняццю «спецыфічныя ўласцівасці».

4. Назавіце атрыбутыўныя ўласцівасці ІРМЛЛ.

5. Акрэсліце прагматычныя ўласцівасці ІРМЛ і ІРЛ.

6. Якія спецыфічныя ўласцівасці маюць ІРМЛ і ІРЛ?

7. Якая ўласцівасць з'яўляецца агульнай для падсістэм ІРМЛ і ІРЛ?

8. Ахарактарызуйце спецыфічныя ўласцівасці інфармацыйна-бібліяграфічных рэсурсаў літаратуразнаўства.

### Заданне для самастойнай работы па тэме 1.2.

*Мэта* – навучыцца аналізаваць падыходы спецыялістаў да выяўлення асаблівасцей ІР, дакументаў, тэкстаў мастацкай літаратуры і прымяняць іх пры вызначэнні ўласцівасцей ІРМЛЛ.

*Пры дапамозе прапанаваных крыніц прааналізуйце:*

1. Падыходы Н. Б. Зіноўевай, а таксама Н. М. Кушнарэнкі да вызначэння ўласцівасцей дакументаў. Як можна прымяніць кожны з іх пры распрацоўцы ўласцівасцей ІРМЛЛ?

2. Падыход Ю. М. Сталярова да вызначэння ўласцівасцей ІР і яго ўжыванне пры распрацоўцы ўласцівасцей ІРМЛЛ.

3. Пададзены ў «Даведніку бібліёграфа» метад для вызначэння ўласцівасцей ІР. Як можна прымяніць яго ў дачыненні да ІРМЛЛ?

4. Вызначэнне структуры мастацкага тэксту па Ю. Лотману. Чым карысны гэты падыход пры апісанні ІРМЛЛ?

5. Асаблівасці мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, на якія неабходна абапірацца пры распрацоўцы ўласцівасцей ІРМЛЛ.

*Літаратура*

*1. Зиновьева, Н. Б.* Документоведение / Н. Б. Зиновьева. – М., 2001. – С. 78–80. – (Серия «Современная библиотека»).

*2. Кушнаренко, Н. Н.* Документоведение : учебник / Н. Н. Кушнаренко. – 7-е изд., стер. – Киев, 2006. – С. 36–37. – (Высшее образование XXI века).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Лотман, Ю. М.* Структура художественного текста / Ю. М. Лотман // Об искусстве / Ю. М. Лотман. – СПб., 1998. – С. 15–20, 32–33, 34–35.
4. Справочник библиографа / науч. ред.: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб., 2014. – С. 253–259.
5. *Столяров, Ю. Н.* Документный ресурс / Ю. Н. Столяров. – М., 2001. – С. 23–24.
6. Уводзіны ў літаратуразнаўства : вучэб. дапам. : у 2 ч. / пад рэд. В. П. Рагойшы. – Мінск, 2009. – Ч. 1 : Літаратуразнаўства як навука. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка. – С. 77–91, 94–96, 98–102, 107–111, 112–113.

## ТЭМА 1.3. ПРЫНЦЫПЫ ФАРМІРАВАННЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

Важная тэарэтычная праблема ІРМЛЛ – распрацоўка прынцыпаў іх фарміравання, паколькі ад яе вырашэння залежыць эфектыўнасць функцыянавання азначаных рэсурсаў у грамадстве.

Пытанне пра прынцыпы фарміравання ІР мала распрацавана і з’яўляецца дыскусійным. У нешматлікіх работах разглядаюцца прынцыпы бібліяграфічнай дзейнасці (А. П. Коршунаў)[57], дакументных рэсурсаў (Ю. М. Сталяроў)[58]. Адзінства поглядаў на іх склад адсутнічае. Напрыклад, А. П. Коршунаў прапануе для ўсёй сістэмы дакументных камунікацый выкарыстоўваць прынцыпы, уласцівыя бібліяграфічнай дзейнасці. Ён падзяляе іх на агульныя і прыватныя, фармальныя (колькасныя) і зместавыя (якасныя); унутраныя (асабістыя) і знешнія (запазычаныя).

Агульныя прынцыпы, на думку аўтара, характэрны для ўсёй бібліяграфічнай дзейнасці цалкам, а прыватныя – толькі для пэўных яе відаў. Да апошніх А. П. Коршунаў адносіць фармальна-колькасныя прынцыпы паўнаты і дакладнасці. Сярод якасна-зместавых прынцыпаў, звязаных з рэалізацыяй ацэначнай функцыі бібліяграфічнай інфармацыі, галоўным А. П. Коршунаў называе прынцып якаснай выбіральнасці. Да ўнутраных

[57] Коршунов О. П. Принципы библиографической деятельности // Мир библиографии. – 2000. – № 5. – С. 11–13.
[58] Столяров Ю. Н. Документный ресурс. – М. : Либерия, 2001. – 149 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(асабістых) прынцыпаў аўтар аднёс фармальныя, а да знешніх (запазычаных) – якасна-зместавыя.

Ю. М. Сталяроў[59] у якасці прынцыпаў функцыянавання дакументных рэсурсаў прапануе наступныя: 1) мэтазгоднасці; 2) квантуемасці; 3) аптымальнасці; 4) сумяшчальнасці; 5) разумнага дублявання; 6) сістэматызаванасці; 7) выбіральнасці; 8) абароненасці. Прапанаваная ім структура мае сутнасны недахоп – яна з’яўляецца лінейнай.

Прынцыпы фарміравання ІРМЛЛ неабходна падзяляць на *агульныя* (уласцівыя ІРМЛЛ як элементу метасістэмы ІР і аднолькавыя для рэсурсаў любой галіны) і *прыватныя* (характэрныя толькі для ІРМЛЛ).

Пры вызначэнні агульных метасістэмных прынцыпаў мэтазгодна кіравацца прынцыпамі дакументных рэсурсаў, распрацаванымі Ю. М. Сталяровым, з улікам спецыфікі ІРМЛЛ. Да агульных прынцыпаў фарміравання ІРМЛЛ можна аднесці:

*1) прынцып мэтазгоднасці* – фарміраванне ІРМЛЛ ажыццяўляецца ў адпаведнасці з мэтамі, якіх дасягае абслугаваная рэсурсамі галіна, а менавіта садзеянне інфармацыйнаму забеспячэнню сферы вольнага часу і самаадукацыі, навуковай, адукацыйнай, прафесійнай сфер;

*2) прынцып квантуемасці* – ІРМЛЛ уяўляюць сабой цэласную сістэму з дзяленнем на мноства адносна аўтаномных рэсурсаў, якія класіфікуюцца па розных прыметах (грамадскае прызначэнне, змест, прыналежнасць, від носьбіта інфармацыі, форма падачы інфармацыі, спосаб дакументавання і інш.). Напрыклад, у адпаведнасці з прыметай грамадскага прызначэння ў сістэме ІРМЛЛ прадстаўлены першасныя і другасныя рэсурсы для інфармацыйнага забеспячэння: 1) сферы вольнага часу; 2) навуковай, адукацыйнай, мастацкай, прафесійнай сфер. Акрамя таго, важна, каб адпаведна віду носьбіта існавалі рэчавыя і электронныя рэсурсы, і ў залежнасці ад формы падачы інфармацыі – тэкставыя, гукавыя, лічбавыя, мультымедыйныя і інш.;

*3) прынцып аптымальнасці* – колькасць існуючых і створаных па пэўных тэмах і праблемах ІР павінна адпавядаць сапраўдным запытам і ў поўнай меры забяспечваць інфармацыйныя патрэбнасці карыстальнікаў;

[59] Столяров Ю. Н. Документный ресурс. – М., 2001. – С. 26–31.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*4) прынцып размежавання доступу* – неабходнасць вызначэння ступені даступнасці ІРМЛЛ. Існуюць дакументы агульнадаступныя і абмежаванага доступу. Для ІРМЛЛ такімі дакументамі з'яўляюцца творы, якія нясуць у сваім змесце дэструктыўную інфармацыю, садзейнічаюць распальванню рэлігійных, нацыянальных, расавых канфліктаў, прапагандуюць войны, амаральныя паводзіны і інш. Яны могуць вывучацца спецыялістамі ў кантэксце гісторыі літаратуры, аднак іх шырокае распаўсюджанне ў грамадстве забаронена.

Пры вызначэнні прыватных прынцыпаў ІРМЛЛ неабходна кіравацца спецыфікай літаратуразнаўства і мастацкай літаратуры, а таксама методыкай, распрацаванай А. П. Коршунавым.

Спецыфічнымі рысамі мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, якія накладаюць адбітак на змест прыватных прынцыпаў ІРМЛЛ, з'яўляюцца іх *аксіялагічная накіраванасць* – магчымасць уздзейнічаць на фарміраванне духоўнай культуры грамадства, яго каштоўнасных арыенціраў, а таксама іх *эстэтычны характар* – здольнасць абуджаць эмоцыі і пачуцці, фарміраваць эстэтычны густ.

Прыватныя прынцыпы, прапанаваныя А. П. Коршунавым для бібліяграфічнай дзейнасці, могуць быць рэкамендаваны і для фарміравання ІРМЛЛ, але іх змест павінен вызначацца з улікам галіновай спецыфікі рэсурсаў. Прыватныя прынцыпы фарміравання ІРМЛЛ наступныя:

*1) прынцып паўнаты,* згодна з якім у першасных і другасных крыніцах з максімальнай падрабязнасцю апісана ўся інфармацыя па пэўнай тэме або праблеме ў акрэсленых межах. Вычарпальнай паўнатой адрозніваюцца літаратуразнаўчыя працы і зборы твораў мастацкай літаратуры. Апошнія становяцца базай для складання іншых тыпаў літаратурна-мастацкіх выданняў: масавых і навукова-масавых.

Для бібліяграфічнай інфармацыі прынцып паўнаты азначае, што спецыяліст павінен з максімальнай дэталёвасцю выявіць усе дакументы ў акрэсленых межах і ўключыць іх у бібліяграфічны дапаможнік. Гэты прынцып у найбольшай ступені характэрны для навукова-дапаможнай галіновай бібліяграфіі (Н. Б. Ватацы «Мастацкая літаратура Савецкай Беларусі (1961–1968): бібліяграфія асобных выданняў, Мінск, 1971), дзяржаўнай (раздзелы 882.6.0 Тэорыя вывучэння беларускай літаратуры, 821.161.1 Літаратура Беларусі на рускай мове, 821.161.3



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларуская літаратура ў «Кніжным летапісе», «Летапісе часопісных артыкулаў», «Летапісе газетных артыкулаў»);

*2) прынцып дакладнасці,* згодна з якім патрабуецца максімальная даставернасць усіх элементаў інфармацыйных рэсурсаў: тэксту, яго гісторыі, даціроўкі, інфармацыі пра аўтара, а таксама звестак, якія прыводзяцца ў навукова-дапаможным апараце.

Для бібліяграфічных рэсурсаў прынцып дакладнасці патрабуе адпаведна выкананага бібліяграфічнага запісу, а ў яго межах – бібліяграфічнага апісання, а таксама даставернай характарыстыкі ўсіх аспектаў дакументаў у працэсе іх бібліяграфавання[60];

*3) прынцып якаснай выбіральнасці* – інфармацыйныя рэсурсы павінны адпавядаць пэўным якасным крытэрыям, якіх існуе шмат, і кожны з іх можа быць абраны вядучым у залежнасці ад мэтавага ці чытацкага прызначэння рэсурсу[61]. Для ІРМЛ першаступенным крытэрыем якаснага адбору з'яўляецца эстэтычная дасканаласць твораў, якая праяўляецца ў іх сюжэтнай лініі, ідэйна-маральнай накіраванасці, прафесійным майстэрстве пісьменніка, якаснай інфармацыі, якая прыводзіцца ў навукова-дапаможным апараце. Акрамя таго, для першасных дакументаў літаратуразнаўства важным застаецца крытэрый навуковасці, а для твораў мастацкай літаратуры – забаўляльнасці. Прынцып якаснай выбіральнасці знаходзіць найбольшае прымяненне пры фарміраванні ІР, прызначаных для інфармацыйнага забеспячэння сферы вольнага часу і самаадукацыі, прафесійнай, адукацыйнай сфер.

Прынцып якаснай выбіральнасці характэрны для рэкамендацыйнай бібліяграфіі. Ён звязаны з рэалізацыяй яе ацэначнай функцыі і прадугледжвае ажыццяўленне адбору і ацэнкі твораў пры ўключэнні іх у крыніцы другаснай інфармацыі, што ажыццяўляецца на падставе пэўных якасных крытэрыяў;

*4) прынцып цэласнасці,* згодна з якім кожны кампанент ІРМЛЛ павінен уяўляць сабой цэласны мастацкі свет, што існуе ў адзінстве зместу і формы, ідэйнасці і мастацкасці, увасаблення сюжэту і ўспрымання яго чытачом;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[60] Коршунов О. П. Принципы библиографической деятельности // Мир библиографии. – 2000. – № 5. – С. 12.

[61] Антопольский А. Б. Проблемы классификации информационных ресурсов по критериям информационной безопасности // Информ. ресурсы России. – 1997. – № 6. – С. 12.

*5) прынцып аб’ектыўнасці* – ужываецца для крыніц літаратуразнаўства і другаснай інфармацыі. Для літаратуразнаўчых прац ён азначае, што галоўным пры характарыстыцы літаратурных твораў павінна быць вылучэнне іх сапраўдных эстэтычных якасцей, якія праяўляюцца ў тэме, сюжэце, увасобленым у іх эстэтычным ідэале, своеасаблівасці і мастацкай дасканаласці.

Для крыніц другаснай інфармацыі прынцып аб’ектыўнасці ўказвае на тое, што пры іх стварэнні ацэнка літаратурных твораў і з’яў павінна ажыццяўляцца інфармацыйнымі работнікамі ва ўзаемадзеянні з літаратуразнаўцамі, з улікам іх прафесійных ведаў і ацэнак якасці твораў. Для крыніц навукова-дапаможнай і рэкамендацыйнай бібліяграфіі сутнасць гэтага прынцыпу заключаецца ў тым, што бібліёграф пры ацэнцы твораў, якія ўключае ў бібліяграфічныя паказальнікі, павінен абапірацца на тэорыю бібліяграфазнаўства і літаратуразнаўства, выкарыстоўваць методыку аналізу і характарыстыкі літаратурнага працэсу і мастацкіх твораў, прынятую ў літаратуразнаўстве, літаратурнай крытыцы і бібліяграфіі, супрацоўнічаць ва ўзаемадзеянні з літаратуразнаўцамі;

*6) прынцып комплекснасці мастацка-вобразных ведаў ІРМЛ* азначае, што ІРМЛ павінны не толькі забаўляць, але і садзейнічаць фарміраванню асобы, развіццю яе інтэлекту, маральных якасцей і светапогляду. Гэта дасягаецца праз адбор найлепшых твораў мастацкай літаратуры, праз тэксты ўступных і заключных артыкулаў, каментарыі і іншыя элементы навукова-дапаможнага апарату, у якіх даецца характарыстыка твора, яго літаратуразнаўчы аналіз, разглядаюцца жыццё і дзейнасць пісьменніка, прыводзяцца бібліяграфічныя спісы вядомых твораў аўтараў ці твораў, якія адносяцца да пэўнага літаратурнага кірунку або жанру.

Гэта тычыцца і другаснай інфармацыі (рэкамендацыйнай і вучэбна-дапаможнай бібліяграфіі, рэфератыўнай і аглядней інфармацыі) і ажыццяўляецца праз якасны адбор і ацэнку твораў. Рэкамендацыйная характарыстыка павінна быць насычанай пазнавальнымі звесткамі, мець педагагічную накіраванасць, імкнуцца не толькі даць кароткае апісанне твора, але і падкрэсліць яго выхаваўчае значэнне, прадстаўленыя ў ім каштоўнасныя катэгорыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Пытанні для самакантролю

1. Як падраздзяляюцца прынцыпы фарміравання ІРМЛЛ?

2. Якія прынцыпы фарміравання ІРМЛЛ адносяцца да агульных?

3. Назавіце прыватныя прынцыпы фарміравання ІРМЛЛ.

4. Які прыватны прынцып характэрны толькі для ІРЛ? А толькі для ІРМЛ?

### Заданне для самастойнай работы па тэме 1.3.

*Мэта* – навучыцца аналізаваць падыходы спецыялістаў да выяўлення прынцыпаў ІР, асаблівасцей мастацкай літаратуры і прымяняць іх пры вызначэнні прынцыпаў ІРМЛЛ.

*Пры дапамозе прапанаваных крыніц прааналізуйце:*

1. Падыход А. П. Коршунава да вызначэння прынцыпаў бібліяграфічнай дзейнасці. Як можна прымяніць яго пры распрацоўцы прынцыпаў ІРМЛЛ?

2. Падыход Ю. М. Сталярова да вызначэння прынцыпаў ІР і яго ўжыванне пры распрацоўцы прынцыпаў ІРМЛЛ.

3. Погляды М. І. Давыдавай на спецыфіку літаратурнай бібліяграфіі. Метад, прапанаваны ў «Даведніку бібліёграфа» для вызначэння ўласцівасцей ІР. Як можна прымяніць іх пры распрацоўцы прынцыпаў ІРМЛЛ?

*Літаратура*

1. *Давыдова, М. И.* Библиография художественной литературы и литературоведения: объект, специфика, функции, научная основа / М. И. Давыдова. – М. : МГУКИ, 2002. – 21 с.

2. *Давыдова, М. И.* Рекомендательная литературная библиография как средство формирования художественной культуры общества / М. И. Давыдова. – М., 1993. – С. 11–13.

3. *Коршунов, О. П.* Принципы библиографической деятельности / О. П. Коршунов // Мир библиографии. – 2000. – № 5. – С. 11–13.

4. *Столяров, Ю. Н.* Документный ресурс / Ю. Н. Столяров. – М., 2001. – С. 26–31.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭМА 1.4. ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ СТРУКТУРА ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

Функцыянальная структура адлюстроўвае прызначэнне, мэты і задачы ІРМЛЛ, якія яны выконваюць згодна з сістэмна-дзейнасным падыходам як частка метасістэмы ІР і як сістэма галіновых рэсурсаў сферы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

У большасці навуковых прац, дзе даследуюцца функцыі дакументаў (А. В. Сакалова, Н. М. Кушнарэнкі, Н. Б. Зіноўевай і інш.), прынята падзяляць іх на агульныя і спецыяльныя, што справядліва і для ІРМЛЛ. *Агульныя метасістэмныя функцыі* характэрны для ўсіх відаў інфармацыйных рэсурсаў увогуле і для ІРМЛЛ, як часткі метасістэмы ІР, у прыватнасці. Да іх адносяць інфармацыйную, кумулятыўную, пошукавую, ідэнтыфікацыйную.

*Спецыяльныя функцыі* розных відаў ІР значна адрозніваюцца паміж сабой, і менавіта яны дазваляюць убачыць адметнасць і своеасаблівасць тых ці іншых інфармацыйных рэсурсаў, даць іх характарыстыку і выявіць спецыфіку.

Спецыяльныя функцыі галіновых ІР – прадмет дыскусійны. Неадназначна вырашаецца пытанне пра суадносіны функцый, што выконваюцца непасрэдна галіной, якую абслугоўваюць інфармацыйныя рэсурсы, і ўласных функцый інфармацыйных рэсурсаў. Існуе падыход, у адпаведнасці з якім функцыі пэўнай галіны механічна пераносяцца на тую сферу інфармацыйнай дзейнасці ці ІР, якія яе абслугоўваюць (напрыклад, функцыі мастацкай літаратуры механічна пераносяцца на яе інфармацыйныя рэсурсы). У апазіцыі да такога падыходу знаходзіцца Н. А. Сляднева[62], якая лічыць, што неабходна вызначаць дзве групы функцый у адносінах да абслуговага віду дзейнасці: 1) функцыі абслугоўвання; 2) функцыі рэдуплікацыі, якія выконвае абслугоўваемая галіна і якія характэрны таксама і для адпаведнай інфармацыйнай дзейнасці.

Згодна з вышэйапісаным палажэннем можна вызначыць групу функцый ІРМЛЛ, накіраваных на абслугоўванне ці

[62] Сляднева Н. А. Библиография в системе Универсума человеческой деятельности: опыт системно-деятельностного анализа : моногр. – М., 1993. – С. 187–195.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйнае забеспячэнне сфер дзейнасці, якія існуюць у галіне мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства: сферы вольнага часу і самаадукацыі, навукі, адукацыі, прафесійнай сферы. Акрамя таго, можна аб'яднаць у асобныя групы функцыі, уласцівыя мастацкай літаратуры як пэўнаму віду мастацтва і літаратуразнаўству як навуцы. Яны адлюстроўваюць іх сутнасць і ўздзеянне на чалавека (функцыі мастацка-вобразных і навуковых ведаў). Варта далучыць таксама функцыі, характэрныя для дакументаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства як матэрыяльных носьбітаў і транслятараў зафіксаванай на іх інфармацыі.

Такім чынам, функцыі ІРМЛЛ мэтазгодна дыферэнцыраваць на тры групы. *Першая група – функцыі інфармацыйнага забеспячэння*, якія выконваюць ІРМЛ у дачыненні да літаратуразнаўства і мастацкай літаратуры як іх метасістэмы. Яны з'яўляюцца асноўнымі, бо накіраваны на дапамогу мастацкай літаратуры і літаратуразнаўству ў ажыццяўленні іх асноўных мэт і задач, а значыць, на падтрымку іх жыццядзейнасці.

*Другая група – функцыі, уласцівыя дакументам мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства* (МЛЛ) як матэрыяльным носьбітам і транслятарам зафіксаваных на іх ведаў, паколькі яны адлюстроўваюць пэўную ролю, якую азначаныя дакументы выконваюць у дачыненні да галіны дзейнасці.

*Трэцяя група – функцыі, характэрныя для мастацкай літаратуры як віду мастацтва і літаратуразнаўства як навукі,* інакш кажучы, функцыі галіны. Яны дэманструюць ролю, якую мастацкая літаратура і літаратуразнаўства выконваюць у дачыненні да грамадства ў цэлым і да кожнага яго члена ў прыватнасці.

Далейшы разгляд функцый ІРМЛ і ІРЛ ажыццяўляецца асобна, бо відавочна, што функцыі, уласцівыя мастацкай літаратуры, і навуцы, якая яе вывучае, адрозніваюцца.

### 1.4.1. Функцыі інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры

Першая група функцый – *функцыі інфармацыйнага забеспячэння мастацкай літаратуры* вылучаюцца ў адпаведнасці са сферамі дзейнасці (вольнага часу і самаадукацыі, адукацыі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прафесійнай сферы, сферы навукі). Іх выконваюць як першасныя ІРМЛ, так і другасныя.

*Функцыя інфармацыйнага забеспячэння сферы вольнага часу і самаадукацыі* азначае, што ІРМЛ дазваляюць карыстальнікам задавальняць асабістыя эстэтычныя, пазнавальныя, духоўныя, інтэлектуальныя патрэбнасці, прыемна і рацыянальна праводзіць вольны час. Яна характэрна для такіх відаў першасных ІРМЛ, як навукова-масавыя і масавыя выданні мастацкай літаратуры (друкаваныя і электронныя). Таксама дадзеную функцыю выконваюць і другасныя рэсурсы. Рэкамендацыйныя бібліяграфічныя выданні, бібліяграфічныя спісы, што суправаджаюцца рэкамендацыйнымі характарыстыкамі, адрасаваны шырокаму колу карыстальнікаў і дапамагаюць ім у працэсах адукацыі, самаадукацыі і правядзення вольнага часу. Сукупнасць гэтых выданняў прадстаўляе мастацкую літаратуру, задавальняе розныя аспекты інтарэсу чытачоў да яе (жанравы, персанальны, тэматычны, гісторыка-літаратурны і інш.).

Акрамя таго, падрыхтаваныя карыстальнікі могуць звяртацца і да навукова-дапаможнай бібліяграфіі, якая дае адносна поўную інфармацыю.

*Функцыя інфармацыйнага забеспячэння адукацыі.* ІРМЛ з’яўляюцца сродкам атрымання работнікамі адукацыйнай сферы матэрыялаў, неабходных для ажыццяўлення вучэбнага працэсу. Да першасных выданняў, што выконваюць дадзеную функцыю, адносяцца асобныя масавыя літаратурна-мастацкія выданні і літаратурна-мастацкія выданні, якія выходзяць у складзе спецыяльных серый і ўтрымліваюць творы для засваення ў навучальных установах (напрыклад, «Школьная бібліятэка»).

Гэтую ж функцыю выконваюць і рэкамендацыйныя бібліяграфічныя дапаможнікі, прызначаныя для інфармацыйнага забеспячэння выкладчыкаў, настаўнікаў літаратуры сярэдняй школы, студэнтаў-філолагаў і інш. Некаторыя рэкамендацыйныя дапаможнікі маюць канкрэтнае мэтавае прызначэнне: для пазакласнай работы са школьнікамі, для вывучэння спецкурсаў. Гэтую функцыю таксама выконваюць бібліяграфічныя спісы, змешчаныя ў вучэбных праграмах, вучэбна-метадычных і навукова-метадычных дапаможніках, і семінарыі – комплекс-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя бібліяграфічныя і вучэбна-метадычныя (навукова-метадычныя) дапаможнікі. У іх прапануецца значная колькасць тэм, па кожнай з іх даецца прыблізны план яе распрацоўкі, метадычныя ўказанні і бібліяграфічныя спісы. Семінарыі могуць выкарыстоўвацца студэнтамі-філолагамі, выкладчыкамі як у вучэбнай, так і ў навуковай рабоце, а таксама чытачамі, якія паглыблена займаюцца літаратурнай самаадукацыяй. На жаль, гэты від бібліяграфічных дапаможнікаў сёння не мае распаўсюджання, а па беларускай мастацкай літаратуры ўвогуле не ўдалося выявіць ніводнага такога асобніка.

*Функцыя інфармацыйнага забеспячэння прафесійнай сферы.* ІРМЛ забяспечваюць неабходнай інфармацыяй прадстаўнікоў прафесійнай сферы, звязанай з літаратурнай камунікацыяй – бібліёграфаў, рэдактараў, журналістаў, перакладчыкаў, крытыкаў і інш. Яна ў першую чаргу характэрна для навукова-масавых і каментаваных масавых выданняў мастацкай літаратуры, а таксама для другасных крыніц інфармацыі – рэкамендацыйных бібліяграфічных паказальнікаў, прыкніжных і прыартыкульных спісаў. Напрыклад, на падставе першасных выданняў бібліёграфы рыхтуюць тыя ці іншыя бібліяграфічныя крыніцы; літаратурныя крытыкі атрымліваюць глебу для даследаванняў і рыхтуюць нарысы; журналісты і рэдактары знаходзяць новыя звесткі для напісання артыкулаў, рэпартажаў, падставы для атрымання інтэрв'ю; літаратурныя агенты – адшукваюць цікавых аўтараў, якім можна прапанаваць свае паслугі; і нарэшце, усе пералічаныя карыстальнікі праз прыкніжныя і прыартыкульныя спісы, рэкамендацыйныя бібліяграфічныя паказальнікі маюць магчымасць без асаблівых намаганняў знаходзіць матэрыялы, што пашыраюць уяўленне пра тую ці іншую з'яву.

*Функцыя інфармацыйнага забеспячэння навукі.* ІРМЛ з'яўляюцца сродкам атрымання карыстальнікамі навуковай інфармацыі і каштоўных матэрыялаў, неабходных для навуковых даследаванняў. Такую інфармацыю ўтрымліваюць навуковыя акадэмічныя і неакадэмічныя выданні мастацкай літаратуры. Кожнае з іх абавязкова мае штосьці істотна новае для даследчыкаў і з'яўляецца крыніцай фактаграфічнай і бібліяграфічнай інфармацыі.

Сярод бібліяграфічных рэсурсаў такую функцыю выконваюць навукова-дапаможныя бібліяграфічныя паказальнікі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

агульнагаліновыя, тэматычныя, персанальныя, праблемна-тэматычныя, жанравыя. Яны садзейнічаюць даследаванню і падрыхтоўцы навуковых выданняў твораў мастацкай літаратуры.

Функцыю інфармацыйнага забеспячэння навукі таксама выконваюць бягучыя агульныя і спецыяльныя бібліяграфічныя дапаможнікі, у якіх прадстаўлена інфармацыя пра новыя выданні, напрыклад, «Кніжны летапіс», «Летапіс часопісных артыкулаў», «Летапіс газетных артыкулаў»; галіновыя рэтраспектыўныя бібліяграфічныя паказальнікі, якія арыентуюць даследчыкаў літаратуры ў дакументных масівах за пэўны ўліковы перыяд і адрозніваюцца паўнатой і дакладнасцю; перспектыўныя бібліяграфічныя паказальнікі, у якіх прадстаўлены звесткі пра дакументы, падрыхтаваныя да выдання, што дазваляе навукоўцам мадэляваць галіновы дакументны паток і загадзя арыентавацца ў ім.

Такім чынам, выкарыстанне ўсіх відаў бібліяграфічнай прадукцыі дазваляе максімальна поўна арыентавацца як у плыні новай літаратуры, так і ў масіве літаратуры за даволі працяглы адрэзак часу, што дапамагае ўсебакова і шматаспектна даследаваць праблему і ўбачыць прабелы ў яе вывучэнні.

Другая група функцый ІРМЛ – *функцыі першасных і другасных дакументаў мастацкай літаратуры.* Да іх адносяцца аксіялагічная, папулярызатарская, бібліятэрапеўтычная.

*Аксіялагічная функцыя.* Праз дакументы мастацкай літаратуры ажыццяўляецца ўплыў на фарміраванне духоўнай культуры грамадства і чалавека, выбар каштоўнасных і маральных арыенціраў. Аксіялагічная функцыя ўласціва вучэбна-дапаможным і рэкамендацыйна-бібліяграфічным дапаможнікам у галіне мастацкай літаратуры, якія ўздзейнічаюць на фарміраванне кожнай асобы і духоўнай культуры грамадства ў цэлым праз рэкамендацыйныя анатацыі, адбор і прамоцыю твораў.

*Папулярызатарская функцыя.* Дакументы мастацкай літаратуры спрыяюць пашырэнню інфармацыі пра творчасць пісьменнікаў, літаратурныя жанры. Дадатковыя звесткі, змешчаныя ў даведачным апараце выданняў, спрыяюць больш глыбокаму знаёмству чытачоў з дзейнасцю пісьменнікаў. Папулярызатарскую функцыю выконваюць таксама вучэбна-дапамож-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя і рэкамендацыйныя бібліяграфічныя паказальнікі (тэматычныя, персанальныя, жанравыя, агульналітаратурныя) праз адбор, групаванне, характарыстыку твораў. Гэта адна з важных і арганічных функцый рэкамендацыйнай літаратурнай бібліяграфіі.

*Бібліятэрапеўтычная функцыя.* Пэўныя дакументы мастацкай літаратуры могуць з'яўляцца сродкам тэрапеўтычнай дапамогі, паколькі іх чытанне ў цяжкія моманты жыцця здымае псіхалагічную напружанасць, дапамагае знайсці правільны выхад са складанага становішча, умацаваць волю, навучыць перамагаць калізіі лёсу.

Бібліятэрапеўтычная функцыя ўласціва таксама і рэкамендацыйным бібліяграфічным паказальнікам. Яны дазваляюць арыентавацца ў адпаведных магчымасцях мастацкай літаратуры, праз уступныя артыкулы, рэкамендацыйныя анатацыі інфармуюць карыстальнікаў пра творы, чытанне якіх можа аказаць псіхалагічную дапамогу, звяртаюць увагу чытачоў на станоўчае.

Трэцяя група ўтрымлівае *функцыі мастацкай літаратуры, характэрныя таксама і для ІРМЛ.* Да іх адносяцца эстэтычная, эмацыянальная, рэкрэацыйная, этнагенетычная, пазнавальная, духоўна-камунікатыўная, адукацыйная, развіццёвая, выхаваўчая.

*Эстэтычная функцыя* – адна з найбольш спецыфічных функцый ІРМЛ, што задавальняюць патрэбнасці ў прыгожым, спрыяюць атрыманню эстэтычнай асалоды, уздыму эстэтычных пачуццяў, развіццю густу і ідэалу, назапашваюць, захоўваюць і перадаюць абагульнены эстэтычны вопыт[63]. Рэкамендацыйныя бібліяграфічныя выданні выконваюць яе праз адбор, групаванне і рэкамендацыйную характарыстыку, якія садзейнічаюць цэласнаму ўспрыманню твораў, фарміраванню свядомасці і густу.

*Эмацыянальная функцыя.* ІРМЛ садзейнічаюць абуджэнню пачуццяў, з'яўленню жадання падзяліцца імі з навакольнымі[64]. «Эмоцыі – гэта ўнутраныя перажыванні, звязаныя з успрыманнем рэальнага свету, выяўленне ўнутранага суб'ектыўнага

---

[63] Зиновьева Н. Б. Информационная культура личности. – Краснодар, 1996. – С. 82.

[64] Соколов А. В. Информационное общество в виртуальной и социальной реальности. – СПб., 2012. – С. 32.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стану, інтарэсаў і сацыяльных установак чалавека»[65]. Яны ўплываюць і на мысленне: «Эмоцыі і мысленне – гэта ўнутраная дзейнасць, у якой першасная інфармацыя пра рэчаіснасць перапрацоўваецца, у выніку чаго асоба атрымлівае аргументы да дзеяння»[66]. У асяроддзі другасных рэсурсаў функцыя ўласціва рэкамендацыйным бібліяграфічным дапаможнікам, задача якіх – выклікаць эмацыянальны водгук чытача на твор і тым самым звярнуць увагу на яго, зацікавіць, пабудзіць да чытання, што немагчыма без эмацыянальна афарбаванай характарыстыкі тэкстаў.

*Этнагенетычная функцыя.* Веды, утрыманыя ІРМЛ, дазваляюць ім захоўваць і ўвекавечваць нацыянальныя традыцыі, звычаі, мову, духоўныя каштоўнасці. Дадзеная функцыя ўласціва навукова-дапаможнай бібліяграфічнай прадукцыі, асабліва рэтраспектыўнага характару, і рэкамендацыйнай, што арыентуе чытача ў крыніцах мастацка-вобразнай інфармацыі, у якіх увасоблена багацце нацыянальнай культуры, мовы, характару і побыту.

*Рэкрэацыйная функцыя.* ІРМЛ з’яўляюцца сродкам адпачынку, цікавага і прыемнага правядзення вольнага часу. Рэкрэацыйную функцыю выконваюць рэкамендацыйныя бібліяграфічныя паказальнікі, якія інфармуюць карыстальнікаў пра забаўляльны характар твораў мастацкай літаратуры. Найлепшыя з іх, падрыхтаваныя творчымі і таленавітымі бібліёграфамі, якія выказваюць асабістыя меркаванні, пачуцці і назіранні пра прачытаныя мастацкія творы, і самі з’яўляюцца сродкам адпачынку і прыемнага правядзення вольнага часу. У першую чаргу гэта датычыцца рэкамендацыйных паказальнікаў так званых гібрыдных, ці памежных, жанраў (папулярных энцыклапедый, аглядаў і інш.).

*Пазнавальная функцыя.* ІРМЛ выконваюць ролю своеасаблівага сродка пазнання чалавека, яго псіхікі і навакольнага свету. Мастацкая літаратура пры дапамозе мастацка-вобразных сродкаў выконвае функцыі чалавеказнаўства, паколькі адлюстроўвае глыбіню псіхікі, унутраныя матывы ўчынкаў, душэўныя

[65] Соколов А. В. Информационное общество в виртуальной и социальной реальности. – СПб., 2012. – С. 43.

[66] Там жа.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зрухі, якія адбываюцца пад уздзеяннем розных абставін. У мастацкай літаратуры можна даведацца пра навуковыя факты і гіпотэзы, гістарычныя падзеі і г. д. Навукова-дапаможная, рэкамендацыйная бібліяграфічная інфармацыя дапамагае пазнанню мастацкай літаратуры праз звесткі пра творы, жыццё і дзейнасць пісьменнікаў. Папулярныя бібліяграфічныя энцыклапедыі, напрыклад, самі з’яўляюцца крыніцай інфармацыі, знаёмяць чытачоў з сучасным пунктам гледжання на літаратурныя творы і выступаюць крыніцай пазнання[67].

*Духоўна-камунікатыўная функцыя.* ІРМЛ, у адрозненне ад іншых ІР, наладжваюць кантакт паміж пісьменнікам і яго чытачамі, паміж мінулым, сучаснасцю і будучыняй. Найлепшыя мастацкія творы ўздымаюць заўсёды актуальныя маральныя праблемы. Такім чынам ІРМЛ захоўваюць духоўную камунікацыю праз стагоддзі і пакаленні. Наладжванню кантактаў спрыяюць і выданні навукова-дапаможнай і, у большай ступені, рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі, бо іх задача – ажыццявіць пасрэдніцтва паміж творамі мастацкай літаратуры і чытачамі.

*Адукацыйная функцыя.* ІРМЛ фіксуюць назапашаны сацыяльны досвед, веды перадаюцца з пакалення ў пакаленне пры чытанні, абмеркаванні і вывучэнні мастацкіх твораў. Чалавек навучаецца інтэлектуальнай дзейнасці праз асэнсаванне і інтэрпрэтацыю прачытанага; камунікатыўнай – у працэсе абмеркавання твораў, набываючы навыкі адстойвання свайго пункта гледжання, авалодання літаратурнай мовай. Развіццё эстэтычнага ўспрымання тэксту і рэчаіснасці адбываецца праз сістэму мастацкіх вобразаў. Вучэбна-дапаможная і рэкамендацыйная бібліяграфічная інфармацыя дапамагае сістэматычнаму і планамернаму вывучэнню мастацкай літаратуры, спрыяе павышэнню культуры карыстальніка, садзейнічае вучэбнаму працэсу праз свае сродкі (адбор, групаванне, асобую методыку рэкамендацыі твораў, якая абапіраецца на даныя літаратуразнаўства і будуецца з улікам узроставых і псіхалагічных асаблівасцей розных катэгорый чытачоў, а таксама з улікам іх адукацыйнага ўзроўню). Такім чынам ствараецца

---

[67] Давыдова М. И. Рекомендательная литературная библиография как средство формирования художественной культуры общества. – М., 1993. – С. 45.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інфармацыйнае поле для авалодвання новымі мастацкімі вобразамі.

*Развіццёвая функцыя.* ІРМЛ развіваюць лагічнае і вобразнае мысленне, інтэлектуальныя і творчыя здольнасці, што адбываецца праз інтэнсіфікацыю работы розуму ў працэсе чытання, аналітычнага асэнсавання зместу літаратурных твораў, абуджэння фантазіі. Акрамя таго, працэс чытання твораў мастацкай літаратуры спрыяе развіццю здольнасцей да пераказу, да ўжывання ў сваёй пісьмовай і вуснай мове мастацкіх вобразаў; павышаецца граматнасць і ўдасканальваецца вусная і пісьмовая мова чытача. Развіццёвая функцыя выконваецца рэкамендацыйнымі бібліяграфічнымі дапаможнікамі, праз якія магчыма фарміраваць і развіваць чытацкі густ, стымуляваць духоўныя патрэбнасці чалавека.

*Выхаваўчая функцыя.* ІРМЛ уплываюць на фарміраванне сістэмы маральных прынцыпаў, агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, патрыятызму. Рэкамендацыйная бібліяграфічная інфармацыя садзейнічае выхаванню чалавека праз папулярызацыю найлепшых мастацкіх твораў, прасякнутых этычнымі ідэямі. Праз рэкамендацыйную бібліяграфічную інфармацыю выхоўваецца культура чытання і ўспрымання мастацкіх твораў[68].

Такім чынам, аналіз паказвае, што многія з функцый непасрэдна мастацкай літаратуры характэрны і для яе ІР. ІРМЛ ускосна выконваюць аналагічныя функцыі, пры гэтым самі з'яўляюцца сродкам на шляху іх ажыццяўлення мастацкай літаратурай.

Склад вышэйпрыведзеных функцый ІРМЛ абагульнены ў табл. 1.4.

[68] Давыдова М. И. Рекомендательная литературная библиография как средство формирования художественной культуры общества. – М. : МГИК, 1993. – 56 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 1.4*

**Функцыі інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры**

| Функцыі інфармацыйнага забеспячэння | Функцыі дакументаў мастацкай літаратуры | Функцыі мастацкай літаратуры, характэрныя таксама і для яе інфармацыйных рэсурсаў |
|---|---|---|
| 1) сферы вольнага часу і самаадукацыі;<br>2) адукацыі;<br>3) прафесійнай сферы;<br>4) навукі | 1) аксіялагічная;<br>2) папулярызатарская;<br>3) бібліятэрапеўтычная | 1) эстэтычная;<br>2) эмацыянальная;<br>3) этнагенетычная;<br>4) рэкрэацыйная;<br>5) пазнавальная;<br>6) духоўна-камунікатыўная;<br>7) адукацыйная;<br>8) развіццёвая;<br>9) выхаваўчая |

## 1.4.2. Функцыі інфармацыйных рэсурсаў літаратуразнаўства

Функцыі інфармацыйнага забеспячэння інфармацыйных рэсурсаў літаратуразнаўства (ІРЛ), як і аналагічныя функцыі ІРМЛ, мэтазгодна вылучыць у адпаведнасці са сферамі дзейнасці, якія складаюць галіну, і разглядаць асобна для першасных і другасных ІРЛ.

*Функцыя інфармацыйнага забеспячэння навукі* – адна з асноўных функцый, бо ІРЛ прызначаны для фіксацый, распаўсюджання і папулярызацыі інфармацыі. З іх дапамогай здзяйсняецца забеспячэнне навукоўцаў неабходнымі звесткамі пра стан літаратуразнаўства, яго дасягненні і праблемы. Акрамя таго, з дапамогай ІР навукоўцы маюць магчымасць выявіць пытанні, якія яшчэ не распрацаваны, абраць тэму даследавання, вызначыць яго аб’ект і прадмет.

Функцыю інфармацыйнага забеспячэння навукі выконваюць спецыялізаваныя выданні і публікацыі літаратуразнаўства, як на традыцыйных, так і на электронных носьбітах. Яны падзяляюцца на навукова-даследчыя і крыніцазнаўчыя. Першыя з іх



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

адлюстроўваюць вынікі навуковых даследаванняў, а другія – прадстаўляюць матэрыялы для навуковай распрацоўкі і суправаджаюцца навуковым каментарыем (знойдзеныя тэксты мастацкіх твораў, розныя архіўныя матэрыялы, успаміны, дзённікі, лісты).

У галіне літаратуразнаўства функцыю інфармацыйнага забеспячэння навукі выконваюць і другасныя рэсурсы: агульнагаліновыя навукова-дапаможныя бібліяграфічныя паказальнікі; агульныя бібліяграфічныя дапаможнікі, якія з максімальнай паўнатой фіксуюць патокі літаратуразнаўчых выданняў. Яны дапамагаюць спецыялістам арыентавацца ў патоку і масіве выданняў, вылучаць дакументы па пэўнай тэме ці праблеме. Бібліяграфічны пошук з'яўляецца неад'емнай часткай працы літаратуразнаўца, а ўменне арыентавацца ў бібліяграфічных рэсурсах і выкарыстоўваць іх вядзе да павышэння эфектыўнасці і якасці даследаванняў.

*Функцыя інфармацыйнага забеспячэння адукацыі.* ІРЛ забяспечваюць неабходнымі ведамі работнікаў адукацыйнай сферы: настаўнікаў, выкладчыкаў. Яны становяцца сродкам навучання студэнтаў, вучняў агульнаадукацыйных школ, гімназій, ліцэяў, сярэдніх спецыяльных устаноў, у праграмы якіх уваходзіць вывучэнне мастацкай літаратуры. ІРЛ даюць магчымасць гэтым катэгорыям карыстальнікаў знаходзіць для сябе матэрыялы, неабходныя для падрыхтоўкі і правядзення лекцый, семінараў, урокаў. Сюды ўваходзяць друкаваныя і электронныя навуковыя, навукова-папулярныя, даведачныя дакументы, вучэбныя (спецыяльныя навукова-метадычныя, вучэбныя і вучэбна-метадычныя дапаможнікі, напрыклад, матэрыялы і парады па правядзенню лекцый, урокаў, семінараў, матэрыялы спецкурсаў, рабочых сшыткаў, тэкстаў лекцый і інш.).

Функцыю інфармацыйнага забеспячэння адукацыйнай сферы выконваюць другасныя рэсурсы: рэкамендацыйныя дапаможнікі розных тыпаў і відаў; вучэбна-дапаможныя выданні, прысвечаныя тым ці іншым творам ці пісьменнікам, літаратуразнаўчым праблемамі, яны змяшчаюць дадатковы матэрыял, што дазваляе выкарыстоўваць бібліяграфічную інфармацыю настаўнікам, выкладчыкам, а таксама іх падапечным для больш грунтоўнага і глыбокага засваення тэмы і падрыхтоўкі да заняткаў. Сюды адносяцца і семінарыі, бібліяграфічныя спісы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

змешчаныя ў вучэбна-метадычных і навукова-метадычных дапаможніках.

*Функцыя інфармацыйнага забеспячэння прафесійнай сферы.* ІРЛ дапамагаюць карыстальнікам, прафесійная дзейнасць якіх звязана з літаратурай (празаікам, паэтам, драматургам і інш.). Галоўным чынам гэта тычыцца літаратурнай крытыкі, матэрыялы якой дазваляюць літаратарам бачыць моцныя і слабыя бакі сваёй творчасці, удасканальваць пісьменніцкае майстэрства.

Другасныя ІР выконваюць функцыю інфармацыйнага забеспячэння прафесійнай сферы праз навукова-дапаможныя бібліяграфічныя выданні, якія адлюстроўваюць дакументы па літаратуразнаўству і літаратурнай крытыцы; дзяржаўныя паказальнікі («Летапіс рэцэнзій», «Летапіс часопісных артыкулаў», «Летапіс газетных артыкулаў» і інш.), дзе можна знайсці неабходную інфармацыю пра асобныя кнігі па літаратуразнаўству, рэцэнзіі ці крытычныя артыкулы, навуковыя публікацыі.

*Функцыя інфармацыйнага забеспячэння сферы папулярызацыі ведаў пра мастацкую літаратуру і самаадукацыю.* ІРЛ задавальняюць патрэбнасці чытачоў да самаадукацыі і папулярызуюць вынікі вывучэння мастацкай літаратуры. Яе выконваюць друкаваныя і электронныя: навукова-папулярныя літаратуразнаўчыя дакументы; вучэбныя літаратуразнаўчыя дакументы.

Другасныя рэсурсы выконваюць азначаную функцыю праз вучэбна-дапаможную і рэкамендацыйную бібліяграфічную інфармацыю, у прыватнасці, яе гібрыдныя – адначасова бібліяграфічныя і літаратуразнаўчыя – жанры, што маюць характэрныя рысы: канцэптуальнасць, спалучэнне лёгкай і займальнай формаў падачы матэрыялу з сур’ёзным і глыбокім яго зместам, які дае працу розуму, падштурхоўвае да пазнання літаратурных твораў на больш высокім узроўні.

Наступная група функцый ІРЛ – *функцыі дакументаў літаратуразнаўства,* да якіх адносяцца падагульняючая і мадэлюючая.

*Падагульняючая функцыя.* ІРЛ акумулююць інфармацыю пра развіццё літаратурнага працэсу ў пэўны перыяд пра вынікі літаратуразнаўчых даследаванняў. Дадзеная функцыя характэрна для такіх відаў навуковых дакументаў, як манаграфіі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

справаздачы пра навукова-даследчыя работы, іншыя матэрыялы. Гэтая функцыя характэрна для рэтраспектыўных бібліяграфічных паказальнікаў падагульняючага характару, з дапамогай якіх можна выявіць усе публікацыі за вялікі гістарычны перыяд, а таксама па пэўнай тэме ці жанру. Яны прадстаўляюць дакладную навуковую карціну стану ІР у канкрэтны перыяд.

*Мадэлюючая функцыя.* ІРЛ (усе віды навуковых выданняў) з'яўляюцца мадэлямі праходжання літаратурнага працэсу ў пэўны адрэзак часу. Мадэляванне дазваляе дыферэнцыраваць і інтэграваць выданні і публікацыі па параметрах, якія адпавядаюць інтарэсам чытачоў і кірункам літаратурнай навукі, прагназаваць будучае дакументнага патоку літаратуразнаўства і звязаных з ім галін ведаў. Азначаная функцыя ўласціва навукова-дапаможным бібліяграфічным выданням, на базе якіх можна мадэляваць пошукавую працу навукоўцаў, выяўляць нераспрацаваныя тэмы і праблемы.

Трэцюю групу функцый ІРЛ складаюць функцыі літаратуразнаўства, характэрныя адначасова і для яго інфармацыйных рэсурсаў: гісторыка-літаратурная, крыніцазнаўчая, тэксталагічная, літаратурна-крытычная, эстэтычная, адукацыйная, выхаваўчая.

*Гісторыка-літаратурная функцыя.* ІРЛ фіксуюць веды пра паходжанне і развіццё літаратуры ў розныя гістарычныя эпохі, пра падставы ўзнікнення тых ці іншых літаратурных з'яў. Гэта дае магчымасць разглядаць літаратурныя з'явы ў сувязі з канкрэтнымі сацыякультурнымі і гістарычнымі ўмовамі, вывучаць твор кантэкстуальна. Другасныя ІР выконваюць дадзеную функцыю праз: крыніцы навукова-дапаможнай бібліяграфіі, якія ўтрымліваюць звесткі пра пісьменнікаў і іх творы; унутрыкніжныя бібліяграфічныя матэрыялы ў гісторыка-літаратурных і літаратуразнаўчых даследаваннях, у выданнях твораў аўтараў і манаграфіях пра іх. Гісторыка-літаратурная функцыя праяўляецца ў бібліяграфічнай інфармацыі не толькі ў тым, што з яе дапамогай здзяйсняецца азнаямленне з гісторыяй літаратуры, але і адбываецца пераасэнсаванне літаратуры мінулага.

*Крыніцазнаўчая функцыя.* ІРЛ з'яўляюцца сродкам вывучэння і даследавання раней не апублікаваных літаратурных дакументаў (асобных тэкстаў, матэрыялаў, звязаных з жыццём

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і дзейнасцю пісьменнікаў, мемуараў, успамінаў, дзённікаў), што дазваляе поўна і ўсебакова вывучаць творчасць аўтараў. Многія такія дакументы знаходзяцца ў дзяржаўных і прыватных архівах, музеях, бібліятэках, некаторыя існуюць толькі ў рукапісным варыянце. На іх падставе фарміруюцца ІР, якія дазваляюць знаёміцца з рэдкімі матэрыяламі, служаць для напісання навуковых прац, біяграфічных і мастацкіх твораў.

Крыніцазнаўчую функцыю выконваюць і другасныя рэсурсы літаратуразнаўства. Некаторыя навукова-дапаможныя бібліяграфічныя выданні, зводныя каталогі пры крыніцазнаўчых даследаваннях дапамагаюць знаходзіць звесткі пра тое, дзе і калі апублікаваны вывучаемыя дакументы, у якіх сховішчах яны знаходзяцца, калі яшчэ не надрукаваны.

*Тэксталагічная функцыя.* ІРЛ утрымліваюць звесткі пра гісторыю напісання літаратурных твораў, пра аўтэнтычныя тэксты без памылак і скажэнняў, пра аўтараў ананімных ці псеўданімных тэкстаў, дакладныя даты напісання і публікавання. Дадзеная функцыя ўзнікае дзякуючы такой дапаможнай дысцыпліне, як тэксталогія. Яе практычная мэта – выданне тэкстаў, максімальна набліжаных да арыгінала, іх датаванне, стварэнне каментарыяў і даведачнага апарату. Каментарыі суправаджаюць няясныя месцы ці састарэлыя паняцці, не знаёмыя чытачу імёны і назвы, пры неабходнасці ў іх абгрунтоўваюцца аўтарства і дацыроўка. На падставе ІРЛ становіцца магчымым знаёмства з аўтэнтычным тэкстам, вывучэнне творчай лабараторыі пісьменніка, станаўленне яго майстэрства і светапогляду.

У адпаведнасці з тэксталагічнай функцыяй, другасныя ІРЛ дэманструюць усе публікацыі аднаго ці ўсіх твораў пісьменніка. Найбольш яна праяўляецца ў спецыяльных бібліяграфічных паказальніках, дзе поўна адлюстроўваюцца ўсе разнавіднасці тэкстаў не залежна ад формы іх публікацыі.

*Літаратурна-крытычная функцыя.* ІРЛ назапашваюць веды пра сучасны стан літаратуры, пра эстэтычныя і маральныя якасці мастацкіх твораў. Літаратурна-крытычная ацэнка мастацкіх твораў дапамагае паўней выявіць задуму аўтара, дазваляе пісьменнікам пазбаўляцца недахопаў у сваёй творчасці, садзейнічае росту іх майстэрства. Акрамя таго, знаёмства з прафесійнай ацэнкай спрыяе выпрацоўцы ў чытачоў аб’ектыў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных поглядаў на літаратурныя з'явы, удасканальвае іх эстэтычны густ. У першую чаргу гэтая функцыя ўласціва дакументам літаратурнай крытыкі.

Літаратурна-крытычная функцыя пэўным чынам датычыцца і рэкамендацыйнай бібліяграфічнай інфармацыі і праяўляецца ў адборы ў адпаведныя паказальнікі найлепшых твораў, іх грунтоўнай ацэнцы і характарыстыцы. Калі мэта літаратурнай крытыкі – уздзеянне на пісьменнікаў, на працэс напісання твораў, то рэкамендацыйная бібліяграфія дапамагае карыстальнікам у выбары кніг. Літаратурна-крытычная функцыя для другасных рэсурсаў трансфармуецца адпаведна гэтаму. Азначаная функцыя праяўляецца ў тым, што рэкамендацыйныя паказальнікі з'яўляюцца сродкам ацэнкі літаратурных твораў з пункта гледжання іх выкарыстання. Літаратурна-крытычная функцыя ў такім сэнсе ўласціва наступным жанрам: гутаркі пра творы сучаснай літаратуры, аб'яднаныя па прымеце тэмы або жанру; рэкамендацыйныя бібліяграфічныя паказальнікі навінак і інш.

*Эстэтычная функцыя*. ІРЛ замацоўваюць веды пра эстэтычную вартасць літаратурных твораў, што вызначаецца адпаведным ідэалам, увасобленым у іх, і ступенню іх мастацкай дасканаласці. Эстэтычная функцыя характэрна для рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў, дзе адбор, групаванне і характарыстыка твораў, зробленая з улікам ацэнкі іх літаратуразнаўцамі, садзейнічаюць выхаванню адпаведнага густу, звяртаюць увагу на якасць твораў, вучаць бачыць іх духоўна-маральную накіраванасць, фарміраваць сваё стаўленне да прачытанага.

*Адукацыйная функцыя.* ІРЛ фіксуюць назапашаныя веды пра законы літаратурнай творчасці, мінулае літаратуры, яе сучасны стан і тым самым садзейнічаюць фарміраванню навыкаў аналізу і ацэнкі літаратурных твораў і з'яў, павышаюць адукацыйны ўзровень карыстальнікаў, удзельнічаюць у працэсе ўдасканалення асобы. Гэтую функцыю выконваюць вучэбныя дакументы.

Адукацыйная функцыя праяўляецца праз фарміраванне з дапамогай бібліяграфічных рэсурсаў інфармацыйнай культуры як прафесіяналаў-літаратуразнаўцаў, так і шырокага кола карыстальнікаў. Літаратурная бібліяграфія лічыцца дапамож-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най літаратуразнаўчай дысцыплінай. Без ведання асноў бібліяграфічнага пошуку немагчымая праца літаратуразнаўца, творчая дзейнасць. Існуюць працы па тэорыі і методыцы бібліяграфічнага пошуку, карыстання бібліяграфічнымі і літаратурнымі крыніцамі. Напрыклад, у расійскім літаратуразнаўстве дадзенай праблематыцы прысвечаны працы П. Н. Беркава «Введение в технику литературоведческого исследования»[69] і «Библиографическая эвристика: К теории и методике библиографических разысканий»[70], М. Ф. Бельчыкава «Пути и навыки литературоведческого труда»[71] і «Литературное источниковедение»[72]. Даследчык-літаратуразнавец павінен ведаць і карыстацца рознымі бібліяграфічнымі крыніцамі, гэта павышае яго прафесійны ўзровень і дае магчымасць працаваць найбольш плённа.

*Выхаваўчая функцыя.* ІРЛ садзейнічаюць фарміраванню зацікаўленых, актыўных адносін чытача да літаратуры, патрэбнасці ў чытанні, навыкаў і ўменняў разбірацца ў змесце і сэнсе прачытаных твораў, разважаць над імі. Знаёмства з ІРЛ дапамагае выхоўваць «у мастацкіх адносінах пісьменнага, разборлівага, падрыхтаванага да пастаяннага і бясконцага самавыхавання і самаадукацыі з дапамогай літаратуры» чытача[73].

Выхаваўчая функцыя ўласціва рэкамендацыйным бібліяграфічным дапаможнікам, асабліва тым з іх, якія адносяцца да гібрыдных жанраў. У іх даецца не толькі характарыстыка пэўных твораў, але разглядаюцца і розныя літаратурныя з’явы, сутнасць літаратурнага працэсу і ўмовы яго праходжання. Рэкамендацыйная бібліяграфічная інфармацыя садзейнічае выпрацоўцы навыкаў аналізу зместу твора ў гістарычным аспекце, разгляду яго як часткі літаратуры пэўнага перыяду ці жанру, вывучэнню літаратуразнаўчых прац. Усё гэта дапамагае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[69] Берков П. Н. Введение в технику литературоведческого исследования. Источниковедение. Библиография. Разыскание. – Л. : Учпедгиз, 1955. – 154 с.

[70] Берков П. Н. Библиографическая эвристика: К теории и методике библиографических разысканий. – М. : Изд-во Всесоз. кн. палаты, 1960. – 173 с.

[71] Бельчиков Н. Ф. Пути и навыки литературоведческого труда : учеб. пособие. – 2-е изд., доп. – М. : Высш. шк., 1975. – 238 с.

[72] Бельчиков Н. Ф. Литературное источниковедение. – М. : Наука, 1983. – 272 с.

[73] Бавин С. П. Новые подходы к развитию библиографии художественной литературы и искусства // Новые подходы к развитию системы рекомендательно-библиографических пособий / Гос. б-ка СССР им. В. И. Ленина, отд. исслед. чтения, пропаганды кн. и рек. библиогр. ; сост. С. П. Бавин [и др.]. – М., 1991. – С. 51–56.

выхаванню культуры чытання і авалодванню на навуковай аснове ведамі аб літаратурных з’явах прымяняльна да патрэбнасцей чытачоў розных па ўзроўні адукацыі і характары інтарэсаў.

Склад вышэйпрыведзеных функцый ІРЛ абагульнены ў табл. 1.5.

*Табліца 1.5*

**Функцыі інфармацыйных рэсурсаў літаратуразнаўства**

| Функцыі інфармацыйнага забеспячэння | Функцыі дакументаў літаратуразнаўства | Функцыі літаратуразнаўства, характэрныя таксама і для яго інфармацыйных рэсурсаў |
|---|---|---|
| 1) навукі;<br>2) адукацыі;<br>3) прафесійнай сферы;<br>4) сферы самаадукацыі і папулярызацыі ведаў пра мастацкую літаратуру | 1) падагульняючая;<br>2) мадэлюючая | 1) гісторыка-літаратурная;<br>2) крыніцазнаўчая;<br>3) тэксталагічная;<br>4) літаратурна-крытычная;<br>5) эстэтычная;<br>6) адукацыйная;<br>7) выхаваўчая |

Такім чынам, функцыі ІРМЛЛ падзяляюцца на агульныя метасістэмныя і спецыяльныя, у якіх праяўляецца адметнасць і своеасаблівасць дадзеных інфармацыйных рэсурсаў.

Правамерна вылучыць тры групы спецыяльных функцый ІРМЛЛ: 1) функцыі інфармацыйнага забеспячэння розных сфер дзейнасці (сферы вольнага часу і самаадукацыі, навуковай, адукацыйнай, прафесійнай сфер); 2) функцыі, уласцівыя дакументам мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства; 3) функцыі, характэрныя адначасова для літаратуразнаўства, мастацкай літаратуры і для іх інфармацыйных рэсурсаў. Пры такім падыходзе выключаецца прамы перанос функцый літаратуразнаўства і мастацкай літаратуры на іх рэсурсы і з’яўляецца магчымасць убачыць розніцу паміж місіяй саміх мастацкіх твораў, літаратуразнаўчых прац і місіяй тых інфармацыйных рэсурсаў, якія яны ўтвараюць. Становіцца відавочным, што, напрыклад, эстэтычная, выхаваўчая, развіццёвая і іншыя функцыі ўласцівы ІР апасродкавана, толькі як

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

транслятарам мастацка-вобразных ведаў мастацкай літаратуры і навуковых ведаў літаратуразнаўства.

### Пытанні для самакантролю

1. Які функцыі вызначаюцца для любых галіновых рэсурсаў?
2. Назавіце тры групы спецыяльных функцый ІРМЛЛ.
3. Пералічыце функцыі, уласцівыя кожнай з трох груп ІРМЛ.
4. Якія функцыі адносяцца да першай, другой і трэцяй груп ІРЛ?

### Заданне для самастойнай работы па тэме 1.4.

*Мэта* – навучыцца асэнсоўваць падыходы спецыялістаў да выяўлення функцый дакументаў, ІР, мастацкай літаратуры, літаратуразнаўства і прымяняць іх пры вызначэнні функцый ІРМЛЛ.

*Пры дапамозе прапанаваных крыніц прааналізуйце:*

1. Функцыі мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства. Якія з іх можна вызначыць і як функцыі ІРМЛЛ?
2. Функцыі дакументаў і дакументных рэсурсаў. Якія з іх можна аднесці і да функцый ІРМЛЛ?
3. Падыход Н. А. Сляднёвай да вызначэння функцый літаратурнай бібліяграфіі. Ці варта прымяніць яго пры распрацоўцы функцый ІРМЛЛ?

*Літаратура*

1. *Кушнаренко, Н. Н.* Документоведение : учеб. / Н. Н. Кушнаренко. – 7-е изд., стер. – Киев, 2006. – С. 38–42. – (Высшее образование XXI века).

2. *Песоцкий, В. А.* Основные функции художественной литературы в их философском представлении // Вестн. Моск. гос. обл. ун-та. – 2011. – № 1. – С. 184–210.

3. *Сляднева, Н. А.* Библиография в системе Универсума человеческой деятельности: опыт системно-деятельностного анализа : моногр. / Н. А. Сляднева. – М., 1993. – С. 187–195.

4. *Сляднева, Н. А.* Взаимосвязь литературоведения и литературной библиографии / Н. А. Сляднева // Современные проблемы библиотековедения и библиографоведения : сб. тр. – М., 1976. – С. 77–95.

5. *Столяров, Ю. Н.* Документный ресурс / Ю. Н. Столяров. – М., 2001. – С. 30.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМА 1.5. КЛАСІФІКАЦЫЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

### 1.5.1. Неабходныя і дапаўняльныя прыметы класіфікацыі ІРМЛЛ

Важнай праблемай тэорыі ІР, у тым ліку і ІРМЛЛ, з'яўляецца класіфікацыя, што трактуецца ў філасофіі як працэс размяркавання таго ці іншага мноства даследуемых аб'ектаў на розныя класы, якія выдзяляюцца на падставе ўласцівых ім прымет. Класіфікацыя дазваляе ўсталёўваць сувязі паміж кампанентамі ІР, арыентавацца ў іх разнастайнасці, выяўляць адрозненні паміж відамі ІР, вылучанымі па розных прыметах.

Існуе даволі значная колькасць шматаспектных класіфікацый першасных і другасных ІР, кожная з якіх мае сваю аснову: носьбіт інфармацыі, змест, прызначэнне, спосаб доступу, форму ўласнасці, форму прадстаўлення і г. д. А. Б. Антапольскі ў працы «Інфармацыйныя рэсурсы Расіі»[74] падагульняе існуючыя падыходы да класіфікацыі ІР. Аўтар справядліва лічыць, што практычна немагчыма скласці агульную ўніверсальную мадэль класіфікацыі, якая б аднолькава падыходзіла для ўсіх відаў інфармацыйных рэсурсаў. Больш правільным з'яўляецца падыход, згодна з якім вылучаюцца некалькі агульных універсальных прымет, прымальных для ўсіх ІР увогуле, а потым распрацоўваюцца мадэлі класіфікацыі для розных відаў ІР, а таксама для рознай глыбіні, паўнаты і дакладнасці іх апісання[75].

Пры класіфікацыі ІРМЛЛ такімі прыметамі з'яўляюцца фармальныя, функцыянальныя, змястоўныя.

Да *фармальных* адносяцца: *від носьбіта ІР* – рэчавы (традыцыйны), энергетычны ці электронны (сеткавы і лакальны); *форма прадстаўлення інфармацыі* – тэкставая, гукавая, лічбавая, мультымедыйная і інш. Для ІРМЛ: *краіна* (ІР нацыянальнай мастацкай літаратуры; ІР, якія ўтрымліваюць творы нацыянальнай мастацкай літаратуры народаў свету; ІР, у складзе якіх аб'яднаны творы, што належаць да некалькіх нацыянальных літаратур); *мова* (ІР на нацыянальнай мове; ІР,

---

[74] Антопольский А. Б. Информационные ресурсы России. – М. : Либерия, 2004. – 424 с.

[75] Там жа. С. 23–25.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у якіх прадстаўлены творы нацыянальных аўтараў на іншых мовах; ІР, што ўтрымліваюць пераклады сусветнай літаратуры на нацыянальную мову; ІР з рэпрэзентацыяй перакладаў нацыянальных аўтараў на іншыя мовы); *храналагічны перыяд* (вызначаецца ў адпаведнасці з агульнапрынятай у літаратуразнаўстве перыядызацыяй беларускай літаратуры).

Да функцыянальных адносіцца грамадскае прызначэнне ІР – прымета, з дапамогай якой можна дыферэнцыраваць ІР у залежнасці ад мэт іх выкарыстання і чытацкага прызначэння. Да змястоўных – змест ІР, прымету, што дае магчымасць падзяляць ІР у адпаведнасці з тэматыкай, жанрам, галіной, краінай ці рэгіёнам, асобай пісьменніка.

Разам з фармальнымі прыметамі, уласцівымі як ІРМЛ, так і ІРЛ, неабходна таксама вызначаць і спецыфічныя фармальныя прыметы толькі ІРМЛ. Гэта прыметы *мовы,* на якой напісаны твор, яго *прыналежнасць да нацыянальнай літаратуры* пэўнай краіны і *храналагічны перыяд*, да якога ён належыць. Важнасць іх тлумачыцца тым, што мастацкая літаратура ніколі не існавала па-за прасторай і часам. Усе яе кампаненты маюць канкрэтна-гістарычны і нацыянальны характар. Гэта праяўляецца ў асаблівасцях іх зместу і формы: ідэйнай, тэматычнай накіраванасці, лексічнай своеасаблівасці, жанравай і відавой адметнасці. Асабліва відавочным гэта становіцца пры параўнанні, напрыклад, твораў старажытнай беларускай літаратуры і літаратуры XIX ст., літаратуры XIX ст. і сучаснай літаратуры, для якіх характэрны розныя сюжэты, героі, розныя адносіны да аднолькавых праблем і розныя шляхі іх вырашэння. Класіфікацыя ІРМЛ па нацыянальнай і храналагічнай прыметах шырока выкарыстоўваецца ў каталогах і картатэках бібліятэк, у навукова-дапаможных рэтраспектыўных дапаможніках і рэкамендацыйных паказальніках[76].

Адрозніваецца лексічны склад твораў, напісаных у розныя гістарычныя часы, але нягледзячы на гэта, ёсць і аднолькавыя рысы ў літаратуры, аднесенай да розных храналагічных перыядаў. Іх можна назіраць у творах, якія належаць да адной і той жа нацыянальнай літаратуры. Усе яны паказваюць асаблівасці пэўнай нацыі, яе гістарычныя, культурныя традыцыі, прычым пераважна на нацыянальнай мове. Беларускія пісь-

[76] Библиография художественной литературы и литературоведения / под. ред. С. А. Трубникова. – М., 1985. – С. 21.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

меннікі Я. Купала, Я. Колас, Ф. Багушэвіч, В. Дунін-Марцінкевіч, П. Панчанка, П. Броўка, М. Багдановіч, І. Шамякін, У. Караткевіч хоць і належалі да розных гістарычных эпох, але адлюстроўвалі ў сваіх творах сістэму беларускіх культурных і духоўных каштоўнасцей. Нацыянальная мова, на якой напісана большасць мастацкіх твораў, дапамагае больш глыбокаму разуменню нацыянальнага менталітэту, яго своеасаблівасці. Перакладная літаратура, хоць і дае даволі поўнае ўяўленне пра той ці іншы тэкст, яго мастацкую і духоўную каштоўнасць, але з'яўляецца толькі копіяй твора, якасць якой залежыць ад майстэрства перакладчыка. Пры класіфікацыі ІРМЛ неабходна ўлічваць моўную прымету і адрозніваць арыгінальныя і перакладныя творы. Акрамя таго, неабходна мець на ўвазе пераклады мастацкіх твораў, зробленыя аўтарамі з іншых моў на нацыянальную.

Пералічаныя прыметы трэба прызнаць неабходнымі для класіфікацыі ІРМЛЛ, бо яны дазваляюць вызначыць мэтанакіраванасць, унутраны змест, форму прадстаўлення ведаў, ацаніць мэтазгоднасць іх выкарыстання, рэлевантнасць патрабаванням карыстальнікаў і тэхнічныя магчымасці доступу да іх. Такія прыметы, як назва рэсурсаў, аб'ём, форма ўласнасці, прыналежнасць да сістэмы больш падыходзяць да іх апісання і могуць ужывацца ў пэўных сітуацыях, але неабходнымі пры класіфікацыі не з'яўляюцца.

## 1.5.2. Уплыў спецыфікі мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства на класіфікацыю ІРМЛЛ

Акрамя вызначэння неабходных прымет пры пабудове шматаспектнай класіфікацыі ІРМЛЛ неабходна ўлічваць спецыфіку літаратуры як віду мастацтва, а таксама асаблівасці таго віду дзейнасці, у якім узнікаюць і існуюць ІРМЛЛ. Справа ў тым, што мастацкая літаратура мае дваістую сутнасць. З аднаго боку, яна з'яўляецца відам мастацтва, а з іншага – вынікам дзейнасці, звязанай са стварэннем і функцыянаваннем у грамадстве эстэтычнай інфармацыі, а таму ўключае два кампаненты – *мастацкі і інфармацыйна-дзейнасны*, кожны з якіх генеруе шматлікія ІР[77].

[77] Суминова Т. Н. Морфология информационных ресурсов сферы искусства: к постановке проблемы // Мир библиографии. – 1998. – № 4. – С. 5.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Мастацкі кампанент* прадстаўлены сістэмай асноўных прадуктаў пэўнага віду мастацтва – творамі мастацкай літаратуры. У дадзеным аспекце іх можна класіфікаваць, узяўшы за аснову марфалогію мастацтва па класах, сямействах, відах, родах і жанрах: клас – часовыя; сямейства – слоўныя; від – вусная літаратура, пісьмовая літаратура; род – эпас, лірыка, драма; жанр – эпас: раман-эпапея, раман, аповесць, апавяданне; лірыка: паэма, элегія, ода, санет і інш.; драма: драма, трагедыя, камедыя, меладрама і інш.[78]

Класіфікацыя мастацкай літаратуры па родах і жанрах выкарыстоўваецца ў працэсе вывучэння і задавальнення попыту на літаратурна-мастацкія выданні, пры фарміраванні ІР бібліятэк, электронных бібліятэк, бібліяграфічнай дзейнасці. Яна з'яўляецца прынцыповай пры структураванні і прадстаўленні ІР і ўжываецца пры падрыхтоўцы і выданні літаратурна-мастацкіх серый (напрыклад, «Беларуская проза XX стагоддзя», «Беларускі раман», «Бібліятэчка беларускай прозы» і г. д.), пры стварэнні анталогій і іншых зборнікаў, у бібліятэчна-бібліяграфічных класіфікацыях, пры распрацоўцы электронных бібліятэк мастацкай літаратуры і інш.[79]

*Інфармацыйна-дзейнасны кампанент* прадстаўлены як вынік працы крэатараў (напрыклад аўтараў, выкладчыкаў, крытыкаў) па стварэнні і функцыянаванні ў грамадстве эстэтычнай інфармацыі. У гэтым кантэксце класіфікацыя ІРМЛЛ ажыццяўляецца на падставе агульнай відавой структуры інфармацыйнай дзейнасці, якую складаюць: 1) інфармацыйна-творчая (мастацка-крэатыўная, навукова-даследчая, крытыка-публіцыстычная); 2) інфармацыйна-рэпрадуктыўная (навукова-асветніцкая і папулярызатарская); 3) інфармацыйна-карыстальніцкая[80]. Згодна з гэтым, да твора мастацкай літаратуры мае дачыненне не толькі пісьменнік, але і навукоўцы, якія даследуюць твор, і крытыкі, якія даюць яму ацэнку (інфармацыйна-творчая дзейнасць); выкладчыкі, рэдактары, бібліёграфы, якія

[78] Караиченцева С. А. Книговедение: литературно-художественная и детская книга. Издания по филологии и искусству. – М., 2004. – С. 6–8.

[79] Справочник библиографа / науч. ред.: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб., 2014. – С. 254.

[80] Зубов Ю. С. Библиография и художественное развитие личности : моногр. – М., 1979. – С. 16.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

займаюцца папулярызацыяй твора, знаёмяць з ім карыстальнікаў (інфармацыйна-рэпрадуктыўная дзейнасць); чытачы, для якіх спажыванне інфармацыі звязана з яе ўспрыманнем (інфармацыйна-карыстальніцкая дзейнасць).

Такім чынам, відавочна, што інфармацыйна-дзейнасны кампанент мастацкай літаратуры прадстаўлены рэсурсамі інфармацыйна-творчай дзейнасці – масівамі і патокамі дакументаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства; рэсурсамі інфармацыйна-рэпрадуктыўнай дзейнасці – масівамі і патокамі даведачных, вучэбных дакументаў, бібліяграфічнай і агляднай інфармацыі; рэсурсамі інфармацыйна-карыстальніцкай дзейнасці – водгукамі, каментарыямі, рэкамендацыямі, фанрайтарствам і інш. Усе азначаныя рэсурсы мэтазгодна класіфікаваць па такой прымеце, як *спосаб стварэння і выкарыстання ведаў у межах эстэтычнай і навуковай камунікацыі*. У адпаведнасці з дадзенай прыметай ІРМЛ і ІРЛ падзяляюцца на монакамунікацыйныя і полікамунікацыйныя.

### 1.5.3. Монакамунікацыйныя і полікамунікацыйныя ІРМЛЛ

*Монакамунікацыйныя ІР* створаны пэўнымі нешматлікімі суб’ектамі – аўтарамі і пасіўна выкарыстоўваюцца шырокай чытацкай аўдыторыяй. Перадача ведаў ажыццяўляецца па схеме «ад нямногіх – да многіх». Узаемадзеянне аўтара і чытачоў на падставе тэкстаў, якія складаюць ІР, расцягнена ў прасторы і часе і дастаткова пасіўнае. Асноўны масіў такіх рэсурсаў утвараюць тыя з іх, што ўзніклі як вынік інфармацыйна-творчай і інфармацыйна-рэпрадуктыўнай дзейнасці. Разам з тым рэсурсы, утвораныя падчас інфармацыйна-карыстальніцкай дзейнасці, таксама з’яўляюцца вынікам монакамунікацыі, паколькі прадстаўляюць асабісты пункт гледжання канкрэтнага чытача і не разлічаны на аператыўнае абмеркаванне ў інфармацыйнай прасторы. Менавіта монакамунікацыйныя рэсурсы з’яўляюцца аб’ектам існуючых тыпа-відавых класіфікацый[81].

[81] Караиченцева С. А. Книговедение: литературно-художественная и детская книга. Издания по филологии и искусству. – М., 2004. – С. 249.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Між тым развіццё інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, і ў прыватнасці, інавацыйных камунікацыйных сэрвісаў інтэрнэту на падставе тэхналогіі Web 2.0 прывяло да з'яўлення значнага пласта рэсурсаў пераважна інфармацыйна-карыстальніцкай дзейнасці, якія па спосабе стварэння і выкарыстання ведаў у межах эстэтычнай і навуковай камунікацыі з'яўляюцца *полікамунікацыйнымі*, паколькі створаны непасрэдна карыстальнікамі падчас камунікацыі ў вэб-асяроддзі і перадаюцца па схеме «ад многіх – многім», «ад усіх – усім»[82]. Яны прызначаны для арганізацыі аператыўнага ўзаемадзеяння паміж аўтарамі і чытачамі, а таксама чытачоў паміж сабой. Даюць магчымасць карыстальнікам самастойна канструяваць змест, задаваць траекторыю свайго чытання з дапамогай гіпертэкставай тэхналогіі, ствараць асабістыя тэксты ў межах блогаў, літаратурных гульняў, фанрайтарства, рэкамендацыйных сэрвісаў[83]. Неадкладнае ўключэнне чытача ў працэс камунікацыі на падставе ІР ажыццяўляецца з дапамогай сацыяльных медыя (форумаў, блогаў, чатаў, сацыяльных сетак, вікі-рэсурсаў), рэкамендацыйных сэрвісаў, вэб-канферэнцый, вэбінараў.

Полікамунікацыйныя рэсурсы, хаця і ў значна меншым аб'ёме, але існуюць і ў межах інфармацыйна-творчай дзейнасці як вынік прафесійнай камунікацыі ў інтэрнэт-асяроддзі. Да такіх рэсурсаў адносяцца прафесійныя сацыяльныя сеткі ці старонкі ў сацыяльных сетках, прызначаныя для ажыццяўлення зносін паміж навукоўцамі, а таксама вэб-канферэнцыі, вэбінары, якія прадугледжваюць магчымасць аператыўнага падключэння зацікаўленых карыстальнікаў і абмеркаванне пастаўленых і ўзніклых пытанняў у рэжыме рэальнага часу.

Вылучэнне монакамунікацыйных і полікамункіцыйных рэсурсаў як кампанентаў класіфікацыі ІРМЛЛ дае магчымасць улічыць усе віды ІР, якія звязаны з мастацкім тэкстам і творчай лабараторыяй пісьменніка, дзейнасцю па іх даследаванні, вывучэнні, папулярызацыі, распаўсюджанні і выкарыстанні.

---

[82] Киселева Ю. Н. Информационные революции и трансформация парадигмальных оснований современной социокультурной реальности // Інформатика та комп'ютерні технології : зб. праць VII Міжнар. наук.-практ. конф. студентів, аспірантів та молодих науковців, г. Донецк, 22–23 лист. 2011 р. : в 2 т. – Донецк, 2011. – Т. 1. – С. 28–34.

[83] Беляева Н. Е. Работа библиотеки с интернет-ресурсами художественной литературы : автореф. дис. … канд. пед. наук : 05.25.03. – Орел, 2010. – С. 25.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Класіфікацыю ІРМЛЛ можна прадставіць наступным чынам:

1. ІРМЛ – монакамунікацыйныя (першасныя і другасныя) і полікамунікацыйныя.

*Монакамунікацыйныя першасныя рэсурсы* – творы мастацкай літаратуры як асноўныя інфармацыйныя прадукты галіны, у тым ліку падрыхтоўчая інфармацыя (чарнавікі, варыянты рукапісаў, накіды, карэктуры, гранкі, тэмы, фразы, сказы, варыянты дыялогаў, сюжэтныя лініі твора, дзённікі, запісныя кніжкі, планы, малюнкі і г. д.). Для даследчыкаў падрыхтоўчая інфармацыя з'яўляецца важным матэрыялам, які дазваляе ў поўным аб'ёме вывучаць творчасць аўтара, прасачыць увесь працэс напісання твора ад узнікнення задумы да яго рэалізацыі. Акрамя таго, падрыхтоўчая інфармацыя з'яўляецца непасрэдным аб'ектам вывучэння такой дапаможнай літаратуразнаўчай дысцыпліны, як тэксталогія, што даследуе гісторыю таго ці іншага тэксту і яго крыніцы.

*Монакамунікацыйныя другасныя рэсурсы* – навукова-дапаможная, рэкамендацыйная і вучэбна-дапаможная бібліяграфічная прадукцыя.

*Полікамунікацыйныя рэсурсы* – рэсурсы самапублікацыі, сацыяльных медыя (старонкі ў сацыяльных сетках, блогі, форумы, каментарыі, чаты, вікі-рэсурсы), літаратурныя гульні, фанрайтарства, рэкамендацыйныя сэрвісы.

2. ІРЛ – монакамунікацыйныя (першасныя і другасныя) і полікамунікацыйныя.

Да *монакамунікацыйных першасных рэсурсаў* адносяцца навуковыя, навукова-папулярныя, вучэбныя літаратуразнаўчыя дакументы. Без іх немагчыма вывучэнне літаратурнага працэсу, асэнсаванне літаратурнай спадчыны, яе ўзаемадачынення да грамадскага жыцця і мастацтва ўвогуле.

Да *монакамунікацыйных другасных рэсурсаў* адносяцца: а) фактаграфічная інфармацыя; б) навукова-дапаможная і вучэбна-дапаможная бібліяграфічная інфармацыя; в) рэфератыўная і агляднaя інфармацыя, прадстаўленая ў органах інфармацыі.

*Полікамунікацыйныя ІРЛ* – рэсурсы сацыяльных медыя (старонкі ў прафесійных сацыяльных сетках ці створаныя з мэтай прафесійнай камунікацыі, блогі літаратуразнаўцаў), вэб-канферэнцыі, вэбінары.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Такім чынам, ІРМЛЛ падзяляюцца на дзве падсістэмы, якія ўключаюць усе створаныя ў азначанай галіне ведаў ІР. Перавагай дадзенай класіфікацыі з'яўляецца тое, што яна выяўляе спецыфіку рэсурсаў кожнай падсістэмы, а гэта для даследуемай галіны мае важнае значэнне, паколькі вышэйзгаданыя рэсурсы адрозніваюцца паміж сабой па характары тых ведаў, якія яны ўтрымліваюць. ІРМЛ уяўляюць сабой мастацка-вобразныя веды, разлічаныя на пазнанне навакольнай рэчаіснасці праз мастацкія вобразы, што маюць ідэальна-суб'ектыўную напоўненасць і прызначаны галоўным чынам для эмацыянальнага ўспрымання чытачом. А ІРЛ прадстаўляюць навуковыя веды, атрыманыя праз інтэлект, у чым і заключаецца розніца класіфікацыйных прымет, па якіх дыферэнцыруюцца ў далейшым ІРМЛ і ІРЛ.

Маюць сваю спецыфіку і другасныя ІР дадзенай сферы. У галіне мастацкай літаратуры існуе толькі фактаграфічная і бібліяграфічная інфармацыя (сігнальная і анатаваная), а ў галіне літаратуразнаўства, акрамя фактаграфічнай і бібліяграфічнай, можа быць створана рэфератыўная і аглядная.

Вылучэнне монакамунікацыйных і полікамунікацыйных рэсурсаў дазваляе размежаваць ІРМЛЛ па спосабе стварэння і выкарыстання ведаў у эстэтычнай і навуковай камунікацыі.

Далейшую класіфікацыю ІРМЛЛ можна ажыццяўляць у дзвюх падсістэмах па неабходных прыметах (фармальных, фукцыянальных, змястоўных). Класіфікацыя ІРМЛЛ прадстаўлена ў табл. 1.6, 1.7, 1.8.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 1.6*

**Класіфікацыя монакамунікацыйных першасных інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства**

<table>
<tr><th rowspan="2">Узровень класіфікацыі</th><th rowspan="2">Класіфікацыйныя прыметы</th><th colspan="2">Від інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства</th></tr>
<tr><th>від інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры</th><th>від інфармацыйных рэсурсаў літаратуразнаўства</th></tr>
<tr><td rowspan="9">І. ФАР-МАЛЬНЫ</td><td rowspan="4">носьбіт інфармацыі</td><td colspan="2">а) рэчавыя</td></tr>
<tr><td>выданні і публікацыі мастацкай літаратуры</td><td>літаратуразнаўчыя выданні і публікацыі</td></tr>
<tr><td colspan="2">б) энергетычныя (электронныя)</td></tr>
<tr><td>электронныя выданні, публікацыі і паўнатэкставыя БД твораў мастацкай літаратуры на электронных носьбітах (CD, DVD і г. д.), а таксама ў лакальных камп’ютарных сетках і ў сетцы Інтэрнэт</td><td>электронныя выданні, публікацыі і паўнатэкставыя БД твораў мастацкай літаратуры на электронных носьбітах (CD, DVD і г. д.), а таксама ў лакальных камп’ютарных сетках і ў сетцы Інтэрнэт</td></tr>
<tr><td>форма прадстаўлення інфармацыі</td><td colspan="2">тэкставыя, гукавыя, лічбавыя, мультымедыйныя і інш.</td></tr>
<tr><td>краіна</td><td>– ІР нацыянальнай мастацкай літаратуры;<br>– ІР, якія ўтрымліваюць творы нацыянальнай мастацкай літаратуры народаў свету;<br>– ІР, у складзе якіх аб’яднаны творы, якія належаць да некалькіх нацыянальных літаратур</td><td>у адпаведнасці з дадзенай прыметай ІРЛ не класіфікуюцца</td></tr>
<tr><td>мова</td><td>– ІР на нацыянальнай мове;<br>– ІР, у якіх прадстаўлены творы нацыянальных аўтараў на іншых мовах;<br>– ІР, што ўтрымліваюць пераклады сусветнай літаратуры на нацыянальную мову;<br>– ІР, якія змяшчаюць пераклады нацыянальных аўтараў на іншыя мовы</td><td>у адпаведнасці з дадзенай прыметай ІРЛ не класіфікуюцца</td></tr>
<tr><td>храналагічны перыяд</td><td>– у адпаведнасці з агульнапрынятай у літаратуразнаўстве перыядызацыяй мастацкай літаратуры</td><td>у адпаведнасці з дадзенай прыметай ІРЛ не класіфікуюцца</td></tr>
</table>

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| **II. ФУНКЦЫЯ-НАЛЬНЫ** | мэтавае прызначэнне | – *навуковыя* – навуковыя зборы твораў;<br>– *вучэбныя* – навукова-масавыя дакументы;<br>– *прызначаныя для самаадукацыі і правядзення вольнага часу* – масавыя дакументы мастацкай літаратуры: монавыданні; зборы твораў (поўныя зборы твораў, мастацкіх твораў, твораў аднаго жанру, выбраныя творы); зборнікі: аўтарскія і калектыўныя (анталогіі, альманахі, хрэстаматыі, краязнаўчыя, тэматычныя, твораў аднаго жанру, твораў розных жанраў); серыйныя выданні; мастацка-ілюстраваныя выданні | – *навуковыя* – навукова-даследчыя (манаграфіі, аўтарэфераты дысертацый, дысертацыі, справаздачы аб НДР, матэрыялы канферэнцый (з’ездаў), зборнікі навуковых прац, поўныя зборы твораў, выбраныя творы; крыніцазнаўчыя (помнікі гісторыі і культуры);<br>– *афіцыйныя*;<br>– *вучэбныя*: *па чытацкім прызначэнні* – дакументы для навучэнцаў і дакументы, для тых, хто ажыццяўляе навучальны працэс – выхавацелей, настаўнікаў, выкладчыкаў, бацькоў;<br>*па месцы ў сістэме адукацыі*: для дашкольнага выхавання, для агульнаадукацыйных школ, для сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, для вышэйшай школы;<br>*па ролі ў вучэбным працэсе*: падручнікі, вучэбныя дапаможнікі (хрэстаматыі, зборнікі дакументаў і матэрыялаў, кнігі для чытання, матэрыялы спецкурсаў, рабочыя сшыткі, тэксты лекцый, вучэбна-метадычныя комплексы, тэсты, сачыненні), праграмна-метадычныя выданні (дапаможнікі, вучэбна-метадычныя, метадычныя дапаможнікі для выкладчыкаў, для навучэнцаў, для выкладчыкаў і навучэнцаў);<br>– *навукова-папулярныя;*<br>– *рэкламныя* (прайс-лісты ці каталогі выдавецтваў, якія ўтрымліваюць звесткі пра творы мастацкай літаратуры, якія выйшлі з друку ці плануюцца да друку) |
| | чытацкі адрас | *у залежнасці ад узросту асноўнай групы патэнцыяльных чытачоў:* ІРМЛ, | *у залежнасці ад узроўню агульнай і прафесійнай адукацыі чытачоў:* ІР, |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | | прызначаныя для дзяцей, ІРМЛ, прызначаныя для юнацтва і ІРМЛ, прызначаныя для дарослых | прызначаныя для чытачоў-спецыялістаў; ІР, прызначаныя для чытачоў – не спецыялістаў; ІР, прызначаныя для вучняў, студэнтаў і іншых катэгорый навучэнцаў |
| **ІІІ. ЗМЯСТОЎНЫ** | змест інфармацыі | тэматычныя;<br>персанальныя;<br>краязнаўчыя;<br>краіназнаўчыя | галіновыя;<br>міжгаліновыя;<br>тэматычныя;<br>персанальныя;<br>краязнаўчыя;<br>краіназнаўчыя |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 1.7*

**Класіфікацыя монакамунікацыйных другасных інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства**

<table>
<tr><th rowspan="2">Узровень класіфікацыі</th><th rowspan="2">Класіфікацыйныя прыметы</th><th colspan="2">Від інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства</th></tr>
<tr><th>від інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры</th><th>від інфармацыйных рэсурсаў літаратуразнаўства</th></tr>
<tr><td rowspan="5">I. ФАР-МАЛЬНЫ</td><td rowspan="4">носьбіт інфармацыі</td><td colspan="2">1) рэчавыя</td></tr>
<tr><td>бібліяграфічныя дапаможнікі БМЛ</td><td>бібліяграфічныя дапаможнікі БЛ</td></tr>
<tr><td colspan="2">2) энергетычныя (электронныя)</td></tr>
<tr><td>электронная бібліяграфічная інфармацыя, БД на электронных носьбітах (CD, DVD і г. д.), у лакальных камп’ютарных сетках і ў сетцы Інтэрнэт</td><td>электронная бібліяграфічная і фактаграфічная інфармацыя, БД на электронных носьбітах (CD, DVD і г. д.), у лакальных камп’ютарных сетках і ў сетцы Інтэрнэт</td></tr>
<tr><td>форма прадстаў-лення інфармацыі</td><td colspan="2">тэкставыя, гукавыя, лічбавыя, мультымедыйныя і інш.</td></tr>
<tr><td>II. ФУНКЦЫЯ-НАЛЬНЫ</td><td>мэтавае прызначэнне</td><td colspan="2">– фактаграфічная інфармацыя: віды па функцыянальным прызначэнні і характары інфармацыі: энцыклапедыі і энцыклапедычныя слоўнікі, тэрміналагічныя слоўнікі, лінгвістычныя слоўнікі, даведнікі. Тыпы: 1) агульналітаратурныя: энцыклапедыі і энцыклапедычныя слоўнікі; біяграфічныя слоўнікі (даведнікі); слоўнікі тэрмінаў, цытат і г. д.; слоўнікі літаратурных персанажаў, вобразаў, герояў; даведнікі па літаратурных архівах; літаратурныя хронікі, летапісы, сінхраністычныя табліцы; 2) персанальныя: персанальныя энцыклапедыі і энцыклапедычныя слоўнікі; летапісы жыцця і творчасці пісьменнікаў; слоўнікі мовы пісьменнікаў, рыфм і г. д.; апісанні (каталогі) прыватных бібліятэк пісьменнікаў; апісанні (каталогі) рукапісаў, архіваў аўтараў; даведнікі па мемарыяльных літаратурных музеях;<br>– навукова-дапаможная, вучэбна-дапаможная, рэкамендацыйная бібліяграфічная інфармацыя</td></tr>
<tr><td rowspan="3">III. ЗМЯ-СТОЎНЫ</td><td rowspan="2">чытацкі адрас</td><td>–</td><td>рэфератыўная і аглядная інфармацыя толькі для ІРЛ</td></tr>
<tr><td colspan="2">для чытачоў-спецыялістаў, навукоўцаў; для выкладчыкаў, вучняў, студэнтаў і іншых катэгорый навучэнцаў; для шырокага кола чытачоў</td></tr>
<tr><td>змест аб’ектаў бібліяграфічнага адлюстравання</td><td colspan="2">агульнагаліновыя літаратурныя бібліяграфічныя дапаможнікі, персанальныя дапаможнікі, тэматычныя, праблемна-тэматычныя, жанравыя, краязнаўчыя, краіназнаўчыя, паказальнікі бібліяграфічных дапаможнікаў</td></tr>
</table>

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца 1.8*

**Класіфікацыя полікамунікацыйных інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства**

| Від ІРМЛЛ | |
|---|---|
| від ІРМЛ | від ІРЛ |
| – рэсурсы самапублікацыі;<br>– рэсурсы сацыяльных медыя (старонкі ў сацыяльных сетках, блогі, форумы, каментарыі, чаты, вікі-рэсурсы);<br>– літаратурныя гульні;<br>– фанрайтарства;<br>– рэкамендацыйныя сэрвісы | – рэсурсы сацыяльных медыя (старонкі ў прафесійных сацыяльных сетках ці рэсурсы, створаныя з мэтай прафесійнай камунікацыі, блогі літаратуразнаўцаў);<br>– вэб-канферэнцыі;<br>– вэбінары |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Пытанні для самакантролю

1. Акрэсліце прыметы, неабходныя для класіфікацыі ІРМЛЛ.

2. Якія фармальныя прыметы характэрны толькі для ІРМЛ?

3. Назавіце кампаненты, што ўтвараюць сукупнасць мастацкай літаратуры.

4. Чым прадстаўлены інфармацыйна-дзейнасны кампанент?

5. Як класіфікуюцца ІРМЛЛ па спосабе стварэння і выкарыстання ў межах эстэтычнай камунікацыі?

6. Што такое монакамунікацыйныя рэсурсы? Назавіце монакамунікацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і рэсурсы літаратуразнаўства.

7. Дайце азначэнне паняццю «полікамунікацыйныя рэсурсы». Назавіце полікамунікацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і рэсурсы літаратуразнаўства.

Заданне для самастойнай работы па тэме 1.5.

*Мэта* – навучыцца аналізаваць падыходы спецыялістаў да класіфікацыі дакументаў, ІР, тэкстаў і выданняў мастацкай літаратуры, літаратуразнаўства і прымяняць іх пры вызначэнні класіфікацыі ІРМЛЛ.

*Пры дапамозе прапанаваных крыніц прааналізуйце падыходы да класіфікацыі дакументаў, ІР, тэкстаў і выданняў мастацкай літаратуры, літаратуразнаўства:*


*1. Антопольский, А. Б.* Информационные ресурсы России / А. Б. Антопольский. – М., 2004. – С. 23–47.

*2. Зубов, Ю. С.* Библиография и художественное развитие личности : моногр. / Ю. С. Зубов. – М., 1979. – С. 16.

*3. Караиченцева, С. А.* Книговедение: литературно-художественная и детская книга. Издания по филологии и искусству / С. А. Караиченцева ; Моск. гос. ун-т печати. – М., 2004. – С. 6–8.

*4. Кушнаренко, Н. Н.* Документоведение / Н. Н. Кушнаренко. – Киев, 2003. – С. 98–114. – (Высшее образование XXI века).

*5.* Справочник библиографа / науч. ред.: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб., 2014. – С. 254.

*6. Столяров, Ю. Н.* Документный ресурс : учеб. пособие / Ю. Н. Столяров. – М., 2001. – С. 33–40.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*7. Суминова, Т. Н.* Морфология информационных ресурсов сферы искусства: к постановке проблемы / Т. Н. Суминова // Мир библиографии. – 1998. – № 4. – С. 5.

*8.* Уводзіны ў літаратуразнаўства : вучэб. дапам. : у 2 ч. / пад рэд. В. П. Рагойшы. – Мінск, 2009. – Ч. 1 : Літаратуразнаўства як навука. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка. – С. 111–112, 127–137.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РАЗДЗЕЛ 2
# СУЧАСНЫ СТАН І КІРУНКІ РАЗВІЦЦЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

## ТЭМА 2.1. АСАБЛІВАСЦІ ДАКУМЕНТНЫХ ПАТОКАЎ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

Важным для вызначэння сучаснага стану, праблем і тэндэнцый развіцця інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства (ІР БМЛЛ) становіцца даследаванне іх дакументных патокаў (ДП) праз бібліяметрычны метад. Дадзены метад на падставе выяўленых колькасных параметраў дакументных патокаў (тыпа-відавая, выдавецкая, аўтарская, жанравая, моўная структуры) дазваляе зрабіць абгрунтаваныя высновы пра якасныя характарыстыкі патокаў, пра актуальны стан сістэмы ІР БМЛЛ, яе адпаведнасці патрэбнасцям сферы навукі, адукацыі, самаадукацыі і папулярызацыі літаратурных ведаў, дапамагае выявіць дыяпазон інфармацыйнага забеспячэння галіны.

Вывучэнне ДП у межах бібліятэчна-бібліяграфічнай дзейнасці робіць магчымым выяўленне асаблівага і адзінкавага ў іх з тым, каб улічваць гэтыя характарыстыкі ў працэсе бібліяграфавання дакументаў, абслугоўвання чытачоў.

Бібліятэкарам важна валодаць метадам аналізу дакументнага патоку, бо гэта дазваляе пры абслугоўванні ці складанні бібліяграфічных дапаможнікаў выяўляць: інфармацыю, актуальную для чытачоў; узровень інфармацыйнай забяспечанасці праблемы; накірункі і тэмпы развіцця галіны; унёсак асобных краін, арганізацый, аўтарскіх калектываў у яе развіццё, вывучэнне і вырашэнне яе праблем; інтэгратыўныя сувязі паміж галінамі і праблемамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ІР БМЛЛ утвараюць дакументныя патокі беларускай мастацкай літаратуры, беларускага літаратуразнаўства і паток другасных дакументаў галіны. Азначаныя ДП з'яўляюцца сістэмамі, якія складаюцца з кампанентаў, узаемазвязаных паміж сабой рознымі прыметамі – галіной, месцам выдання, аўтарствам, мовай, тэматыкай і інш. У адпаведнасці з гэтым вывучаюцца тыпа-відавая, тэматычная, выдавецкая, моўная, аўтарская, жанравая (апошняя толькі для дакументных патокаў беларускай мастацкай літаратуры (ДП БМЛ) структуры патокаў, якія выяўляюцца на падставе аналізу статыстычных даных, прадстаўленых у бібліяграфічных дапаможніках ці базах даных, дзе найбольш поўна ўлічваюцца галіновыя дакументы.

Базай для выяўлення і збору статыстычных даных аб ДП БМЛЛ з'яўляюцца дзяржаўны бібліяграфічны дапаможнік «Летапіс друку Беларусі» («Кніжны летапіс», «Летапіс аўтарэфератаў дысертацый», «Летапіс рэцэнзій», «Летапіс часопісных артыкулаў», «Летапіс газетных артыкулаў») і «Реферативный сборник непубликуемых работ "Отчеты о НИР, ОКР, ОТР, депонированные научные рукописи"».

Для выяўлення асноўных тэндэнцый і заканамернасцей развіцця ДП праводзіцца іх аналіз за пэўны, дастаткова працяглы адрэзак часу, напрыклад 3–5–10 гадоў, ці параўнальны аналіз, напрыклад за тры гады напачатку і напрыканцы дзесяцігоддзя. Гэта дазваляе вылучыць асноўныя характарыстыкі і праблемы развіцця патокаў і на гэтай падставе рабіць абгрунтаваныя высновы.

### 2.1.1. Дакументны паток беларускага літаратуразнаўства

Пры даследаванні дакументнага патоку беларускага літаратуразнаўства (ДП БЛ) улічваюцца асобныя выданні (апублікаваныя і неапублікаваныя), артыкулы са зборнікаў, з перыядычных выданняў (газет і часопісаў), з выданняў, якія працягваюцца.

ДП БЛ характарызуецца складанай структурай і ў адпаведнасці з грамадскім прызначэннем дакументаў можа быць дыферэнцыраваны на мікрапатокі афіцыйных, навуковых, вучэбных, даведачных, навукова-папулярных, рэкламных дакументаў. Пераважаюць мікрапатокі навуковых, вучэбных і даведач-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных дакументаў, мікрапаток навукова-папулярных займае зусім нязначны працэнт, а мікрапатокі афіцыйных і рэкламных з'яўляюцца не спецыфічнымі для БЛ.

Згодна з аналізам формы выдання, больш за ўсё ў ДП БЛ публікацый у перыядычным друку: газетах, часопісах і выданнях, якія працягваюцца. Для патоку характэрна невялікая колькасць асобных дакументаў (6–8 %), большасць з якіх – вучэбныя, што стварае дэфіцыт у грунтоўнай навукаёмістай інфармацыі і не можа ў належнай ступені задаволіць інфармацыйныя патрэбнасці навуковай сферы. У патоку вельмі мала навукова-папулярных і даведачных дакументаў, а гэта стварае цяжкасці пры папулярызацыі літаратуразнаўчых ведаў сярод чытачоў не спецыялістаў і забеспячэнні карыстальнікаў фактаграфічнай інфармацыяй. Мова выданняў і публікацый – пераважна беларуская.

### *2.1.1.1. Мікрапаток беларускага літаратуразнаўства сферы навукі*

Мікрапаток БЛ сферы навукі складае асноўную частку ДП БЛ – каля 88 %. Найбольшую колькасць у мікрапатоку складаюць публікацыі ў газетах, часопісах і выданнях, якія працягваюцца. Увогуле публікацый у перыядычным друку ў 30 разоў больш, чым асобных. Кнігі і брашуры, артыкулы з навуковых зборнікаў складаюць невялікі працэнт, некалькі больш – рэцэнзіі.

Для ДП БЛ сферы навукі характэрна дастаткова шырокая тэматычная разнастайнасць. З цягам часу ўзрастае колькасць публікацый па тэмах, якія сустракаюцца ў патоку толькі раз. З аднаго боку, гэта сведчыць пра пашырэнне тэматыкі даследаванняў, а з іншага, пра тое, што нягледзячы на разнастайнасць, многія заяўленыя тэмы не атрымліваюць працягу. Першыя пазіцыі ў патоку належаць тэмам «Персаналія», што абумоўлена аўтарскім характарам твораў мастацкай літаратуры, і «Гісторыя беларускай літаратуры», бо развіццё гістарычнага працэсу патрабуе ўнясення ўдакладненняў у раней створаныя працы.

Самы распаўсюджаны від дакументаў у мікрапатоку – апублікаваныя. Сярод іх пераважаюць навуковыя выданні мана-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

графічнага тыпу, аўтарэфераты дысертацый, матэрыялы канферэнцый і з’ездаў. Справаздачы аб навукова-даследчыя работы складаюць асноўны працэнт неапублікаваных дакументаў.

Вядучымі выдавецтвамі ў галіне з’яўляюцца дзяржаўныя, самае прадукцыйнае сярод якіх – «Беларуская навука», дзе публікуюцца выданні манаграфічнага тыпу, манаграфіі, зборнікі навуковых артыкулаў. Перыядычна папаўняюць масіў літаратуразнаўчых кніг выдавецкія цэнтры вышэйшых навучальных установ – БДУ, Віцебскага, Гомельскага і Гродзенскага дзяржуніверсітэтаў, дзе выходзяць матэрыял канферэнцый, зборнікі навуковых артыкулаў і аўтарэфераты дысертацый. Варта адзначыць выдавецтвы «Права і эканоміка», «Альтэрнатыва», «Кнігазбор» і «Мастацкая літаратура». Іншыя ўстановы звычайна друкуюць літаратуразнаўчыя выданні з перыядычнасцю 1–2 адзінкі на працягу трох гадоў.

Серыйныя выданні – рэдкасць у ДП БЛ. Профільных серый, дзе маглі б мэтанакіравана друкавацца літаратуразнаўчыя працы, няма.

Самую вялікую долю ў ДП беларускага літаратуразнаўства сферы навукі складаюць артыкулы з перыядычных вузкаспецыяльных і агульнамасавых выданняў, а таксама выданняў, якія працягваюцца, з навуковых зборнікаў.

У патоку часопісных публікацый вылучаюцца некалькі груп часопісаў, якія публікуюць аднародныя па тэматыцы і мэтавым прызначэнні артыкулы: 1) навуковыя, навукова-тэарэтычныя, навукова-практычныя і навукова-метадычныя; 2) масава-палітычныя, грамадска-палітычныя, папулярныя, культуралагічныя і іншыя; 3) літаратурна-мастацкія; 4) вытворча-практычныя; 5) рэлігійныя; 6) краязнаўчыя і гісторыка-літаратурныя. Найбольшая колькасць публікацый прыходзіцца на навуковыя часопісы. Сярод часопісаў іншага кшталту першыя пазіцыі належаць галіновым літаратурна-мастацкім, а таксама групе, куды ўваходзяць масава-палітычныя, грамадска-палітычныя, папулярныя, культуралагічныя і інш.

Самымі прадукцыйнымі часопісамі, на старонках якіх змяшчаецца найбольшая колькасць артыкулаў, з’яўляюцца «Роднае слова», «Нёман», «Полымя» і «Маладосць». Далей ідуць навуковыя часопісы (у асноўным выдаваныя ў вышэйшых навучальных установах), а таксама «Беларуская думка», «Бела-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

руская мова і літаратура», літаратурна-мастацкія, масава-палітычныя і папулярныя часопісы.

«Роднае слова» – штомесячны навуковы і метадычны часопіс, заснавальнікам якога з’яўляецца Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Ён выходзіць з 1988 г. і друкуе на сваіх старонках матэрыялы, у якіх адлюстроўваюцца пытанні і праблемы беларускай філалогіі, літаратуразнаўства і літаратурнай крытыкі, методыкі і вопыту распрацоўкі і правядзення ўрокаў беларускай літаратуры, міжпрадметных сувязей беларускай літаратуры і літаратуразнаўства, матэрыялы пра жыццё і творчасць беларускіх пісьменнікаў, творы мастацкай літаратуры, сцэнарыі правядзення літаратурных вечарын і святаў.

Часопіс «Полымя» – адзін з найстарэйшых беларускіх літаратурна-мастацкіх і грамадска-палітычных часопісаў. Ён быў заснаваны ў 1922 г. і з таго часу застаецца ў ліку найбольш прадукцыйных, якасных і цікавых перыядычных выданняў, старонкі якога прадастаўляюць чытачам навуковыя публікацыі літаратуразнаўчага і літаратурна-крытычнага характару, культуралагічныя матэрыялы, матэрыялы да святаў і юбілеяў пісьменнікаў.

«Маладосць» – штомесячны літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны ілюстраваны часопіс Саюза пісьменнікаў Беларусі, заснаваны ў 1953 г. на беларускай мове. Публікуе прозу, паэзію, публіцыстыку, крытычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы, рэцэнзіі і пераклады ў такіх пастаянных рубрыках, як «Паэзія», «Проза», «Пераклады», «Крытыка», «Вяртанне», «Cathedra», «Истфакт». Выдаецца серыя «Бібліятэка часопіса “Маладосць”» (12 кніг у год), у якой выйшлі дэбютныя кнігі шэрагу беларускіх пісьменнікаў. У часопісе публікаваліся Я. Колас, П. Броўка, А. Куляшоў, Я. Маўр, І. Мележ, І. Шамякін, В. Быкаў, У. Караткевіч, М. Лужанін, І. Чыгрынаў, Я. Брыль, В. Вітка.

«Нёман» – штомесячны літаратурна-мастацкі і грамадска-публіцыстычны часопіс Саюза пісьменнікаў Беларусі. Публікуе творы на рускай мове. Мае пастаянныя раздзелы: проза, паэзія, публіцыстыка, гісторыя, культура, нацыя, літаратурная крытыка, запіскі, успаміны, дакументы.

Дастаткова шмат артыкулаў БЛ публікуецца ў няпрофільных выданнях, як навуковых, так і грамадска-палітычных, папулярных, рэлігійных, гістарычных, вытворча-практычных, тэматы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ка якіх зусім не звязана з літаратуразнаўствам, напрыклад, «Инженер – механик», «Мир медицины», «Компас экспедитора и перевозчика», «Лесное и охотничье хозяйство» і інш.

Важнай крыніцай інфармацыі выступаюць газеты, але колькасць выданняў, якія публікуюць літаратуразнаўчыя артыкулы, з цягам часу значна зменшылася. Сярод самых прадукцыйных можна назваць «Літаратуру і мастацтва» і «Краязнаўчую газету», шмат публікацый змяшчае «Настаўніцкая газета», «Беларусь сегодня», «Звязда», «Культура». Акрамя публікацый па праблемах беларускай літаратуры, інтэрв’ю з пісьменнікамі, аглядамі іх творчасці публікуюцца і афіцыйныя матэрыялы: пастановы і распараджэнні дзяржаўных органаў, датычныя літаратурнай дзейнасці, указы Прэзідэнта, матэрыялы з’ездаў пісьменнікаў, некралогі і інш.

Каля 70 % выданняў і публікацый беларускага літаратуразнаўства сферы навукі выходзяць па-беларуску. Калі казаць пра іншыя мовы, то асноўны працэнт – публікацыі на рускай мове, прычым тэндэнцыяй з’яўляецца павелічэнне колькасці такіх публікацый у навуковых зборніках і часопісах. Нязначны працэнт складаюць матэрыялы на польскай, англійскай і ўкраінскай мовах.

Такім чынам, для патоку БЛ сферы навукі характэрны дыспрапорцыі паміж асобнымі выданнямі і публікацыямі ў перыядычным друку. Праблема – невялікая колькасць кніг, у першую чаргу манаграфій, выданняў манаграфічнага тыпу, што прыводзіць да недастатковага забеспячэння навуковай сферы інфармацыяй пра грунтоўныя даследаванні, распрацоўку тэарэтычных, гістарычных, літаратурна-крытычных і іншых пытанняў. Некалькі выпраўляе сітуацыю дастаткова вялікая колькасць публікацый у навуковых, літаратурна-мастацкіх часопісах і колькасць публікацый у зборніках навуковых артыкулаў, якая ўзрастае. Але іх невялікія тыражы, існаванне дакументаў толькі на папяровым носьбіце і ў тэкставай форме, публікацыі ў няпрофільных часопісах, іх політэматычнасць адначасова з разавым характарам публікацый па большасці тэм стварае праблему якаснага інфармацыйнага забеспячэння навуковай сферы. Паляпшэнню сітуацыі будзе спрыяць выданне адсутных у патоку відаў дакументаў (крыніцазнаўчых, збораў твораў і выбраных твораў літаратуразнаўцаў, галіновых, міжгаліновых, тэматычных, персанальных, краязнаўчых) у межах спе-

цыялізаванай літаратуразнаўчай серыі. Пашырыць магчымасці доступу да іх і зменшыць фінансавыя затраты на падрыхтоўку і выданне дапаможа стварэнне электронных рэсурсаў анлайн. Улічваючы сучасную сітуацыю, мэтазгодна стварыць паўнатэкставыя базы даных такіх дакументаў і арганізаваць доступ да іх праз сайты навуковых і адукацыйных устаноў, бібліятэк. Папулярызацыі літаратуразнаўчых ведаў паспрыяе павелічэнне колькасці навукова-папулярных выданняў, пераважна ў мультымедыйнай форме, распрацоўка якасных сайтаў, што акумулююць літаратуразнаўчыя веды, паляпшэнне сэрвісных магчымасцей і інфарматыўнага напаўнення сайту Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, персанальных сайтаў беларускіх літаратуразнаўцаў.

### *2.1.1.2. Даведачныя дакументы ў складзе дакументнага патоку беларускага літаратуразнаўства*

Даведачныя дакументы ў галіне беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства з’яўляюцца важным кампанентам ДП, паколькі забяспечваюць патрэбнасці ў фактаграфічнай інфармацыі як спецыялістаў, так і шырокага кола чытачоў, прадстаўляюць распрацоўкі тэарэтычных праблем галіны. Аднак зараз актуальных даведачных выданняў вельмі мала. Па функцыянальна-мэтавым прызначэнні і характару інфармацыі большасць з іх – даведнікі (тэрміналагічны, тэматычны і два краязнаўчых) і тэрміналагічныя слоўнікі.

Доля даведачных дакументаў у ДП БЛ нязначная і складае ўсяго 0,1 % ад агульнай колькасці. Такое становішча не можа быць здавальняючым і патрабуе ад спецыялістаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі намаганняў па падрыхтоўцы сучасных даведачных выданняў розных тыпаў і відаў, рознага мэтавага і чытацкага прызначэння. На сёння ўсе галіновыя энцыклапедыі з’яўляюцца навукова-папулярнымі. Адзіным прыкладам навуковай энцыклапедыі можа быць «Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі» ў 5 тамах (1982–1987)[84]. Для вывучэння беларускага

[84] Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1982–1987. – 5 т.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літаратуразнаўства і мастацкай літаратуры ў рэтраспекцыі спецыялісты могуць карыстацца «Краткой литературной энциклопедией» у 9 тамах (1962–1978)[85] і «Литературным энциклопедическим словарем» (1987)[86]. Але азначаныя дакументы не ўтрымліваюць новых звестак пра сучасную беларускую літаратуру.

Спецыфічнымі галіновымі даведачнымі дакументамі з'яўляюцца персанальныя энцыклапедыі – своеасаблівы вынік даследавання жыцця і творчасці пісьменніка. Для беларускага літаратуразнаўства такія віды дакументаў – рэдкасць. Цяпер існуюць толькі дзве энцыклапедыі такога кшталту – «Янка Купала» (1983) і «Максім Багдановіч» (2011).

Сярод літаратурных біяграфічных і біябібліяграфічных слоўнікаў для беларускага літаратуразнаўства значным з'яўляецца біябібліяграфічны слоўнік у 6-ці тамах «Беларускія пісьменнікі» (1995)[87], у якім змяшчаецца 1100 артыкулаў пра дзеячаў беларускай літаратуры, але працягу ён не мае.

Сярод даведачных дакументаў, якія выйшлі ў перыяд з 1990 па 1999 гг., ёсць невялікая колькасць значных тэрміналагічных слоўнікаў[88;89;90], лінгвістычных слоўнікаў, прадстаўленых слоўнікамі мовы пісьменнікаў і іх твораў[91;92;93], даведнікаў па мема-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[85] Краткая литературная энциклопедия : в 9 т. / гл. ред. А. А. Сурков. – М. : Сов. энцикл., 1962–1978. – (Энциклопедии. Словари. Справочники). – 9 т.

[86] Литературный энциклопедический словарь / под общей ред. В. М. Кожевникова, П. А. Николаева. – М. : Сов. энцикл., 1987. – 750 с.

[87] Беларускія пісьменнікі : біябібліягр. слоўнік : у 6 т. / Ін-т літ. імя Я. Купалы Акад. навук Рэсп. Беларусь ; пад рэд. А. В. Мальдзіса. – Мінск : БелЭн, 1992–1995. – 6 т.

[88] Рагойша В. П. Паэтычны слоўнік. – 2-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 1987. – 414 с.

[89] Рагойша В. П. Слоўнік-мінімум па літаратуразнаўству. – Мінск : БДУ, 2000. – 123 с.

[90] Слоўнік-даведнік асноўных лінгвастылістычных і тэксталагічных тэрмінаў / Магілёўск. дзярж. ун-т імя А. А. Куляшова ; склад. М. В. Абабурка. – Магілёў : МДУ, 1998. – 24 с.

[91] Анамастычны слоўнік твораў Якуба Коласа / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа ; пад рэд. М. В. Бірылы ; склад.: Г. У. Арашонкава, В. А. Бабкова, М. В. Бірыла [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1990. – 638 с.

[92] Слоўнік мовы Янкі Купалы : у 8 т. / Гомел. дзярж. ун-т імя Ф. Скарыны ; склад.: У. В. Анічэнка [і інш]. – Мінск : Беларус. навука, 1997–2003. – 8 т.

[93] Фразеалагічны слоўнік мовы твораў Якуба Коласа : звыш 6000 слоўнікавых арт. / АН Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; уклад.: А. С. Аксамітаў [і інш.] ; пад. рэд. А. С. Аксамітава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 655 с.

рыяльных літаратурных музеях, літаратурных архівах[94;95] і такі спецыфічны для літаратуразнаўства тып даведнікаў, як хронікі літаратурнага жыцця. Напрыклад, «Хроніка літаратурнага жыцця» суправаджае кожны том 4-хтомнай «Гісторыі беларускай літаратуры XX стагоддзя» (1999)[96]. Але гэта дасягненні мінулых гадоў, якія не маюць працягу. На сёння праблема стварэння і выпуску даведачных дакументаў для беларускага літаратуразнаўства стаіць даволі востра і патрабуе вырашэння.

Такім чынам, існуе неабходнасць у аптымізацыі тыпа-відавога складу даведачных дакументаў БЛ. Вялікае значэнне для забеспячэння карыстальнікаў фактаграфічнымі ведамі будзе мець стварэнне навуковай агульналітаратурнай энцыклапедыі, а таксама персанальных энцыклапедый класікаў беларускай літаратуры, паколькі тэма «Персаналіі» з'яўляецца найбольш распрацаванай у беларускім літаратуразнаўстве, а жыццё і творчасць многіх пісьменнікаў дастаткова даследаваны. Стварэнне іх персанальных энцыклапедый дазволіць сабраць увесь матэрыял разам, сістэматызаваць яго, дапоўніць новымі звесткамі і прадставіць іх творчасць цалкам, ва ўзаемасувязі з жыццём, эпохай, літаратурным працэсам. Найбольш прымальнай формай для такіх відаў дакументаў з'яўляецца мультымедыйная, паколькі яна дазваляе ў адзінай інфармацыйнай прасторы адлюстраваць тэкставую, аўдыявізуальную, выяўленчую інфармацыю.

Інфармацыйнаму забеспячэнню спецыялістаў-філолагаў, студэнтаў профільных навучальных устаноў будзе спрыяць выданне каталогаў прыватных бібліятэк, рукапісаў, архіваў пісьменнікаў, стварэнне такіх тыпаў даведачных выданняў, як слоўнікі тэрмінаў і цытат, літаратурных персанажаў, слоўнікі мовы пісьменнікаў, рыфм, якія на сёння адсутнічаюць у сістэме даведачных выданняў БЛ. Такая праца можа ажыццяўляцца спецыялістамі Цэнтра даследаванняў беларускай культуры,

---

[94] Літаратурны музей Якуба Коласа / склад. З. Н. Камароўская ; фота В. В. Зенько, А. І. Талочка. – Мінск, 1989. – 14 с.

[95] Ліўшыц У. М. Літаратурны музей Максіма Гарэцкага : кароткі даведнік / Аб'яднанне дзярж. літ. музеяў Рэсп. Беларусь. – Орша, 1997. – 68 с.

[96] Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / Нац. АН Беларусі, Аддз. гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Янкі Купалы ; рэдкал.: У. В. Гніламёдаў [і інш.] ; навук. рэд. У. В. Гніламёдаў, В. А. Каваленка. – Мінск : Беларус. навука, 2001–2002. – 4 т.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мовы і літаратуры НАН Беларусі, літаратурных архіваў, профільных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў.

### *2.1.1.3. Дакументны паток сферы адукацыі*

Адну з самых вялікіх частак беларускага літаратуразнаўчага патоку складаюць вучэбныя і вучэбна-метадычныя дакументы, сістэма якіх адрозніваецца жанравай разнастайнасцю і розным чытацкім адрасам, што не выпадкова і абумоўлена вывучэннем беларускай літаратуры на ўсіх ступенях адукацыі.

ДП БЛ сферы адукацыі прадстаўлены асобнымі выданнямі і публікацыямі ў перыядычным друку і навуковых зборніках. Прычым мова публікацый амаль усіх з іх – беларуская.

Што тычыцца *формы выдання* вучэбных дакументаў, то найбольшую колькасць у патоку складаюць артыкулы з часопісаў і выданняў, якія працягваюцца, а таксама кнігі і брашуры, прычым публікацый у перыядычным друку і навуковых зборніках у тры разы больш, чым асобных выданняў.

Больш за 20 выдавецтваў ажыццяўляюць выпуск вучэбнай літаратуры. Найбольш прадукцыйныя з іх – недзяржаўныя «Юніпрэс», «Аверсэв», «Белы вецер» і дзяржаўнае выдавецтва «Народная асвета». Дзяржаўныя профільныя для сферы адукацыі выдавецтвы, такія, як «Адукацыя і выхаванне», «Пачатковая школа», а таксама выдавецкія цэнтры вышэйшых навучальных устаноў (Брэсцкага, Віцебскага, Гродзенскага дзяржуніверсітэтаў) выпускаюць вучэбныя літаратуразнаўчыя выданні ў значна меншай колькасці.

Вучэбныя выданні выходзяць у складзе спецыялізаваных серый. Найбольш прадукцыйнымі з іх з’яўляюцца «Школьнікам, абітурыентам, навучэнцам», «Беларуская літаратура. Факультатыўныя заняткі», «Мой рабочы сшытак», «З вопыту работы».

Згодна *з чытацкім прызначэннем, у ДП БЛ сферы адукацыі* пераважаюць выданні для навучэнцаў, ёсць выданні для выкладчыкаў і вельмі мала выданняў для навучэнцаў і выкладчыкаў разам.

Размежаванне вучэбных выданняў *па месцы ў сістэме адукацыі* паказвае, што найбольшая іх колькасць зроблена для агульнаадукацыйных школ – каля 76 %. Выданні для ВНУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

складаюць невялікі працэнт (14–20 %). Вельмі мала для сярэдніх спецыяльных устаноў і для спецшкол для дзяцей з парушэннямі маўлення, затрымкай псіхічнага развіцця, для дашкольнага выхавання і абітурыентаў.

ДП БЛ сферы адукацыі можна аналізаваць і *па ролі выданняў у вучэбным працэсе*. У адпаведнасці з гэтай прыметай, у патоку дамінуюць дапаможнікі для навучэнцаў. Акрамя таго, у ім прысутнічаюць праграмна-метадычныя выданні і падручнікі, прычым доля апошніх значна скарачаецца. Сярод кніг для навучэнцаў больш за ўсё дапаможнікаў і вучэбных дапаможнікаў. Для патоку характэрны і такія дастаткова адметныя для галіны віды выданняў, як хрэстаматыі, падручнікі-хрэстаматыі, кнігі для чытання, але іх мала, і колькасць іх пастаянна скарачаецца. Змены ў навучальным працэсе патрабавалі вылучэння такога спецыфічнага і значнага для дадзенай галіны віду дапаможнікаў для навучэнцаў, як тэсты. Самым спецыфічным відам выданняў ДП БЛ сферы адукацыі з'яўляюцца «Сачыненні», паколькі напісанне дадзеных прац – неабходная і важная частка працэсу па вывучэнні твораў мастацкай літаратуры. Аднак выданне і гэтых відаў дапаможнікаў зніжаецца. Для патоку характэрны і такія віды выданняў, як вучэбна-метадычныя комплексы, курсы лекцый, рабочыя сшыткі. Яны не з'яўляюцца спецыфічнымі для літаратуразнаўчай адукацыі, але іх наяўнасць у патоку пацвярджае змены, якія адбыліся ў апошні час у складзе вучэбных выданняў у сувязі з новымі патрабаваннямі да вучэбна-метадычнай дакументацыі.

Праграмна-метадычныя выданні ў патоку падраздзяляюцца на выданні для выкладчыкаў (іх большасць), для навучэнцаў, для выкладчыкаў і навучэнцаў разам. Для выкладчыкаў у большасці выдаюцца дапаможнікі, ёсць таксама метадычныя і вучэбна-метадычныя дапаможнікі.

Працэс выдання і публікацыі вучэбных матэрыялаў носіць дастаткова дынамічны характар, сістэма рэагуе на змены праграм, методыкі навучання і кантролю ведаў праз увядзенне новых відаў дапаможнікаў. Мэтазгодна было б звярнуць увагу на зніжэнне колькасці тых відаў вучэбных выданняў, якія неабходны для забеспячэння адукацыйнага працэсу – падручнікаў, а таксама спецыфічных для літаратурнай адукацыі відаў дапаможнікаў: хрэстаматый, падручнікаў-хрэстаматый, сачынен-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

няў, бо гэта адмоўна адбіваецца на сярэдняй адукацыі. Акрамя таго, існуюць пэўныя дыспрапорцыі ў інфармацыйным забеспячэнні розных катэгорый навучэнцаў. Так, найбольш дынамічна развіваецца такое звяно сістэмы, як падручнікі і вучэбныя дапаможнікі для агульнаадукацыйных школ. Вучэбных дапаможнікаў для ВНУ, сярэдніх спецыяльных устаноў выдаецца значна менш. Слаба забяспечана дашкольная адукацыя, адукацыя дзяцей з парушэннямі маўлення, а таксама абітурыенты. Мэтазгодным з'явілася б вывучэнне патрэбнасцей устаноў адукацыі ў адсутных відах дакументаў і пры неабходнасці дапаўненне імі сістэмы вучэбных выданняў.

Выкладчыкі і настаўнікі забяспечаны неабходнымі метадычнымі матэрыяламі, парадамі, рэкамендацыямі, распрацоўкамі заняткаў па беларускай літаратуры, змешчанымі ў прафесійных перыядычных выданнях, асабліва ў часопісах «Роднае слова» і «Беларуская мова і літаратура» – найбольш прадукцыйных, дзе ўтрымліваецца больш за 70 % артыкулаў. Паляпшэнню іх інфармацыйнага забеспячэння будзе спрыяць павелічэнне колькасці асобных метадычных выданняў, у якіх неабходная для вучэбнага працэсу інфармацыя прадстаўлена цэласна і комплексна.

Артыкулы ў навуковых часопісах стабільна складаюць 98 % патоку. Астатнія 2 % – гэта публікацыі ў вытворча-практычных, інфармацыйна-аналітычных і інфармацыйна-метадычных часопісах. Публікацый у зборніках навуковых артыкулаў вельмі мала.

Найбольш прадукцыйнымі перыядычнымі выданнямі, якія ўтрымліваюць больш за 70 % артыкулаў, з'яўляюцца профільныя навукова-метадычныя часопісы «Роднае слова» і «Беларуская мова і літаратура», публікацыі якіх тычацца праблем літаратурнай адукацыі, методыкі і вопыту распрацоўкі і правядзення ўрокаў беларускай літаратуры, міжпрадметных сувязей беларускай літаратуры і літаратуразнаўства і інш. Даволі шмат артыкулаў публікуецца таксама ў навуковых, навукова-метадычных, інфармацыйна-метадычных педагагічных часопісах.

Няшмат у патоку публікацый *у газетных выданнях.* Самым прадукцыйным з іх можна назваць «Настаўніцкую газету», на старонках якой публікуецца больш за 80 % артыкулаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У ДП БЛ сферы адукацыі амаль што ўсе публікацыі на беларускай мове.

ДП БЛ сферы адукацыі ўтрымлівае адзінкавыя электронныя выданні. Напрыклад, CD-ROM «Электронная библиотека – школьникам: хрестоматия», у якім прадстаўлены поўныя тэксты твораў школьнай праграмы для абавязковага, дапаўняльнага і пазакласнага чытання па беларускай і рускай літаратуры для 9–11 класаў. На сёння такая праца недастатковая. Перспектыўным кірункам развіцця электроннага кантэнту з'яўляецца стварэнне даступных у анлайнавым рэжыме электронных падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў – паўнатэкставых, гіпертэкставых, мультымедыйных і іншых, якія пажадана аздабляць літаратурна-крытычнымі, біяграфічнымі, бібліяграфічнымі матэрыяламі, пытаннямі і тэстамі для самакантролю.

Шырокія магчымасці адкрываюцца пры выкарыстанні ў навучанні інтэрнэт-тэхналогій, асаблівасць якіх у тым, што навучэнец «можа не толькі прачытаць, але і пачуць мастацкі твор у выкананні лепшых майстроў мастацкага слова, убачыць інтэрпрэтацыі мастацкіх твораў у графічных вобразах»[97]. Прычым «усе сродкі для вывучэння літаратурнага твора знаходзяцца ў адной інфармацыйнай крыніцы, адбываецца пастаяннае абнаўленне матэрыялаў па любой тэме, вучань можа сам абраць траекторыю вывучэння матэрыялу»[98]. Такім чынам, распрацоўка якасных інтэрнэт-рэсурсаў стварае магчымасці для больш глыбокага і хуткага засваення літаратурных ведаў.

## Пытанні для самакантролю

1. З дапамогай якога метаду ажыццяўляецца вывучэнне дакументных патокаў?

2. Для чаго неабходна вывучэнне дакументных патокаў?

3. Якія мікрапатокі ўтвараюць ДП БЛ?

4. Які мікрапаток займае самае вялікае месца ў ДП БЛ?

5. Назавіце асноўныя характарыстыкі ДП БЛ сферы навукі, ДП даведачных дакументаў, а таксама ДП БЛ сферы адукацыі.

---

[97] Черниченко С. Н. Роль интернет-ресурсов в системе средств изучения литературной темы [Электронный ресурс] // Интернет-журнал «Эйдос». – 2004. – 20 апр. – Режим доступа: http://www.eidos.ru/journal/2004/0420.htm. – Дата доступа: 21.05.2017.

[98] Там жа.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 2.1.2. Адметныя характарыстыкі дакументнага патоку беларускай мастацкай літаратуры

Дакументны паток беларускай мастацкай літаратуры (БМЛ) уяўляе сабой дастаткова развітую структуру, якая ўключае як неперыядычныя выданні, так і публікацыі ў перыядычным друку. Публікацый у перыядычным друку значна больш, чым асобных выданняў (прыкладна ў 4,5 разы). Гэтая сітуацыя даволі звычайная, але адмоўным з'яўляецца невялікі працэнт асобных выданняў у патоку.

Што тычыцца *відавой структуры* ДП БМЛ, то паток характарызуецца нешматлікасцю некаторых відаў выданняў. Напрыклад, навуковых і навукова-масавых, што зніжае магчымасці навуковага даследавання беларускай мастацкай літаратуры, а таксама сур'ёзнага вывучэння яе ў навучальных установах. Самую вялікую долю ў патоку складаюць масавыя выданні, што не выпадкова і звязана са спецыфікай мастацкай літаратуры і прызначанасцю яе ў першую чаргу для вольнага часу.

Навуковыя выданні твораў БМЛ у Рэспубліцы Беларусь рыхтуюцца ў Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Дадзенай установай было падрыхтавана некалькі такіх выданняў. Напрыклад, адным з іх з'явіўся Поўны збор твораў Я. Купалы ў 9-ці тамах, які стаў важкім і значным вынікам працы тэкстолагаў. У параўнанні з папярэднімі зборамі твораў Я. Купалы, у новым навукова-каментаваным выданні тэксты даюцца без купюр, матэрыялы, звязаныя з жыццём і творчай дзейнасцю паэта, прадстаўлены ў больш поўным аб'ёме, навукова-даведачны апарат мае шматлікія звесткі, значна пашыраны тэксталагічны і рэальны каментарыі. Такія ж асаблівасці ўласцівы і найбольш поўным навукова-каментаваным выданням Поўнага збору твораў Я. Коласа ў 18-ці тамах, М. Багдановіча, К. Чорнага, І. Мележа, М. Гарэцкага, М. Лынькова, З. Бядулі. П. Пестрака, П. Броўкі. Першае навуковае выданне Поўнага збору твораў М. Танка ў 15-ці тамах забяспечана каментарыем з бібліяграфічна-тэксталагічнай характарыстыкай кожнага твора, якая ўключае інфармацыю пра час яго напісання, першай публікацыі і пра тое, па якой крыніцы даецца асноўны тэкст, прыведзены выяўленыя яго варыянты – у адпаведнасці з усімі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

публікацыямі, а таксама на аснове захаваных белавых і расшыфраваных чарнавых аўтографаў пададзены звесткі пра месцазнаходжання рукапісаў паэта.

Навукова-масавыя выданні твораў БМЛ выходзяць у спецыялізаваных выдавецтвах, такіх, як «Кнігазбор», «Беларуская навука», «Мастацкая літаратура». Напрыклад, у «Кнігазборы» выдаюцца выбраныя творы беларускіх паэтаў і пісьменнікаў, якія суправаджаюцца прадмовамі пра іх жыццё і дзейнасць, каментарыямі. Маюцца дадаткі, дзе публікуюцца лісты, успаміны, дакументы. Выданні аснашчаны бібліяграфічнымі спісамі і даведачна-пошукавым апаратам.

Масавыя выданні выходзяць ва ўсіх выдавецтвах, якія займаюцца публікацыяй мастацкай літаратуры, як дзяржаўных, так і камерцыйных.

Станоўчай тэндэнцыяй з'яўляецца наяўнасць дастатковай колькасці выдавецкіх серый, у якіх публікуюцца беларускія творы (больш за 70). Самыя прадукцыйная з іх – «Бібліятэка часопіса "Маладосць"», «Черный квадрат», «Уголовный розыск», «Библиотечка "Детективной газеты"», «Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі», «Бібліятэка сучаснай беларускай фантастычнай і прыгодніцкай прозы», «Современный российский бестселлер».

Паток неперыядычных выданняў БМЛ характарызуецца дыспрапорцыямі паміж монавыданнямі і зборнікамі (аўтарскімі, калектыўнымі, твораў розных жанраў), якіх большасць. Гэта тлумачыцца перавагай у патоку твораў паэтычнага жанру і зборнікаў анекдотаў, тостаў, sms. Зборы твораў і выбраныя творы займаюць даволі сціплае месца ў патоку, а мастацка-ілюстраваныя выданні – не характэрная з'ява для ДП БМЛ.

Элементамі ДП мастацкай літаратуры з'яўляюцца выданні на электронных носьбітах. У ДП БМЛ яны прадстаўлены невялікай колькасцю электронных выданняў на CD і аўдыякнігамі. Сярод іх можна адзначыць CD-ROMы, створаныя ў 2008–2010 гг. у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі (НББ): «Літаратурная спадчына Беларусі, XI – сярэдзіна XX ст. (з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі)», «"Radziviliana": дакументальныя помнікі з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі», «"Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…": да 170-годдзя з дня нараджэння Францішка Багушэвіча (1840–1900)», «Жыве

паміж намі дудар наш...: да 200-годдзя з дня нараджэння Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча (1808–1884)». Сёння праца над стварэннем БМЛ на CD працягваецца – з'яўляюцца адно-два новых выданні за год, хаця агульнасусветная тэндэнцыя іншая – выпуск электронных кніг, даступных анлайн, алічбоўка бібліятэчных калекцый. Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў межах фарміравання электроннай бібліятэкі праводзіць працу па стварэнні тэматычных электронных калекцый беларусазнаўчага зместу. Рэалізацыі шырокага доступу ў лічбавым фармаце да ІР БМЛЛ садзейнічае калекцыя «Славутыя імёны і падзеі Беларусі», у якой прадстаўлена дакументальная спадчына беларускіх пісьменнікаў і літаратуразнаўцаў з фондаў НББ. У склад калекцыі ўключаны творы В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Цёткі, М. Багдановіча і інш. Алічбаваны прыжыццёвыя выданні пісьменнікаў, выданні з аўтографамі аўтараў, матэрыялы, змешчаныя ў першых хрэстаматыях і падручніках па беларускай літаратуры. Значнымі з'яўляюцца тэматычныя калекцыі «Произведения белорусских авторов, переданные Министерством культуры РБ», «Радзівіліяна», «Книга Беларуси XVI–XVIII вв.». Для забеспячэння інфармацыйных патрэбнасцей карыстальнікаў, пашырэння доступу да ІР БМЛЛ неабходна працягваць працу па іх алічбоўцы, а таксама забяспечыць анлайн-доступ да лічбавых калекцый праз спецыялізаваны інтэрнэт-рэсурс БМЛЛ.

Што тычыцца аўдыякніг, то аналіз сайтаў інтэрнэт-магазінаў паказвае, што іх няшмат. Яны прадстаўлены на сайтах oz.by, «Кнігі-поштай», на сайце prastora.by. У асноўным гэта творы У. Караткевіча, Я. Купалы, І. Мележа, У. Арлова.

Перспектыўным накірункам развіцця ДП асобных выданняў БМЛ, якія дазволіць аператыўна папаўняць яго звёны, і з эканамічнага боку, і зыходзячы з задавальнення патрэбнасцей карыстальнікаў, з'яўляецца стварэнне электронных кніг. Аналіз сітуацыі з кнігавыданнем і кнігараспаўсюджваннем у свеце паказвае, што попыт на электронныя кнігі і іх продаж, у тым ліку і на электронныя кнігі мастацкай літаратуры, хутка павялічваецца, пэўная частка чытачоў, асабліва з ліку моладзі, актыўна выкарыстоўвае гаджэты (смартфоны, букрыдары, планшэты і інш.), якія дазваляюць ім камфортна адчуваць сябе і чытаць электронныя кнігі, што адзначаецца ў працах такіх дослед-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

чыкаў, як В. К. Сцяпанаў, Я. Л. Шрайберг і іншых[99;100;101;102]. Сёння ўжо існуюць шматлікія прафесійныя сэрвісы, якія акумулююць масіў электронных кніг і прадастаўляюць доступ да іх як асобным чытачам, так і бібліятэкам. Такія кнігі можна чытаць на любой электроннай прыладзе. Важна, каб чытачы мелі магчымасць праз падобныя сэрвісы атрымаць доступ да твораў БМЛ. Такім сэрвісам для чытання электронных кніг па падпісцы, бібліятэка якога ўтрымлівае больш за 50 кніг беларускіх пісьменнікаў, з'яўляецца Bookmate. Неабходна, каб сегмент электронных кніг БМЛ пастаянна пашыраўся і была магчымасць доступу да іх і праз іншыя сэрвісы.

Для ДП БМЛ характэрна даволі шырокая аўтарская структура, якая мае тэндэнцыю да павелічэння. Напрыклад, у 2000–2002 гг. публікаваліся творы 433 аўтараў, а ў 2008–2010 гг. – ужо 866. Даволі шмат публікуецца твораў С. Макарава, М. Чаргінца, Я. Коласа, але асноўную колькасць у патоку складаюць аўтары, творы якіх публікаваліся толькі аднойчы на працягу трох гадоў. Пераважаюць публікацыі сучасных рускамоўных паэтаў. Аб'ёмы і тыражы такіх выданняў невялікія.

Творы БМЛ выдаюцца дзяржаўнымі і недзяржаўнымі выдавецтвамі. Найбольш прадукцыйнымі з'яўляюцца недзяржаўныя «Современный литератор» і «Харвест», якія ў асноўным выдаюць масавую літаратуру, разлічаную на хуткі камерцыйны поспех, а таксама выдавецтва «Кнігазбор», задачай якога

---

[99] Степанов В. К. Библиотеки в условиях сокращающегося книжного пространства [Электронный ресурс] // Библиотеки и информационные ресурсы в современном мире науки, культуры, образования и бизнеса : материалы Двадцатой юбилейной междунар. конф. «Крым 2013», Судак, 8–16 июня 2013 г. – Режим доступа: http://gpntb.ru/win/inter-events/crimea2013/disk/116.pdf. – Дата доступа: 06.05.2017.

[100] Степанов В. К. Ключевые тенденции развития цифровых технологий и новая образовательная среда [Электронный ресурс] // Высокое качество и лидерство в образовании – 2013 : междунар. конф., г. Астана, 13 нояб. 2013 г. – Режим доступа: http://conference.nis.edu.kz/november2013ru/index.php/contactus-2/contactus-3. – Дата доступа: 06.05.2017.

[101] Степанов В. К. Основные направления деятельности библиотек в системе цифровых коммуникаций // Румянцевские чтения – 2013 : материалы Междунар. науч. конф., Москва, 16–17 апр. 2013 г. : в 2 ч. / Рос. гос. б-ка. – М., 2013. – Ч. 2. – С. 198–205.

[102] Шрайберг Я. Л. Интеграция библиотек в развивающееся информационное общество: что нас ждёт впереди? : ежегод. докл. конф. «Крым», 2012 [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.gpntb.ru/ntb/ntb/2013/1/ntb_1_1_2013.pdf. – Дата доступа: 20.05.2017.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

з'яўляецца выданне значных, па-мастацку вартых твораў беларускіх аўтараў. Сярод дзяржаўных установаў найбольш прадукцыйным можна лічыць профільнае выдавецтва «Мастацкая літаратура», якое на працягу дзесяцігоддзяў займаецца выпускам твораў беларускіх пісьменнікаў, у прыватнасці, серый «Беларуская проза ХХ стагоддзя», «Беларуская паэзія ХХ стагоддзя», але па колькасці выданняў яно значна саступае недзяржаўным.

Праведзены аналіз паказаў, што беларускім выдавецтвам неабходна больш актыўна публікаваць творы беларускіх аўтараў. Вырашэнню сітуацыі сёння садзейнічае палажэнне Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19.08.2011 № 1110 аб парадку прадастаўлення субсідый і фінансавання расходаў некаторых арганізацый, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку, выпуск, камплектаванне і (ці) дастаўку сацыяльна значных і вучэбных выданняў, у тым ліку і літаратурна-мастацкіх, значную частку якіх традыцыйна ўтвараюць выданні беларускай мастацкай літаратуры[103]. Палажэннем вызначана, што памер субсідый на падрыхтоўку і выпуск беларускамоўных літаратурна-мастацкіх выданняў складае да 75 % кошту тыражу выдання, а рускамоўных – да 50 %. Такім чынам ствараецца спрыяльная сітуацыя для развіцця айчыннага кнігадрукавання твораў БМЛ, прычым беларускамоўных. Аднак існуюць цяжкасці з распаўсюджаннем выдадзеных твораў. Прычыны гэтай з'явы – нізкая доля БМЛ у рэпертуары чытання сучасных дзяцей і дарослых, амаль поўная адсутнасць рэкламы беларускіх пісьменнікаў і іх твораў.

Даныя сацыялагічнага даследавання НББ стану і тэндэнцый развіцця дзіцячага чытання ў Рэспубліцы Беларусь сведчаць пра тое, што доля беларускіх аўтараў у структуры дзіцячага чытання складае ўсяго 6,8 %. Пры гэтым ніколі не звярталіся да твораў беларускай літаратуры 37 % рэспандэнтаў, а 66 % прызналіся, што чытаюць яе толькі для падрыхтоўкі да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

[103] Об утверждении Положения о порядке предоставления субсидий и порядке финансирования расходов некоторых организаций, осуществляющих подготовку, выпуск, комплектование и(или) доставку социально значимых и учебных изданий [Электронный ресурс] : постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 19 авг. 2011 г., № 1110 // Совет Министров Респ. Беларусь. – Режим доступа: www.pda.government.by/be/solutions/1686. – Дата доступа: 15.07.2020.

ўрокаў[104]. У рэйтынгу любімых кніг бацькоў творы беларускіх аўтараў адсутнічаюць. Не назвалі яны іх і сярод кніг, якія жадаюць набыць для чытання. Выкладчыкі і бібліятэкары сярод 10 кніг, якія неабходна абавязкова прачытаць дзецям, адзначылі толькі творы В. Быкава. Такім чынам, на жаль, сёння беларуская мастацкая літаратура з'ява больш кулуарная, чым масавая. Шырокае кола карыстальнікаў у большасці сваёй ведае толькі некалькі найбольш знакамітых майстроў слова, у асноўным класікаў, творчасць якіх праходзяць у навучальных установах. Пра гэта сведчаць, напрыклад, вынікі сацыялагічнага апытання, праведзенага літаратурна-мастацкім часопісам «Полымя» ў 2014 г. «Топ-10 любімых твораў беларускай класікі»[105].

Сучасныя паэты, празаікі, драматургі, публіцысты – не вядомы масаваму чытачу. Адна з прычын такой сітуацыі – адсутнасць якаснай рэкламы твораў БМЛ, шырокай папулярызацыі праз установы культуры, адукацыі, сродкі масавай інфармацыі, інтэрнэт. Такім чынам, неабходна не толькі ствараць спрыяльныя ўмовы выдавецкім арганізацыям для публікацыі твораў БМЛ, але і ажыццяўляць працу па іх распаўсюджанні ў грамадстве, прыцягненні карыстальнікаў да іх чытання. Такая мэтанакіраваная дзейнасць павінна праводзіцца бібліятэкамі, навучальнымі ўстановамі, выдавецтвамі, сродкамі масавай інфармацыі.

Для ДП БМЛ характэрна існаванне значнай колькасці профільных літаратурна-мастацкіх часопісаў, асноўны аб'ём публікацый якіх складаюць творы БМЛ («Маладосць», «Полымя», «Нёман»). Акрамя таго, яны друкуюцца ў культуралагічных, гісторыка-літаратурных, краязнаўчых, грамадска-палітычных, дасугавых, вытворча-практычных, навуковых, рэлігійных выданнях.

Самая вялікая колькасць твораў БМЛ разглядаецца ў газетах, але назіраецца значнае зніжэнне як колькасці публікацый, так і газет. Палова з іх з'яўляецца на старонках такіх выданняў, як «Беларуская ніва» і «Літаратура і мастацтва». Менш стала

---

[104] Современное состояние и тенденции развития детского чтения в Республике Беларусь: по результатам республиканского исследования / Нац. б-ка Беларуси ; сост.: М. Г. Пшибытко, О. В. Гаврилович. – Минск, 2011. – С. 20–23, 61–62, 75.

[105] Не размінуцца з Атлантыдай класікі. «Круглы стол» па выніках акцыі «Топ-10 любімых твораў беларускай класікі» // Полымя. – 2015. – № 3. – С. 154–170.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

публікацый твораў БМЛ у абласных газетах «Гомельская праўда», «Гродзенская праўда», «Магілёўскія ведамасці», «Віцебскі рабочы», што адмоўна адбіваецца на развіцці рэгіянальнай літаратуры і літаратурнага краязнаўства, паколькі ў мясцовай перыёдыцы традыцыйна друкуюцца свае аўтары.

Праблема ў тым, што літаратурныя часопісы і газеты, нягледзячы на агульнацікавасць мастацкай літаратуры, маюць вельмі абмежаваную аўдыторыю і амаль не запатрабаваны ў шырокага кола чытачоў. У бібліятэках попыт на іх вельмі слабы, многія людзі, асабліва моладзь, увогуле не ведаюць пра іх існаванне. Сітуацыю не паляпшае і з’яўленне электронных версій літаратурнай перыёдыкі. Асноўная прычына – адсутнасць рэкламы, асабліва ў інтэрнэце, у бібліятэках, слабая іх папулярызацыя ў навучальных установах.

Неабходнасць павышэння цікавасці карыстальнікаў да БМЛ патрабуе ад выдавецкага дому «Звязда», у склад якога ўваходзяць профільныя літаратурна-мастацкія перыядычныя выданні, рэдакцый літаратурных часопісаў і газет, бібліятэк распрацоўкі маркетынгавай стратэгіі папулярызацыі прадуктаў БМЛ. Яе аснову павінен скласці інтэрнэт-маркетынг, які на сёння з’яўляецца найбольш эфектыўным у эканамічным плане, дазваляе ахапіць неабмежаваную аўдыторыю і пры гэтым персаналізаваць кожнага канкрэтнага карыстальніка, ажыццяўляць інтэрактыўнае ўзаемадзеянне з ім.

Адной з прымет дыферэнцыяцыі выданняў БМЛ, якая адрознівае ДП БМЛ ад усіх іншых галіновых патокаў, з’яўляецца *жанравая.* Пераважаюць у патоку паэтычныя творы (каля 80 %). Доля прозы невялікая – ад 15 % да 19 %. Публіцыстыка, драматургія, зборнікі розных жанраў, фальклор прысутнічаюць у патоку, аднак маюць вельмі малы працэнт.

Супярэчлівым з’яўляецца моўнае пытанне для ДП БМЛ. Паток складаюць публікацыі на беларускай, рускай мове, на беларускай і рускай разам, а таксама адзінкавыя публікацыі на іншых мовах: польскай, англійскай, нямецкай, украінскай, балгарскай. Колькасць публікацый на беларускай і рускай мовах амаль што аднолькавая і складае каля 99 %. Найбольшая колькасць рускамоўных публікацый утрымліваецца ў ДП асобных выданняў – больш за 60 %. Такім чынам, мова беларускай мастацкай літаратуры – пераважна руская, што для нацыянальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

літаратуры безумоўна неспрыяльна. Сітуацыю можна патлумачыць рэальным дамінаваннем рускай мовы ў сферы бытавых зносін, у сродках масавай інфармацыі, у адукацыі і культуры. Можна прагназаваць, што далей колькасць твораў беларускай літаратуры на рускай мове будзе павялічвацца.

Важны параметр ДП БМЛ – пераклады твораў беларускай мастацкай літаратуры на іншыя мовы, паколькі пераклады дазваляюць, з аднаго боку, папулярызаваць беларускае мастацкае слова ў іншых краінах, а з іншага – чытаць на нацыянальнай мове творы замежных аўтараў. Увогуле колькасць апублікаваных перакладных твораў зусім невялікая – усяго 1,4 % ад усіх выданняў і публікацый у патоку. Больш за ўсё перакладаў з беларускай на рускую мову. Невялікая колькасць з рускай і польскай на беларускую, адзінкавыя прыклады на балгарскую і ўкраінскую.

### Пытанні для самакантролю

1. Назавіце асноўныя характарыстыкі ДП БМЛ.
2. Публікацыі на якой мове пераважаюць у ДП БМЛ?
3. Які жанр з'яўляецца найбольш распаўсюджаным у ДП БМЛ?
4. Якія часопісы з'яўляюцца профільнымі для БЛ і БМЛ?

## Заданні для самастойнай работы па тэме 2.1.

### Заданне № 1

*Мэта* – вывучыць спецыфіку бібліяметрычнага аналізу дакументных патокаў, вывучыць спецыфіку тыпа-відавога складу дакументых патокаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

*Пры дапамозе прапанаваных крыніц вывучыце:*

1. Методыку аналізу галіновага дакументнага патоку.
2. Тыпы і віды дакументаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

*Літаратура*

1. *Гордукалова, Г. Ф.* Документальный поток социальной тематики как объект библиографической деятельности : учеб. пособие / Г. Ф. Гордукалова ; Гос. ин-т культуры им. Н. К. Крупской. – Ленинград : ЛГИК, 1990. – 109 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*2. Гордукалова, Г. Ф.* Мониторинг документального потока для информационной диагностики прогнозируемых объектов : учеб. пособие / Г. Ф. Гордукалова. – М. : ИПКИР, 1991. – 140 с.

*3.* Справочник библиографа / науч. ред.: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб. : Профессия, 2014. – 768 с.

*4.* Типология изданий. – М. : Книжная палата, 1990. – 231 с.

## Заданне № 2

*Мэта* – атрымаць навыкі вывучэння і бібліяметрычнага аналізу дакументнага патоку беларускага літаратуразнаўства сферы навукі.

*Методыка выканання:*

I. Па бягучых дзяржаўных паказальніках «Летапіс друку Беларусі»: «Кніжны летапіс», «Летапіс часопісных артыкулаў», «Летапіс газетных артыкулаў» выявіць выданні беларускага літаратуразнаўства сферы навукі за 1–3 гады і запоўніць табліцы па наступных параметрах:

1) форма выдання прац беларускага літаратуразнаўства сферы навукі;

2) тэматыка літаратуразнаўчых прац;

3) віды навуковых дакументаў беларускага літаратуразнаўства па характары інфармацыі;

4) мова публікацый беларускага літаратуразнаўства сферы навукі;

5) серыі беларускага літаратуразнаўства сферы навукі;

6) публікацыі ў часопісах;

7) публікацыі ў газетах.

II. На падставе аналізу зрабіць высновы пра асноўныя характарыстыкі патоку беларускага літаратуразнаўства сферы навукі за пэўны перыяд.

**Форма выдання апублікаваных прац беларускага літаратуразнаўства сферы навукі**

| Год | Кнігі, брашуры | Аўтарэфераты дысертацый | Артыкулы з часопісаў, неперыядычных выданняў | Артыкулы з газет | Рэцэнзіі | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| Усяго | | | | | | |



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Тэматычная структура ДП беларускага літаратуразнаўства ў асобных выданнях

| Назва тэмы | Год, № летапісу | | | | | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | |
| Ваенная тэматыка | | | | | | |
| Гісторыя беларускай літаратуры | | | | | | |
| Іншыя тэмы | | | | | | |
| Літаратура беларускага замежжа | | | | | | |
| Літаратурнае краязнаўства | | | | | | |
| Літаратурная адукацыя | | | | | | |
| Літаратурная крытыка | | | | | | |
| Патрыятызм і служэнне Беларусі | | | | | | |
| Паэтыка | | | | | | |
| Персаналія | | | | | | |
| Пошук духоўных ідэалаў | | | | | | |
| Прастора і час | | | | | | |
| Сучасная беларуская літаратура | | | | | | |
| Тэорыя літаратуры | | | | | | |
| Узаемасувязі і ўзаемаўздзеянне літаратур | | | | | | |
| Усяго | | | | | | |

## Віды навуковых дакументаў беларускага літаратуразнаўства па характары інфармацыі

| Год | Апублікаваныя дакументы | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | навуковыя выданні манаграфічнага тыпу | манаграфіі | аўтарэфераты дысертацый | тэзісы дакладаў канферэнцый, з'ездаў | матэрыялы канферэнцый, з'ездаў | зборнікі навуковых артыкулаў | выбраныя творы | даследаванні і матэрыялы |
| | | | | | | | | |
| | | | | | | | | |
| Усяго | | | | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Моўная структура

| Год | Беларуская | Руская | Польская | Бел.+ рус. | Іншыя | Паралельны тэкст |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| Усяго | | | | | | |

## Серыі беларускага літаратуразнаўства

| Год | Назва серыі | Колькасць выданняў |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| Усяго | | |

## Публікацыі ў часопісах

| Год | Назва часопіса | Агульная колькасць публікацый |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| Усяго | | |

## Мова публікацый БЛ у часопісах

| Мова | Гады | | | Усяго |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| Беларуская | | | | |
| Руская | | | | |
| Польская | | | | |
| Англійская | | | | |
| Украінская | | | | |
| Усяго | | | | |

## Публікацыі ў газетах

| Год | Назва газеты | Агульная колькасць публікацый |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| Усяго | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Мова публікацый БЛ у газетах**

| Мова | Гады | | | Усяго |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| Беларуская | | | | |
| Руская | | | | |
| Польская | | | | |
| Англійская | | | | |
| Украінская | | | | |
| Усяго | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## З а д а н н е № 3

*Мэта* – атрымаць навыкі вывучэння і бібліяметрычнага аналізу дакументнага патоку беларускай мастацкай літаратуры.

*Методыка выканання:*

I. Па бягучых дзяржаўных паказальніках «Летапіс друку Беларусі»: «Кніжны летапіс», «Летапіс часопісных артыкулаў», «Летапіс газетных артыкулаў» выявіць выданні беларускай мастацкай літаратуры за 3 гады і запоўніць табліцы па наступных параметрах:

1) аўтары твораў беларускай мастацкай літаратуры і колькасць апублікаваных твораў;

2) жанры твораў беларускай мастацкай літаратуры (проза, паэзія, драматургія, публіцыстыка, фальклор, зборнікі твораў розных жанраў);

3) функцыянальна-мэтавае прызначэнне твораў: навуковыя (акадэмічныя і не акадэмічныя), навукова-масавыя, масавыя выданні;

4) выданні, розныя па структуры і складзе тэкстаў: монавыданні; зборнікі (аўтарскія; калектыўныя: анталогіі, альманахі, хрэстаматыі, краязнаўчыя, краіназнаўчыя, тэматычныя, твораў аднаго жанру, твораў розных жанраў; зборы твораў: поўны, мастацкіх твораў, твораў аднаго жанру; выбраныя творы);

5) серыі, у складзе якіх выходзяць выданні беларускай літаратуры;

6) мова, на якой надрукаваны твор;

7) публікацыі ў часопісах;

8) публікацыі ў газетах.

II. На падставе праведзенага аналізу зрабіць высновы пра асноўныя характарыстыкі дакументнага патоку беларускай мастацкай літаратуры за пэўны перыяд.

## Аўтарская структура БМЛ

| Аўтар | Колькасць выданняў |
|---|---|
| | |
| | |

## Жанравая структура выданняў БМЛ

| Год | Проза | Паэзія | Драматургія | Публіцыстыка | Фальклор | Зборнікі твораў аднаго жанру |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| Усяго | | | | | | |

## Функцыянальна-мэтавае прызначэнне БМЛ

| Год | Навуковыя | Навукова-масавыя | Масавыя |
|---|---|---|---|
| | | | |
| | | | |
| Усяго | | | |

## Структура і склад тэкстаў БМЛ

| Год | Монавыданні | Зборнікі | | | | | | | | | | Зборы твораў | | | Выбраныя творы |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | аўтарскія | калектыўныя | | | | | | | | | поўныя | мастацкіх твораў | твораў аднаго жанру | |
| | | | анталогія | альманах | хрэстаматыя | краязнаўчыя | тэматычныя | твораў аднаго жанру | твораў розных жанраў | краiназнаўчыя | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | | |
| Усяго | | | | | | | | | | | | | | | |

## Серыі беларускай мастацкай літаратуры

| Год | Назва серыі | Колькасць выданняў |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| Усяго | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Моўная структура выданняў БМЛ

| Год | Беларуская | Руская | Польская | Бел.+ рус. | Іншыя | Паралельны тэкст |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| Усяго | | | | | | |

## Публікацыі БМЛ у часопісах

| Год | Назва часопіса | Агульная колькасць публікацый |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| Усяго | | |

## Жанравая структура публікацый БМЛ у часопісах

| Год | Проза | Паэзія | Драматургія | Публіцыстыка | Фальклор |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |
| | | | | | |
| Усяго | | | | | |

## Моўная структура публікацый БМЛ у часопісах

| Мова | Гады | | | Усяго |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| Беларуская | | | | |
| Руская | | | | |
| Польская | | | | |
| Англійская | | | | |
| Украінская | | | | |
| Усяго | | | | |

## Публікацыі БМЛ у газетах

| Год | Назва газеты | Агульная колькасць публікацый |
|---|---|---|
| | | |
| | | |
| Усяго | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Жанравая структура публікацый БМЛ у газетах**

| Год | Проза | Паэзія | Драматургія | Публіцыстыка | Фальклор |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | |
| | | | | | |
| Усяго | | | | | |

**Моўная структура публікацый БМЛ у газетах**

| Мова | Гады | | | Усяго |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| Беларуская | | | | |
| Руская | | | | |
| Польская | | | | |
| Англійская | | | | |
| Украінская | | | | |
| Усяго | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### Заданне № 4

*Мэта* – азнаёміцца са структурай літаратурных перыядычных выданняў, атрымаць навыкі аналізу іх зместу.

*Методыка выканання:*

1. Вызначыць год заснавання, перыядычнасць, тыраж, якой установай выдаецца. Даць характарыстыку афармленню, якасці паперы, ілюстрацый.

2. Прааналізаваць структуру перыядычных літаратурных выданняў за год. Вызначыць пастаянныя і часовыя рубрыкі, ці ёсць бібліяграфічная інфармацыя і якога кшталту.

3. Прааналізаваць змест, назваць пастаянных аўтараў, жанры, мову. Зрабіць агляд найбольш значных і цікавых з вашага пункта гледжання публікацый.

4. На падставе праведзенага аналізу зрабіць высновы пра актуальнасць перыядычнага выдання, характар публікацый, ступень папулярнасці і запатрабаванасці, адпаведнасць часу і спадзяванні чытачоў.

5. Прааналізаваць электронныя версіі перыядычных выданняў і колькасць зваротаў да іх (навігацыя, дызайн і г. д.).

Літаратурныя перыядычныя выданні, якія могуць быць выкарыстаны пры выкананні работы: «Літаратура і мастацтва», «Культура», «Полымя», «Маладосць», «Нёман», «Роднае слова».

## ТЭМА 2.2. СПЕЦЫФІКА ПАТОКУ БІБЛІЯГРАФІЧНЫХ РЭСУРСАЎ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

Другі ўзровень структуры ІРМЛЛ утварае масіў другасных дакументаў. Для ІР БМЛЛ асноўным яго элементам з'яўляецца дакументальна зафіксаваная бібліяграфічная інфармацыя, што абумоўлівае неабходнасць вывучэння і аналізу яе сучаснага стану ў мэтах выяўлення праблем фарміравання адпаведных рэсурсаў і забяспечанасці галіны.

За больш чым стогадовы перыяд развіцця бібліяграфія беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства (МЛЛ) назапасіла значны масіў крыніц. Першыя спецыяльныя дапаможнікі былі створаны яшчэ ў пачатку ХІХ ст. Як самастойная сістэма беларуская літаратурная бібліяграфія сфарміравалася ў пасляваенны перыяд і дасягнула свайго росквіту ў 60-х–80-х гг. ХХ ст., калі была створана сістэма навукова-дапаможных і рэкамендацыйных рэтраспектыўных і бягучых паказальнікаў у галіне БЛ і БМЛ, якая працягвала развівацца да пачатку ХХІ ст. Аднак у апошняе дзесяцігоддзе ХХ ст. сітуацыя пагоршылася. Было выдадзена няшмат асобных паказальнікаў, у асноўным персанальных. Не развівалася сістэма навукова-дапаможных агульналітаратурных, тэматычных паказальнікаў. Сістэма рэкамендацыйных і вучэбна-дапаможных бібліяграфічных крыніц не папоўнілася значнай колькасцю асобнікаў і буйных прыкніжных спісаў. Самай распаўсюджанай формай выдання з'яўляліся прыартыкульныя бібліяграфічныя спісы ў перыядычных выданнях. Асобнага звяна бягучай навукова-дапаможнай літаратурнай бібліяграфіі не існавала. Бягучая бібліяграфічная інфармацыя рэкамендацыйнага характару перыядычна публікавалася ў паказальніку «Новыя кнігі БССР» (пазней «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку»), у штогодніках «Літаратура і мастацтва БССР» (пазней «Беларуская мова, літаратура, мастацтва»).

Па пытанню забяспечанасці спецыялістаў бягучай галіновай інфармацыяй можна адзначыць, што сёння бягучы галіновы навукова-дапаможны паказальнік адсутнічае, а замест яго

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выкарыстоўваюцца дзяржаўныя бібліяграфічныя паказальнікі Нацыянальнай кніжнай палаты Рэспублікі Беларусь «Кніжны летапіс», «Летапіс часопісных артыкулаў», «Летапіс газетных артыкулаў», у якіх бібліяграфічная інфармацыя змяшчаецца ў раздзелах 821.161.1 Літаратура Беларусі на рускай мове, 821.161.3 Беларуская літаратура, 882.6.0 Тэорыя вывучэння беларускай літаратуры, 37 Адукацыя. Выхаванне. Навучанне. Арганізацыя вольнага часу.

Бягучы галіновы рэкамендацыйны паказальнік «Беларуская мова, літаратура, мастацтва» НББ апошні раз выйшаў у 2003 г. У ім прадстаўлена інфармацыя за 2001 г. Адзінай крыніцай бягучай рэкамендацыйнай інфармацыі з'яўляецца штомесячны бюлетэнь «Новыя кнігі: па старонках беларускага друку», дзе ў якасці дадаткаў публікуюцца бібліяграфічныя спісы па беларускай мастацкай літаратуры. Такім чынам, можна адзначыць, што бягучая галіновая бібліяграфічная інфармацыя ў галіне беларускага літаратуразнаўства і беларускай мастацкай літаратуры адсутнічае.

Пераважаюць у патоку несамастойныя выдавецкія формы (98 %), прычым найбольш распаўсюджанымі з'яўляюцца прыартыкульныя спісы. Асобна выдадзеныя дапаможнікі займаюць апошняе месца – усяго 2 % – і носяць персанальны характар. Яны ўтрымліваюць творы пісьменнікаў і літаратуру пра іх.

Найбольш бібліяграфічна забяспечанай у патоку з'яўляецца тэма «Персаналіі», значна меншая доля бібліяграфічнай прадукцыі прыпадае на такія тэмы, як «Жанры беларускай літаратуры», «Гісторыя беларускай літаратуры», «Літаратурныя стылі», «Мастацкі вобраз», «Літаратурнае краязнаўства». Астатнія тэмы маюць даволі сціплае бібліяграфічнае забеспячэнне.

Бібліяграфаваннем дакументаў займаюцца бібліятэкі, навуковыя, вучэбныя ўстановы і арганізацыі, музеі, профільныя часопісы. Найбольш плённай у гэтым накірунку з'яўляецца праца выдавецкіх цэнтраў вышэйшых навучальных устаноў, якія маюць кафедры беларускай літаратуры БДУ, БрДУ, ВДУ, МгДУ, ГрДУ, БДПУ, а таксама Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Самы прадукцыйны сярод часопісаў – «Роднае слова». Бібліяграфічная інфармацыя ў профільных літара-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

турна-мастацкіх часопісах адсутнічае. Што тычыцца бібліятэк, то іх працу нельга лічыць поўнасцю здавальняючай. Крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі складаліся толькі Мінскай, Магілёўскай і Віцебскай абласнымі бібліятэкамі. Цяпер сітуацыя выпраўляецца. Бібліяграфічная інфармацыя пра мясцовых пісьменнікаў, пераважна краязнаўчага характару, ствараецца ўсімі публічнымі бібліятэкамі.

Традыцыйна найбольш бібліяграфічна забяспечанай з'яўляецца дзейнасць такіх пісьменнікаў, як Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, У. Караткевіч, К. Чорны.

Бібліяграфічныя прадукты БЛ сферы адукацыі прадстаўлены толькі несамастойнымі выдавецкімі формамі – прыартыкульнымі спісамі, спісамі літаратуры ў падручніках, вучэбных і метадычных дапаможніках, у падрадковых заўвагах і ў канцы тэм, раздзелаў. Найбольш бібліяграфічна аснашчаныя тэмы – «Гісторыя беларускай літаратуры», «Персаналіі», «Выкладанне беларускай літаратуры». Вялікая колькасць бібліяграфічных дапаможнікаў публікуецца ў часопісах «Беларуская мова і літаратура» і «Роднае слова».

У патоку бібліяграфічных дапаможнікаў БМЛ больш за ўсё прадстаўлены несамастойныя выдавецкія формы, у прыватнасці, бібліяграфічныя спасылкі ў падрадковых заўвагах, у каментарыях, прыкніжныя спісы.

Што тычыцца выдавецкай структуры патоку, то паколькі бібліяграфічная інфармацыя прадстаўлена ў асноўным несамастойнымі формамі, то найбольшая колькасць публікацый прыходзіцца на «Кнігазбор», што рэгулярна выпускае навукова-масавыя выданні твораў беларускіх аўтараў, традыцыйна аздабляючы іх бібліяграфічнай інфармацыяй: бібліяграфічнымі спасылкамі ў падрадковых заўвагах, у каментарыях, у тэксце. Некаторыя бібліяграфічныя дапаможнікі невялікім тыражом выходзяць непасрэдна ў бібліятэках, у асноўным, у абласных. Яны носяць пераважна персанальны і краязнаўчы характар.

Да крыніц другаснай інфармацыі адносяцца таксама каталогі і картатэкі бібліятэк. У многіх бібліятэках створаны галіновыя ці тэматычныя картатэкі па беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўству, напрыклад, картатэка «Беларускае літаратуразнаўства і персаналіі» ў аддзеле беларускай літаратуры Віцебскай абласной бібліятэкі імя Ул. Леніна. Такія крыніцы,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

калі яны не канвертаваны ў электронную форму і не маюць анлайнавага доступу, могуць выкарыстоўвацца толькі чытачамі пэўнай бібліятэкі, што не дазваляе забяспечыць інфармацыйныя патрэбнасці шырокага кола карыстальнікаў.

Важным звяном другаснага ДП БМЛЛ з'яўляюцца электронныя бібліяграфічныя рэсурсы. У канцы XX – пачатку XXI ст. склаліся пэўныя яго элементы. Да іх адносяцца: электронныя каталогі бібліятэк, Зводны электронны каталог бібліятэк Беларусі, бібліяграфічныя і фактаграфічныя базы даных (БД), у асноўным створаныя ў бібліятэках, электронныя выданні. Электронныя каталогі НББ, абласных бібліятэк рэспублікі, бібліятэк вышэйшых навучальных устаноў, напрыклад, Фундаментальнай бібліятэкі БДУ, даступны анлайн і дазваляюць атрымаць інфармацыю пра ІР БМЛЛ.

Акрамя таго, бібліятэкамі створаны ўніверсальныя, шматгаліновыя, персанальныя, тэматычныя, краязнаўчыя, камбінаваныя базы даных, якія можна выкарыстоўваць як крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі па БМЛЛ. У якасці прыкладу можна прывесці БД НББ «Беларусь: ад мінулага да сучаснага», фактаграфічную БД «Беларусь у асобах і падзеях», тэматычныя электронныя калекцыі. Крыніцай інфармацыі па БМЛЛ таксама можа быць і «Нацыянальная база даных аўтарытэтных / нарматыўных запісаў», складальнікі якой адзначаюць, што такія запісы могуць быць выкарыстаны як самастойны даведачны рэсурс пры выкананні фактаграфічных запытаў. Гэты ўнікальны рэсурс мае несумненную перавагу перад друкаванымі бібліяграфічнымі дапаможнікамі, можа хутка папаўняцца і забяспечвае аператыўны і надзейны пошук. БД «Radziviliana» прадстаўляе бібліяграфічныя запісы на дакументы калекцыі прыватнай бібліятэкі Радзівілаў у Нясвіжы. Комплексная БД «Чарнобыль» утрымлівае інфармацыю па розных аспектах аварыі на Чарнобыльскай АЭС, у тым ліку і адлюстроўвае дакументы БМЛЛ. БД «Электронная бібліятэка дысертацый, якія абаронены ў Рэспубліцы Беларусь» змяшчае электронныя копіі дысертацый па беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўству.

Электронныя выданні БМЛЛ, якія ўтрымліваюць бібліяграфічную інфармацыю, нешматлікія. Напрыклад, выданне НББ «"Не пакідайце ж мовы нашай беларускай…": да 170-годдзя з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дня нараджэння Францішка Багушэвіча (1840–1900)», куды ўвайшлі бібліяграфія твораў і бібліяграфічны спіс публікацый пра жыццё і творчую дзейнасць пісьменніка, і першы карпаратыўны мультымедыйны рэсурс новага тыпу – віртуальная рэканструкцыя «Спадчына Юзафа Ігнацы Крашэўскага».

Такім чынам, існуючая сістэма бібліяграфічнай інфармацыі не ў поўнай меры адпавядае сучасным патрабаванням. Слаба развіваюцца як рэчавыя, так і электронныя бібліяграфічныя рэсурсы БМЛЛ. Невялікая колькасць рэчавых дакументаў не можа адлюстраваць увесь спектр існуючых інфармацыйных рэсурсаў галіны ні ў іх бягучым стане (галіновыя навукова-дапаможныя і рэкамендацыйныя паказальнікі ўвогуле не існуюць), ні ў рэтраспекцыі, паколькі створаныя ў XX ст. бібліяграфічныя дапаможнікі не атрымалі працягу, а новыя не складаліся. Сістэма электронных бібліяграфічных рэсурсаў знаходзіцца ў пачатковым стане і патрабуе значных намаганняў для далейшага развіцця.

### Пытанні для самакантролю

1. Калі сфарміравалася самастойная сістэма беларускай літаратурнай бібліяграфіі?
2. Як развівалася беларуская літаратурная бібліяграфія ў апошняе дзесяцігоддзе XX ст.?
3. Апішыце забяспечанасць спецыялістаў бягучай бібліяграфічнай інфармацыяй па БМЛ і БЛ.
4. Ці існуе бягучы галіновы рэкамендацыйны бібліяграфічны паказальнік?
5. Якія формы бібліяграфічнай інфармацыі пераважаюць у патоку другасных дакументаў БМЛЛ?
6. Назавіце электронныя бібліяграфічныя рэсурсы БМЛЛ.

### Заданне для самастойнай работы па тэме 2.2.

*Мэта* – атрымаць навыкі вывучэння і бібліяметрычнага аналізу патокаў другасных дакументаў беларускага літаратуразнаўства і мастацкай літаратуры.

*Методыка выканання:*

І. Па бягучым дзяржаўным «Паказальніку бібліяграфічных дапаможнікаў» выявіць крыніцы бібліяграфічнай інфармацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускага літаратуразнаўства і мастацкай літаратуры за 1–3 гады і запоўніць табліцы па наступных параметрах:

1. Структура другаснага ДП БЛ сферы навукі па форме выдання.

2. Адлюстраванне творчасці беларускіх пісьменнікаў у бібліяграфічных дапаможніках БЛ сферы навукі.

3. Аналіз другаснага ДП БМЛ па формах выдання ў адпаведнасці з персаналіямі беларускіх пісьменнікаў.

II. На падставе праведзенага аналізу зрабіць высновы пра асноўныя характарыстыкі другасных патокаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства за 1–3 гады.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Структура другаснага ДП БЛ сферы навукі па форме выдання**

| Гады | Асобнае бібліяграфічнае выданне | Несамастойныя выдавецкія формы | | | | | | | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | прыкніжныя спісы | унутрыкніжныя спісы | бібліяграфічныя спасылкі ў падрадковых заўвагах | прыартыкульныя спісы | бібліяграфічныя спасылкі ў тэксце | бібліяграфія ў канцы раздзелаў, тэм | бібліяграфія ў канцы дакладаў | |
| | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | |
| Усяго | | | | | | | | | |

**Адлюстраванне творчасці беларускіх пісьменнікаў у бібліяграфічных дапаможніках БЛ сферы навукі**

| Прозвішча пісьменніка | Гады | | | Усяго |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |
| | | | | |
| | | | | |

**Аналіз другаснага ДП БМЛ па формах выдання
ў адпаведнасці з персаналіямі беларускіх пісьменнікаў**

| Персаналіі | Асобныя бібліяграфічныя дапаможнікі | Прыкніжныя спісы | Унутрыкніжныя | | | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | бібліяграфічныя спасылкі ў каментарыях | бібліяграфічныя спасылкі ў падрадковых заўвагах | бібліяграфічныя спасылкі ў тэксце | |
| Год | | | | | | |
| | | | | | | |
| Усяго | | | | | | |
| Год | | | | | | |
| | | | | | | |
| Усяго | | | | | | |

## ТЭМА 2.3. ХАРАКТАРЫСТЫКА ІНТЭРНЭТ-РЭСУРСАЎ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

Інтэрнэт – глабальная камп’ютарная сетка, сёння з’яўляецца сусветнай віртуальнай бібліятэкай, якой карыстаюцца больш за два мільярды чалавек у свеце, што складае каля 35 % насельніцтва планеты. Асаблівае значэнне набывае забеспячэнне шырокага інтэрнэт-доступу да рэсурсаў нацыянальнай мастацкай літаратуры, бо гэта дазваляе шырока прадставіць культурныя здабыткі той ці іншай нацыі.

Для захавання і папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры неабходна ствараць электронныя бібліятэкі. Гэта забяспечыць, па-першае, пашырэнне доступу грамадзян нашай краіны да нацыянальных рэсурсаў мастацкай літаратуры, а па-другое, далучэнне прадстаўнікоў іншых краін да культурных здабыткаў нашага народа. Маючы на ўвазе, што ІР мастацкай літаратуры сканцэнтраваны ў бібліятэках, асноўныя намаганні павінны прадпрымаць найбуйнейшыя з іх. Маніторынг беларускіх і замежных пошукавых сістэм і аналіз выяўленых інтэрнэт-рэсурсаў БМЛЛ сведчыць пра сціплае прадстаўленне нацыянальнай літаратуры ў сусветнай інфармацыйнай прасторы і недастатковую ролю бібліятэк у гэтым працэсе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Звесткі пра ІР БМЛЛ можна знайсці ў айчынных і замежных пошукавых каталогах і сістэмах. Сярод беларускіх каталогаў найбольш інфарматыўнымі з'яўляюцца http://catalog.tut.by, http://poisk.com, http://akavita.by, http://br.by, http://zubr.com. Аднак трэба адзначыць, што яны прызначаны толькі для атрымання агульнага ўяўлення пра прадстаўленыя ў інтэрнэце ІР БМЛЛ. Найбольш шырокімі магчымасцямі адлюстравання азначаных рэсурсаў валодаюць замежныя пошукавыя метасістэмы Google, Яndex, Rambler і нацыянальныя tut.by, all.by. Найбольш эфектыўнымі Google і Яndex, індэксныя файлы якіх утрымліваюць максімум інфармацыі, адпаведнай тэме запыту. Астатнія пошукавыя сістэмы дублююць інфармацыю, прычым менш сістэмна і рэлевантна.

Інтэрнэт-рэсурсы па тэме «Беларуская літаратура» мэтазгодна класіфікаваць па тыпе кантэнту і па спосабе стварэння рэсурсу. Асноўным крытэрыем з'яўляецца тып кантэнту, паколькі ён дазваляе размежаваць сайты, якія з'яўляюцца поўнасцю галіновымі і адлюстроўваюць толькі рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, і сайты, змест якіх часткова тычыцца ІР БМЛЛ.

Па тыпе кантэнту інтэрнэт-рэсурсы БМЛЛ падзяляюцца на *ўласна літаратурныя* і *змешанага кантэнту*.

Да *ўласна літаратурных* адносяцца сайты, кантэнт якіх складаюць тэксты твораў, рэцэнзіі, крытыка, тэарэтычныя матэрыялы, біяграфіі пісьменнікаў, навіны сучаснага беларускага літаратурнага жыцця, бібліяграфічная інфармацыя. Сярод іх вылучаюцца: электронныя бібліятэкі; электронныя літаратурна-мастацкія часопісы і газеты; персанальныя сайты аўтараў, перакладчыкаў, літаратуразнаўцаў.

Электронныя бібліятэкі па змесце прадстаўленых ведаў дыферэнцуюцца на:

– *галіновыя* («Беларуская палічка» http://www.knihi.com, «Белорусская электронная библиотека» http://lib.na.by, «Белорусская цифровая библиотека» http://library.by/, «Бібліятэка беларускай літаратуры» http://bellib.org/, «Літара.net» http://litara.net/, «Камунікат» http://kamunikat.org/; «Знічка: творы па-беларуску» http://znichka.ucoz.com/, а таксама http://litaratura.org, http://slovo.ws/bio/bel/;

– *жанравыя* (сайт для пісьменнікаў-пачаткоўцаў http://proza.by/,

нацыянальны паэтычны партал «Вершы беларускіх паэтаў» http://vershy.ru/, беларускіх казак http://kazki.by, http://kazka.at.tut.by, http://dzietki.org/, http://kazki.unicef.by/;

– *тэматычныя электронныя бібліятэкі беларускай паэзіі* http://soneyka.ru, http://sledvainy.ru, http://zaviruha.ru, http://moykahany.ru і інш..

*Электронныя літаратурна-мастацкія часопісы і газеты* прадстаўлены сеткавымі аналагамі друкаваных перыядычных выданняў, напрыклад «Маладосць» zviazda.by/be/edition/maladosc, «Полымя» zviazda.by/be/edition/polymya, «Вясёлка» http://www.veselka.by/, «Літаратура і мастацтва» zviazda.by/be/edition/litaratura-i-mastactva і інш.

*Персанальныя сайты* (напрыклад Леаніда Дайнекі http://www.daineka.by/ru/, Уладзіміра Караткевіча http://karatkevich.ru/, Максіма Багдановіча http://maksimbogdanovich.ru/, Рыгора Барадуліна http://www.baradulin.by/ і інш.), як правіла, змяшчаюць біяграфічныя звесткі, тэксты некаторых твораў, фота, відэа, навіны, каментарыі і інш. Некаторыя сайты маюць зваротную сувязь з карыстальнікамі.

*На сайтах змешанага кантэнту* ІР БМЛЛ прадстаўлены ў кантэксце апісання дзейнасці пэўных устаноў ці арганізацый, апублікавання навін, інфармацыі вучэбнага, даведачнага кшталту, ажыццяўлення міжасабовай і прафесійнай камунікацыі. Такія сайты дыферэнцыруюцца на сайты ўстаноў і арганізацый, фактаграфічныя, адукацыйныя рэсурсы, стужкі навін, старонкі ў сацыяльных медыя.

*Сайты ўстаноў і арганізацый*, якія змяшчаюць інфармацыю пра БМЛЛ, прадстаўлены сайтамі навуковых устаноў (напрыклад, Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі); бібліятэк (Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, абласных, цэнтральных раённых і іншых бібліятэк); навучальных устаноў; выдавецтваў («Мастацкая літаратура», РВУ «Выдавецкі дом “Звязда”», «Белорусский Дом печати» і інш.); кніжных інтэрнэт-магазінаў.

Некаторыя *фактаграфічныя інтэрнэт-рэсурсы* ўніверсальнага, галіновага, тэматычнага кшталту прадстаўляюць энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі па беларускай мастацкай літаратуры («Slounik.org: беларускія слоўнікі і энцыклапедыі» http://www.slounik.org/about).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Адукацыйныя рэсурсы*, якія прадстаўляюць кантэнт для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, навучэнцаў, змяшчаюць метадычныя матэрыялы і невялікую колькасць тэкстаў беларускіх твораў («Віртуальны кабінет беларускай мовы і літаратуры» http://belkabinet.by/, «Добры настаўнік» http://dobri-nastavnik.ru/, «Настаўнік.info» http://nastaunik.info/workshop/for-teacher/biellit/, сачыненні, рэфераты, дыпломы, курсавыя работы па літаратуры http://belklass.com/, http://institut.by/index.php?module=view_id&vid=2205).

*Стужкі навін* утрымліваюць інтэрв'ю, выступленні пісьменнікаў, навіны літаратурнага жыцця, рэкламу літаратурных мерапрыемстваў, прэзентацыю твораў і інш.

*Інфармацыя ў сацыяльных медыя* на сучасным этапе з'яўляецца важнай часткай інтэрнэт-рэсурсаў БМЛЛ, дае магчымасць карыстальнікам кантактаваць паміж сабой праз сацыяльныя сеткі, блогі, форумы, вікі-рэсурсы. Пры гэтым рэалізуецца нефармальная камунікацыя паміж прафесійнымі аўтарамі, літаратуразнаўцамі, крытыкамі і аматарамі літаратуры. Ствараюцца ўмовы для абмеркавання кніжных навінак, падзей літаратурнага жыцця, рэкамендацыі твораў і абмену спасылкамі на рэсурсы. Адкрываюцца шырокія перспектывы для папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры. Перавагі электроннай камунікацыі мэтазгодна выкарыстоўваць бібліятэкам для стварэння мэтавых груп карыстальнікаў у сацыяльных сетках, прыцягнення іх да чытання беларускай мастацкай літаратуры, арганізацыі зваротнай сувязі з імі, рэкамендацыі лепшых твораў, таргеціраванай рэкламы бібліятэчных мерапрыемстваў. Многія беларускія аўтары і літаратуразнаўцы маюць свае старонкі ў сацыяльных сетках, вядуць персанальныя блогі.

Па спосабе стварэння інтэрнэт-рэсурсы БМЛЛ падзяляюцца на *алічбаваныя*, якія складаюць асноўную частку кантэнту (напрыклад, тэксты твораў у электронных бібліятэках, на персанальных сайтах і інш.) і *першапачаткова створаныя ў лічбавым фармаце* (напрыклад, інфармацыя ў сацыяльных медыя).

Большасць інтэрнэт-рэсурсаў утрымліваюць бібліяграфічную інфармацыю (спісы літаратуры ў электронных бібліятэках, на персанальных сайтах і сайтах літаратурна-мастацкіх часопісаў і газет, устаноў і арганізацый; спісы крыніц да электронных публікацый і інш.). З найбольшай паўнатой яна адлюстра-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вана на сайтах бібліятэк і прадстаўлена: 1) электроннымі каталогамі бібліятэк Беларусі (НББ, Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Прэзідэнцкай бібліятэкі, Фундаментальнай бібліятэкі БДУ, абласных бібліятэк і інш.) і замежных краін; 2) Зводным электронным каталогам бібліятэк Беларусі; 3) універсальнымі, галіновымі, тэматычнымі, персанальнымі, краязнаўчымі, камбінаванымі БД («Беларусь у асобах і падзеях», «Беларусь: ад мінулага да сучаснага», «Гісторыя Беларусі», «Культура і мастацтва Беларусі 1993–2007 гг.», «Чарнобыль»); 4) бібліяграфічнымі дапаможнікамі (універсальнымі, персанальнымі, тэматычнымі, краязнаўчымі); 5) бібліяграфічнымі спісамі, якія суправаджаюць віртуальныя бібліятэчныя выставы і праекты («У віры імклівага жыцця»: да 110-годдзя з дня нараджэння Міхася Зарэцкага, «“Сэрцам да подзвігу дакраніся”: да 100-годдзя з дня нараджэння Аркадзя Куляшова» і інш.).

Такім чынам, інфармацыя шматпланавая, аднак разрозненая і не сістэматызаваная. На жаль, не ўсе рэсурсы з'яўляюцца якаснымі, прафесійна падрыхтаванымі. Амаль усе рэсурсы – гэта сімбіёз літаратуразнаўства і мастацкай літаратуры. Сайты бібліятэк утрымліваюць у асноўным бібліяграфічную інфармацыю, звесткі пра бібліятэчныя праекты і мерапрыемствы, якія тычацца БМЛ, прадстаўляюць віртуальныя выставы і тэксты твораў.

Добрым прыкладам з'яўляецца сайт НББ, дзе прадстаўлены анлайн-праекты – мультымедыйныя рэсурсы, прысвечаныя юбілеям беларускіх пісьменнікаў «Класікі сусветнай літаратуры Янка Купала і Якуб Колас», «Віртуальнае падарожжа з Янкам Маўрам», якія ўтрымліваюць алічбаваныя тэксты ці ўрыўкі з тэкстаў, літаратуразнаўчую інфармацыю, аўдыявізуальныя дакументы. Творы на ваенную тэматыку прадстаўлены ў юбілейным праекце «Памяць палаючых гадоў», велікодныя вершы – у віртуальнай калекцыі «Пасха в Беларуси: коллекция из фондов библиотеки».

Найбольшая колькасць твораў беларускіх аўтараў змешчана на трох сайтах: «Беларуская палічка», «Белорусская электронная библиотека» і «Вершы беларускіх паэтаў».

Адным з першых рэсурсаў БМЛ у інтэрнэце з'яўляецца «Беларуская палічка» http://www.knihi.com, дзе змяшчаюцца



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэксты твораў беларускіх аўтараў, пераклады іх на рускую, англійскую, польскую, нямецкую мовы, пераклады замежных аўтараў на беларускую мову. Пошук ажыццяўляецца па раздзелах: проза, паэзія, драматургія і інш. У раздзеле «Проза» прадстаўлена 240 аўтараў, у раздзеле «Паэзія» – 214, у раздзеле «Драматургія» – 83 і 32 беларускія аўтары прадстаўлены ў раздзеле «Дзіцячая літаратура». Трэба адзначыць, што «Беларуская палічка» дастаткова зручны для карыстальніка рэсурс, які дазваляе хутка знайсці некаторыя тэксты твораў і атрымаць літаратуразнаўчую інфармацыю.

«Белорусская электронная библиотека» http://lib.na.by пазіцыянавалася як праект, накіраваны на рэалізацыю шырокага доступу да арыгінальных і перакладных твораў БМЛ, да перакладаў замежнай літаратуры на беларускую мову, што павінна садзейнічаць узаемнаму культурнаму абмену. На сёння праект прыпынены. Можна было атрымаць доступ да невялікай колькасці твораў 32 беларускіх аўтараў у раздзелах «Проза», «Паэзія», «Публіцыстыка», «Мемуары», «Рэлігійная літаратура», «Гістарычная літаратура», «Містыфікацыі». Перакладаў беларускіх твораў – 16: 4 з іх на балгарскую мову, па аднаму на кітайскую, літоўскую і ўкраінскую, 9 на рускую.

Прыватны некамерцыйны інтэрнэт-рэсурс «Белорусская цифровая библиотека» http://library.by/ утрымлівае больш за 100 тысяч публікацый навуковых артыкулаў, кніг, рэфератаў. Ёсць раздзел «Белорусский зал», дзе ў невялікай колькасці прадстаўлены беларуская проза і паэзія, нешматлікія пераклады твораў толькі на рускую мову.

Сярод літаратурных сайтаў, прысвечаных у асноўным сучаснай беларускай літаратуры, можна адзначыць інтэрнэт-бібліятэку «Камунікат» http://kamunikat.org, якая існуе з 2000 г. Падаюцца беларускія кнігі і часопісы, звесткі пра аўтараў, выдавецтвы, выдавецкія серыі, навіны літаратурнага жыцця. На сайце ёсць паўнатэкставыя версіі некаторых твораў і перыядычных выданняў.

Спынены на сёння літаратурны форум «Літара.net» http://litara.net/ існаваў як крыніца інфармацыі пра тэндэнцыі, напрамкі, стылі сучаснай беларускай літаратуры. Сайт складаецца з даведачнай інфармацыі пра беларускія выдавецтвы, арганізацыі, літаратурныя выданні, персаналіі, сучасную літара-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туру, рэцэнзій на кнігі, інтэрв'ю з аўтарамі і крытыкамі, з тэарэтычных матэрыялаў, аглядаў часопісаў, тэматычных рубрык. Ёсць звесткі пра 57 сучасных беларускіх аўтараў, даюцца гіперспасылкі на іх сайты ці тэксты твораў.

Сярод якасных сайтаў, прызначаных для дапамогі настаўнікам і навучэнцам, можна адзначыць «Віртуальны кабінет беларускай мовы і літаратуры» http://belkabinet.ucoz.ru/, які змяшчае метадычныя матэрыялы і рэкамендацыі, нарматыўныя дакументы, спасылкі на іншыя інтэрнэт-рэсурсы падобнага кшталту, тэксты некаторых твораў са школьнай праграмы, крытычныя артыкулы, рэкамендацыі і дапаможныя матэрыялы для вучняў.

Такім чынам, буйных прафесійных інтэрнэт-бібліятэк беларускай літаратуры няма. Наяўныя рэсурсы складзены намаганнямі энтузіястаў, некаторыя з'яўляюцца аматарскімі бібліятэчнымі праектамі, верагодна, маюць вельмі сціплае фінансаванне і не могуць якасна і поўна адлюстраваць увесь спектр нацыянальнай літаратуры. Акрамя таго, беларуская літаратура слаба прадстаўлена ў буйных замежных электронных бібліятэках. Толькі ў бібліятэцы Максіма Машкова http://lib.ru ёсць тэксты твораў шасці беларускіх пісьменнікаў: В. Быкава, Н. Гілевіча, У. Караткевіча, Я. Купалы, У. Шыціка (некаторыя з тэкстаў прадстаўлены па-беларуску) і даюцца спасылкі на беларускія сайты «Беларуская палічка», «Камунікат».

Такім чынам, можна канстатаваць слабае прадстаўніцтва беларускіх мастацкіх твораў у інтэрнэце. Яшчэ больш сціпла прадстаўлены беларускамоўныя творы і іх пераклады на іншыя мовы, што прыводзіць да немагчымасці шырокага міжкультурнага абмену. Перш за ўсе гэта вынік адсутнасці мэтанакіраванай прафесійнай дзейнасці.

Перспектыўным кірункам з'яўляецца стварэнне інтэрнэт-рэсурсаў, якія ў адзінай інфармацыйнай прасторы будуць аб'ядноўваць увесь спектр ІР БМЛЛ як краіны, так і асобных рэгіёнаў. Для адлюстравання нацыянальнай літаратуры ў рэгіянальным аспекце мэтазгодна стварэнне на базе абласных бібліятэк віртуальных літаратурных карт, якія будуць прадастаўляць даведачную інфармацыю пра пісьменнікаў, звязаных з рэгіёнам жыццём і творчасцю, тэксты некаторых іх тэкстаў, інфармацыю пра літаратурнае жыццё вобласці, навінкі, мерапрыем-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ствы, ІР бібліятэк, музеяў, магчымасць зваротнай сувязі з карыстальнікамі.

Паўната прадстаўлення ІР БМЛЛ у інтэрнэт-асяроддзі, зручны і эфектыўны іх пошук могуць быць дасягнуты з дапамогай спецыяльнага рэсурсу – самастойнага інтэрнэт-партала або інтэграванага ІР.

### Пытанні для самакантролю

1. У якіх пошукавых сістэмах і каталогах можна знайсці звесткі па тэме «Беларуская літаратура»?
2. Прывядзіце класіфікацыю інтэрнэт-рэсурсаў, дзе сканцэнтравана інфармацыя пра беларускую літаратуру.
3. Як падзяляюцца інтэрнэт-рэсурсы БМЛЛ па тыпе кантэнту і па спосабе стварэння рэсурсу?
4. На якіх сайтах змешчана найбольшая колькасць твораў беларускіх аўтараў?

### Заданне для самастойнай работы па тэме 2.3.

*Мэта* – азнаёміцца з інтэрнэт-рэсурсамі БМЛ і атрымаць навыкі іх аналізу.

*Методыка выканання:*

Пазнаёміцца з прапанаванымі сайтамі і зрабіць высновы пра якасць размешчанай інфармацыі:

1. «Беларуская палічка» http://knihi.com.
2. «Белорусская цифровая библиотека» http://library.by/.
3. «Літара.net» http://litara.net/.
4. «Камунікат» http://kamunikat.org/.
5. «Знічка: творы па-беларуску» http://znichka.ucoz.com/.
6. «Літаратура.org» http://litaratura.org.
7. «Вершы беларускіх паэтаў» http://vershy.ru/, http://kazki.by/, http://kazki.unicef.by/.
8. Саюз беларускіх пісьменнікаў http://lit-bel.org/.
9. http://ebooks.prestigioplaza.com/be/be/.
10. «Slounik.org: беларускія слоўнікі і энцыклапедыі» http://www.slounik.org/.
11. «Віртуальны кабінет беларускай мовы і літаратуры» http://belkabinet.ucoz.ru.
12. Kniharnia.by https://kniharnia.by/.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РАЗДЗЕЛ 3
# ПРАФЕСІЙНАЯ КАМПЕТЭНТНАСЦЬ БІБЛІЯТЭКАРА-БІБЛІЁГРАФА Ў СФЕРЫ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

## ТЭМА 3.1. ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА ЯК ПРАБЛЕМА І АДЗІН З АСНОЎНЫХ КІРУНКАЎ ДЗЕЙНАСЦІ ПУБЛІЧНЫХ БІБЛІЯТЭК

Для эфектыўнага функцыянавання ІР БМЛЛ у грамадстве неабходна рэалізацыя дзвюх умоў: 1) наяўнасць збалансаванай сістэмы дадзеных рэсурсаў і забеспячэнне свабоднага доступу да яе кампанентаў; 2) папулярызацыя праз установы сістэмы дакументных камунікацый і, у першую чаргу, публічныя бібліятэкі (у тым ліку і ўніверсальныя навуковыя) і бібліятэкі навучальных устаноў. Для рэалізацыі другой умовы патрабуецца мэтанакіраванае фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ, якое забяспечыць іх комплексам неабходных прафесійных ведаў, уменняў і практычным вопытам.

Пытанні павышэння эфектыўнасці распаўсюджання ІР БМЛЛ праз сістэму бібліятэк, прыцягнення карыстальнікаў да іх чытання недастаткова распрацаваны. Іх актуальнасць абумоўлена праблемнай сітуацыяй з выкарыстаннем беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, невялікай іх доляй у структуры чытання дзяцей і дарослых. Пра гэта сведчаць вынікі навуковага даследавання чытання моладзі, якое было праведзена ЦНБ імя Я. Коласа НАН Беларусі, дзіцячага чытання і чытацкай актыўнасці бацькоў, зладжанага НББ у 2009–2010 гг.[106],

[106] Современное состояние и тенденции развития детского чтения в Республике Беларусь: по результатам республиканского исследования / Нац. б-ка Беларуси ; сост.: М. Г. Пшибытко, О. В. Гаврилович. – Минск : Нац. б-ка Беларуси, 2011. – 155 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

у матэрыялах якога адзначана неабходнасць распрацоўкі комплекснай праграмы папулярызацыі беларускай літаратуры[107].

Вастрыня сітуацыі неаднаразова падкрэслівалася прадстаўнікамі дзяржаўных органаў, творчых колаў (пісьменнікамі, літаратуразнаўцамі), бібліятэкарамі[108]. Так, на другім з'ездзе Саюза пісьменнікаў Беларусі была адзначана важнасць папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры, неабходнасць супрацоўніцтва пісьменнікаў з установамі адукацыі, а таксама з бібліятэкамі і ініцыявана абвяшчэнне 2012 года Годам кнігі. Апошняя ініцыятыва была заканадаўча замацавана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнкі № 168 ад 30.12.2011 г. «Об объявлении 2012 года Годом книги», мэтай якога з'явілася павышэнне ролі і значнасці кнігі і чытання ў сучасным грамадстве, развіццё айчыннай літаратуры, забеспячэнне дзяржаўнай падтрымкі нацыянальнага кнігавыдання[109]. У межах Года кнігі бібліятэкамі і іншымі ўстановамі культуры былі праведзены шматлікія мерапрыемствы па папулярызацыі БМЛ. Міністэрствам культуры была распрацавана Сістэма мер, накіраваных на падтрымку і развіццё чытання ў Рэспубліцы Беларусь на 2013–2015 гг. (пункты 1.4; 3.3; 4.1; 4.3; 5.2 і інш.), на папулярызацыю лепшых твораў беларускай літаратуры.

У мэтах папулярызацыі нацыянальнай літаратуры з 2007 г. у краіне праводзіцца рэспубліканскі конкурс «Лепшы твор года» ва ўсіх жанрах літаратуры, у многіх абласных цэнтрах праходзяць літаратурныя фестывалі, у рэспубліцы створаны гурткі, літаратурныя аб'яднанні, якія ўзначальваюць члены Саюза пісьменнікаў Беларусі. Рэкламуецца творчасць маладых беларускіх літаратараў у межах некамерцыйных праектаў. Такім чынам, патрэбнасць у папулярызацыі найлепшых беларускіх твораў прызнаецца як на дзяржаўным, так і на грамадскім узроўнях.

Вядучая роля ў гэтым належыць бібліятэцы – сацыяльнаму інстытуту, функцыямі якога з'яўляюцца адукацыйная, выха-

---

[107] Современное состояние и тенденции развития детского чтения в Республике Беларусь: по результатам республиканского исследования / Нац. б-ка Беларуси ; сост.: М. Г. Пшибытко, О. В. Гаврилович. – Минск : Нац. б-ка Беларуси, 2011. – С. 23.

[108] Не размінуцца з Атлантыдай класікі. «Круглы стол» па выніках акцыі «Топ-10 любімых твораў беларускай класікі» // Полымя. – 2015. – № 3. – С. 154–170.

[109] Об объявлении 2012 года Годом книги [Электронный ресурс] : Указ Президента Респ. Беларусь, 30 дек. 2011 г., № 618 // Эталон. Законодательство Республики Беларусь / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2011.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ваўчая, асветніцкая, рэкрэацыйная, інфармацыйная, а адной з галоўных мэт дзейнасці – трансляцыя нацыянальных культурных каштоўнасцей у грамадстве. Таму неабходнай бачыцца падрыхтоўка бібліятэкараў-бібліёграфаў, якія разумеюць важнасць распаўсюджання нацыянальнай літаратуры, маюць устойлівую матывацыю і могуць працаваць на высокім прафесійным узроўні, інакш кажучы, валодаюць кампетэнцыямі ў сферы папулярызацыі БМЛЛ.

Фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці ў сферы папулярызацыі БМЛЛ на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый (ФІДК) Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (БДУКМ) мэтанакіравана не праводзіцца, а апасродкавана ажыццяўляецца на працягу ўсяго перыяду навучання ў межах агульнапрафесійных і спецыяльных вучэбных дысцыплін («Беларуская літаратура», «Педагогіка», «Сацыяльная псіхалогія», «Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк», «Інфармацыйныя рэсурсы мастацка-эстэтычнай сферы»), а таксама шматлікіх курсаў па выбару і дысцыплінах спецыялізацый. Праведзены аналіз зместу вучэбных праграм і кампетэнцый, сфарміраваных у іх межах, паказаў, што дысцыпліны не забяспечваюць развіццё прафесійнай кампетэнтнасці ў сферы папулярызацыі БМЛЛ, паколькі выкладзены матэрыял з'яўляецца не дастатковым для ажыццяўлення гэтай мэты і прадастаўляецца апасродкавана ў межах рэалізацыі іншых мэт навучання.

Такім чынам, праблемная сітуацыя, якая склалася з выкарыстаннем ІР БМЛЛ у грамадстве, сведчыць пра неабходнасць фарміравання ў бібліятэкараў-бібліёграфаў прафесійнай кампетэнтнасці ў сферы папулярызацыі БМЛЛ як неабходнай умовы распаўсюджання і выкарыстання ў грамадстве БМЛ і літаратуразнаўчых прац, рэалізацыі якасных праектаў па прыцягненні да іх чытання карыстальнікаў, што цяпер мэтанакіравана не ажыццяўляецца.

## Пытанні для самакантролю

1. Якія ўмовы патрабуюцца для эфектыўнага функцыянавання ІР БМЛЛ у грамадстве?

2. Для чаго неабходна фарміраванне прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЭМА 3.2. ПРАФЕСІЙНАЯ КАМПЕТЭНТНАСЦЬ БІБЛІЯТЭКАРА-БІБЛІЁГРАФА Ў СФЕРЫ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА: ЗНАЧЭННЕ, СТРУКТУРА, КРЫТЭРЫІ І ЎЗРОЎНІ СФАРМІРАВАНАСЦІ

Прафесійная кампетэнтнасць у сферы папулярызацыі БМЛЛ з'яўляецца структурным элементам сацыяльна-прафесійнай дзейнасці бібліятэкара-бібліёграфа, фарміраванне якой ажыццяўляецца ў сістэме адукацыйнага працэсу на ФІДК БДУКМ. Па меркаванні беларускіх спецыялістаў А. В. Макарава, Ю. С. Перфільева, В. Ц. Федзіна, кампетэнтнасць выпускніка ўстановы вышэйшай адукацыі ўключае чатыры групы прыватных кампетэнцый – сацыяльныя, інструментальныя, агульнапрафесійныя і спецыяльныя[110]. Прафесійная кампетэнтнасць у сферы папулярызацыі БМЛЛ адносіцца да групы спецыяльных і неабходна бібліятэкарам-бібліёграфам для працы па інфармацыйным забеспячэнні сферы вольнага часу і самаадукацыі.

Кампетэнтнасць – гэта інтэгратыўная ўласцівасць асобы, якая характарызуе яе імкненне і здольнасць (гатоўнасць) рэалізаваць свой патэнцыял (веды, уменні, вопыт, асобасныя якасці і інш.) для паспяховай дзейнасці ў пэўнай галіне[111].

*Прафесійная кампетэнтнасць бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ* – гэта інтэгратыўная якасць асобы, якая базуецца на ведах, уменнях і вопыце арганізацыі доступу карыстальнікаў да збалансаванай сістэмы ІР БМЛЛ, распрацоўкі і рэалізацыі праектаў, накіраваных на папулярызацыю БМЛЛ у працэсе інфармацыйна-бібліятэчнага абслугоўвання, і праяўляецца ў здольнасці прымяняць іх у практычнай дзейнасці з улікам сацыякультурнай сітуацыі, патрэб грамадства, развіцця літаратуры. Важна, каб спецыяліст меў матывацыю ажыццяўляць гэту прафесійную дзейнасць.

Неабходнымі элементамі азначанай кампетэнтнасці з'яўляюцца: цікавасць да беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўчых прац, упэўненасць у іх высокіх мастацкіх якасцях;

[110] Макаров А. В. Реализация компетентностного подхода в системах высшего образования: отечественный и зарубежный опыт. – Минск, 2015. – С. 49.

[111] Татур Ю. Г. Компетентностный подход в описании результатов и проектировании стандартов высшего профессионального образования : материалы ко второму заседанию методологического семинара. – М., 2004. – С. 7.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

разуменне значнасці і каштоўнасці беларускай мастацкай літаратуры для развіцця айчыннай і сусветнай культуры, для захавання нацыянальнай адметнасці; перакананасць у неабходнасці працы бібліятэкара па папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры сярод шырокага кола чытачоў, авалоданне спецыяльнымі ведамі, уменнямі і вопытам.

Кампетэнтнасць фарміруецца на падставе навыкаў у адзінстве з каштоўнаснымі арыентацыямі чалавека пры ўмове яго матываванасці, актуалізацыі эмацыянальна-валявой сферы. Кампетэнцыя – гэта веды, уменні і вопыт, неабходныя для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

Для ажыццяўлення дзейнасці па папулярызацыі БМЛЛ бібліятэкару-бібліёграфу неабходна валодаць спецыфічнымі прафесійнымі кампетэнцыямі, сфарміраванымі ў межах спецыяльнай вучэбнай дысцыпліны:

– ведаць спецыфіку беларускай мастацкай літаратуры як віду мастацтва, часткі нацыянальнай культуры і галіны дзейнасці, літаратуразнаўства як навукі і мець матывацыю і каштоўнасныя ўстаноўкі на самастойнае вывучэнне БМЛ і БЛ;

– мець здольнасць да папулярызацыі БМЛЛ у сваёй прафесійнай дзейнасці, імкнуцца да авалодання прафесійнай кампетэнтнасцю ў гэтай сферы, да атрымання адпаведных ведаў;

– валодаць асноўнымі паняццямі тэорыі інфармацыйных рэсурсаў (ведаць іх азначэнне, структуру, уласцівасці, прынцыпы, функцыі, класіфікацыю);

– ведаць асаблівасці першаснага і другаснага дакументных патокаў, інтэрнэт-рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства;

– умець арыентавацца ў інфармацыйных рэсурсах беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, як на традыцыйных, так і на электронных носьбітах, у прасторы Інтэрнэт і выкарыстоўваць іх у бібліятэчна-бібліяграфічным абслугоўванні;

– валодаць методыкай бібліяметрычнага аналізу галіновых рэсурсаў і ўмець рабіць на яго падставе абгрунтаваныя высновы пра сучасны стан і перспектывы развіцця сістэмы галіновых рэсурсаў, выкарыстоўваць гэтыя веды і ўменні пры арганізацыі доступу карыстальнікаў да кампанентаў сістэмы ІР БМЛЛ;

– умець выкарыстоўваць вынікі бібліяметрычнага аналізу для выпрацоўкі найбольш эфектыўных метадаў папулярызацыі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

беларускай мастацкай літаратуры і прыцягнення карыстальнікаў да яе чытання;

– ведаць псіхолага-педагагічныя асаблівасці розных тыпаў карыстальнікаў беларускай мастацкай літаратуры і валодаць спосабамі ажыццяўлення камунікацыі з імі;

– валодаць традыцыйнымі і інавацыйнымі формамі і метадамі папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры ў бібліятэках;

– умець весці дыялог, ясна выказваць свае меркаванні, аргументаваць думкі, выкарыстоўваць дзейсныя спосабы і метады эмацыянальнай і рацыянальнай перадачы інфармацыі.

Працэс фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ можа быць эфектыўным толькі пры мэтанакіраваным навучанні ў межах спецыяльна распрацаванай вучэбнай дысцыпліны «Інфармацыйныя рэсурсы беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства», выкладанне якой ажыццяўляецца па асобай методыцы і рэалізуецца на падставе комплексу спецыфічных педагагічных умоў.

Важнай задачай пры ажыццяўленні працэсу фарміравання вышэйзгаданай прафесійнай кампетэнтнасці з’яўляецца вызначэнне яе структуры, якую складаюць тры кампаненты: матывацыйна-каштоўнасны, кагнітыўны і дзейнасна-практычны.

Матывацыйна-каштоўнасны кампанент уключае матывы, мэты, патрэбы, каштоўнасныя ўстаноўкі асобы на самастойнае вывучэнне беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства як неабходнай умовы эфектыўнай працы і асобаснага развіцця. Наяўнасць станоўчай матывацыі – адна з найважнейшых умоў фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці ў сферы папулярызацыі БМЛЛ.

Кагнітыўны кампанент утрымлівае сістэму навукова-тэарэтычных ведаў у галіне інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства, неабходных для эфектыўнай працы з імі ў бібліятэцы. Практычная дзейнасць па стварэнні збалансаванай сістэмы ІР БМЛЛ, арганізацыі доступу карыстальнікаў да яе, папулярызацыі БМЛЛ можа быць эфектыўнай пры ўмове ведання асаблівасцей галіновых інфармацыйных рэсурсаў, іх уласцівасцей, прынцыпаў, функцый, спецыфікі галіновых дакументных патокаў, асаблівасцей папулярызацыі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нацыянальнай літаратуры і прымянення гэтых ведаў пры рабоце з карыстальнікамі.

Дзейнасна-практычны кампанент уключае веды пра традыцыйныя і інавацыйныя формы і метады працы айчынных і замежных бібліятэк па папулярызацыі нацыянальнай літаратуры; пра тэхналогіі масавых і групавых мерапрыемстваў, якія знаёмяць чытачоў з багаццем беларускай літаратуры, уменні ствараць іх новыя формы, практычна рэалізоўваць свае праекты; аналізаваць звесткі, дакладна выказваць думкі, перадаваць рацыянальную і эмацыянальную інфармацыю; падтрымліваць кантакты з карыстальнікамі бібліятэкі пры індывідуальнай і масавай рабоце, улічваючы псіхолага-педагагічныя, узроставыя, сацыяльна-дэмаграфічныя асаблівасці карыстальнікаў, а таксама спецыфіку бібліятэчнага асяроддзя; усталёўваць міжасабовыя сувязі з бібліятэкарамі-прафесіяналамі і прадстаўнікамі творчых колаў.

Для ацэнкі сфарміраванасці прафесійнай кампетэнтнасці можна вызначыць тры ўзроўні: нізкі, сярэдні, высокі. Пры нізкім узроўні матывы на самастойнае вывучэнне БМЛЛ слаба выражаны, цікавасць да іх папулярызацыі невялікая, няма пераканнасці ў сацыяльнай значнасці справы і важнай ролі бібліятэкара-бібліёграфа як папулярызатара нацыянальных культурных каштоўнасцей. Спецыяліст ведае адказы на асобныя пытанні тэорыі ІРМЛЛ, агульныя тэхналогіі падрыхтоўкі і правядзення бібліятэчных мерапрыемстваў, але звесткі недакладныя, павярхоўныя, бессістэмныя, не звязаны з папулярызацыяй БМЛЛ у практычнай дзейнасці. Называе некаторыя традыцыйныя і інавацыйныя спосабы ажыццяўлення папулярызацыі нацыянальнай літаратуры ў бібліятэках. Часткова валодае некаторымі ўменнямі па падрыхтоўцы і правядзенні імпрэз, арганізацыі зносін з чытачамі, але можа дзейнічаць толькі па ўзоры, не праяўляе самастойнасці, актыўнасці і крэатыўнасці пры рэалізацыі творчых заданняў. У сітуацыях камунікацыі пасіўны, не можа весці дыялог, аргументавана выказваць свае погляды наконт беларускай літаратуры, выразна перадаваць эмацыянальныя і рацыянальныя веды, культура мовы – нізкая.

Пры сярэднім узроўні прафесійнай кампетэнтнасці матывы на самастойнае вывучэнне БМЛЛ выказаны дастаткова, пры-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сутнічае цікавасць да яе, разуменне сацыяльнай значнасці справы і важнай ролі бібліятэкара як транслятара нацыянальных культурных каштоўнасцей. Супрацоўнік ведае тэарэтычныя асновы ІРМЛЛ, можа назваць псіхолага-педагагічныя асаблівасці чытачоў, асэнсоўвае важнасць гэтых навыкаў пры індывідуальнай і масавай рабоце. Веды сярэднія па аб'ёме, упарадкаваныя, структураваныя. Можа звязаць тэорыю і практыку па папулярызацыі беларускай літаратуры. Называе традыцыйныя і інавацыйныя спосабы ажыццяўлення папулярызацыі нацыянальнай літаратуры ў бібліятэках і выкарыстоўвае іх пры распрацоўцы сваіх праектаў. Дастаткова ведае тэхналогію падрыхтоўкі бібліятэчных мерапрыемстваў, валодае асноўнымі ўменнямі па іх правядзенні, арганізацыі зносін з чытачамі. Пры рэалізацыі творчых заданняў праяўляе самастойнасць, актыўнасць і крэатыўнасць, дзейнічае не толькі па ўзоры, а прапаноўвае свае формы і метады. Можа весці дыялог, ясна выказваць меркаванні, у асноўным перадае эмацыянальныя і рацыянальныя веды, мае высокую культуру мовы.

Пры высокім узроўні прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкар-бібліёграф мае ўстойлівую станоўчую матывацыю на самастойнае вывучэнне БМЛЛ, цікавасць да яе папулярызацыі, перакананасць у сацыяльнай значнасці справы і важнай ролі бібліятэкара як транслятара нацыянальных культурных каштоўнасцей. Спецыяліст добра ведае тэорыю ІРМЛЛ, псіхолага-педагагічныя асаблівасці чытачоў і практычна выкарыстоўвае свае навыкі. Веды ўпарадкаваныя, структураваныя, сістэмныя. Выкарыстоўвае традыцыйныя і інавацыйныя спосабы ажыццяўлення папулярызацыі нацыянальнай літаратуры ў бібліятэках. Добра ведае тэхналогію правядзення бібліятэчных мерапрыемстваў, арганізуе камунікацыю з чытачамі, праяўляе самастойнасць, актыўнасць і крэатыўнасць, пастаянна імкнецца прапанаваць свае формы і метады дзейнасці, рэалізуе новыя праекты па папулярызацыі нацыянальнай літаратуры. Можа весці дыялог, аргументаваць свае думкі, перадаваць эмацыянальныя і рацыянальныя веды, выдатна валодае культурай мовы, кантактуе з прадстаўнікамі творчых колаў, спецыялістамі.

### Пытанні для самакантролю

1. Што такое прафесійная кампетэнтнасць бібліятэкараўбібліёграфаў у сферы папулярызацыі БМЛЛ?

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2. Якімі спецыфічнымі прафесійнымі кампетэнцыямі неабходна валодаць бібліятэкару-бібліёграфу для ажыццяўлення дзейнасці па папулярызацыі БМЛЛ?

3. Назавіце кампаненты, што складаюць структуру прафесійнай кампетэнтнасці ў сферы папулярызацыі БМЛЛ. Якія ўзроўні вылучаны для ацэнкі яе сфарміраванасці?

**Заданні для самастойнай работы па тэме 3.2.**

Заданне № 1

*Мэта* – падрыхтаваць электронную выставу-прэзентацыю творчасці беларускіх пісьменнікаў з выкарыстаннем традыцыйных і інавацыйных форм для пэўнай катэгорыі чытачоў.

*Методыка выканання:*

1. Азнаёміцца з прыкладамі электронных выстаў-прэзентацый адпаведнай тэматыкі на сайтах айчынных і замежных бібліятэк.
2. Вызначыць асобу беларускага пісьменніка, творчасці якога будзе прысвечана выстава. Абгрунтаваць актуальнасць (пісьмова).
3. Акрэсліць мэты, задачы выставы, катэгорыю карыстальнікаў, апісаць іх псіхолага-педагагічныя асаблівасці. Аргументаваць выбар твораў і спосаб прэзентацыі з улікам чытачоў (пісьмова).
4. Вывучыць крытычныя матэрыялы пра пісьменніка.
5. Азнаёміцца з асноўнымі творамі.
6. Падабраць крыніцы для выставы з фонду бібліятэкі, інтэрнэту.
7. Даць назву выставе, асноўным яе раздзелам.
8. Падрыхтаваць выставу ў форме мультымедыйнай прэзентацыі.
9. Аформіць гіперспасылкі на тэксты твораў і крытычныя матэрыялы ў інтэрнэце.

Заданне № 2

*Мэта* – авалодаць методыкай арганізацыі і правядзення ў бібліятэцы мерапрыемстваў, што папулярызуюць творчасць нацыянальных аўтараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Методыка выканання:*

1. Самастойна знайсці прыклады і выявіць спецыфіку айчынных і замежных традыцыйных і інавацыйных мерапрыемстваў, прысвечаных папулярызацыі творчасці нацыянальных аўтараў.

2. Вызначыць тэму мерапрыемства, пісьмова абгрунтаваць яе выбар.

3. Акрэсліць актуальнасць, мэты, задачы мерапрыемства, катэгорыю карыстальнікаў, апісаць іх псіхолага-педагагічныя асаблівасці.

4. З улікам псіхолага-педагагічных асаблівасцей карыстальнікаў абраць форму правядзення і распрацаваць методыку падрыхтоўкі мерапрыемства, пісьмова патлумачыць свой выбар.

5. Вывучыць неабходныя літаратурна-крытычныя матэрыялы.

6. Напісаць сцэнарый і сцэнарны план мерапрыемства.

7. Распрацаваць рэкламныя матэрыялы.

## Заданне № 3

Запоўніце анкету на праверку сфарміраванасці матывацыйна-каштоўнаснага кампанента прафесійнай кампетэнтнасці ў сферы папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства.

**1. Лічу, што:**

а) у беларускай мастацкай літаратуры шмат таленавіта напісаных твораў, як класічных, так і сучасных;

б) вартыя ўвагі выключна класічныя творы;

в) цікавыя толькі творы сучасных беларускіх пісьменнікаў;

г) у беларускай літаратуры мала таленавітых твораў;

д) беларуская мастацкая літаратура не ўяўляе сабой нічога асаблівага;

е) іншае________________________________________________.

**2. Ці чытаеце вы творы беларускай мастацкай літаратуры?**

а) так, з задавальненнем;

б) не, чытаю толькі творы, неабходныя па праграме;

в) не, не чытаю зусім;

г) не магу сказаць, што беларуская мастацкая літаратура мяне вельмі цікавіць, але іншы раз чытаю творы, якія здаюцца мне добрымі;

д) іншае________________________________________________.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**3. Што падахвочвае вас да чытання беларускай літаратуры?** *(Можна выбраць некалькі варыянтаў адказу)*

а) эстэтычнае і эмацыянальнае задавальненне ад цікавага сюжэту і мастацкай дасканаласці твораў беларускай літаратуры;

б) прыемнае правядзенне вольнага часу;

в) фармальная неабходнасць для выканання вучэбнага задання;

г) усведамленне таго, што гэта патрэбна мне для будучай прафесійнай дзейнасці;

д) веданне нацыянальнай літаратуры неабходна любому адукаванаму чалавеку;

е) кожны беларус павінен ведаць сваю літаратуру;

ж) ніякі матыў не вымушае чытаць беларускую літаратуру;

з) інтэлектуальнае і эстэтычнае развіццё;

і) выхаванне сябе як маральнай і духоўнай асобы;

к) іншае________________________________________________.

**4. Ці лічыце вы неабходным ажыццяўляць папулярызацыю беларускай мастацкай літаратуры ў сваёй будучай прафесійнай дзейнасці?**

а) так, лічу гэта патрэбным, бо беларуская літаратура вельмі цікавая, але шырокае кола чытачоў не ведае яе;

б) не, беларуская літаратура не цікавая і няма сэнсу ў яе папулярызацыі;

в) не, добрыя творы і так знойдуць свайго чытача;

г) іншае________________________________________________.

**5. Які матыў заахвоціў бы вас займацца папулярызацыяй беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства ў будучай прафесійнай дзейнасці ў бібліятэцы?**

а) творчая рэалізацыя;

б) мне гэта складана і не цікава;

в) знаёмства з новымі людзьмі;

г) самаўдасканаленне сваёй асобы;

д) магчымасць паказаць карыстальнікам свет беларускай мастацкай літаратуры і паўплываць на іх эстэтычнае, маральнае, інтелектуальнае развіццё;

е) атрыманне ўзнагароджання;

ж) іншае ________________________________________________.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**6. Што можа натхніць вас на вывучэнне беларускіх літаратуразнаўчых і літаратурна-крытычных прац?** *(Можна выбраць некалькі варыянтаў адказу)*

а) усведамленне, што гэта неабходна мне ў будучай прафесійнай дзейнасці;

б) выпрацоўка асабістай кропкі гледжання на творы і праблемы;

в) інтэлектуальнае развіццё;

г) цікавасць да праблем і пытанняў беларускай літаратуры і літаратуразнаўства;

д) іншае__________________________________________________.

**7. Ці развіваеце вы сваю крэатыўнасць, творчыя здольнасці для эфектыўнай працы па папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства?**

а) так, лічу гэта неабходным, бо эфектыўна працаваць можна толькі пры выкарыстанні асабістага патэнцыялу;

б) не, раблю па ўзоры, бяру матэрыялы, распрацаваныя іншымі людзьмі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВЫНІКОВЫ ТЭСТ

Выберыце правільны адказ.

**1. Інфармацыйныя рэсурсы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства – гэта:**

а) эстэтычная інфармацыя, замацаваная на матэрыяльным носьбіце;

б) сукупнасць дакументаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства як на традыцыйных, так і на электронных носьбітах;

в) электронныя дакументы мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства;

г) сукупнасць мастацка-вобразных і навуковых ведаў, зафіксаваных на розных матэрыяльных носьбітах;

д) сукупнасць эстэтычных і навуковых даных, зафіксаваных на матэрыяльных носьбітах;

ж) сукупнасць эстэтычнай і навуковай інфармацыі;

з) цяжка адказаць.

**2. У склад уласцівасцей інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства ўваходзяць:**

а) атрыбутыўныя і спецыфічныя;

б) агульныя метасістэмныя і спецыфічныя;

в) атрыбутыўныя, прагматычныя і спецыфічныя ўласцівасці галіновых рэсурсаў;

г) агульныя метасістэмныя, спецыфічныя, дапаўняльныя;

д) цяжка адказаць.

**3. Да спецыфічных уласцівасцей інфармацыйных рэсурсаў мас**тацкай літаратуры адносяцца (выбраць некалькі варыянтаў адказу):

а) інтэлектуальны кампанент ведаў;

б) мікра- і макразгортванне інфармацыі;

в) эстэтычны характар ведаў;

г) вобразна-мастацкая форма прадастаўлення матэрыялу;

д) магчымасць пераводу мастацка-вобразнай інфармацыі ў іншую знакавую сістэму;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

е) духоўна-асобасны характар;

ж) унікальнасць і інварыянтнасць мастацкага тэксту;

з) цяжка адказаць.

**4. Да спецыфічных уласцівасцей інфармацыйных рэсурсаў літаратуразнаўства адносяцца (выбраць некалькі варыянтаў адказу):**

а) мікра- і макразгортванне інфармацыі;

б) адсутнасць старэння інфармацыі;

в) навукова-эстэтычны характар ведаў;

г) больш марудны, чым у іншых галінах, працэс старэння інфармацыі;

д) мадэляванне;

е) цяжка адказаць.

**5. Да прыватных прынцыпаў інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства адносяцца (выбраць некалькі варыянтаў адказу):**

а) паўнаты;

б) селектыўнасці;

в) квантуемасці;

г) дакладнасці;

д) спалучэння адукацыі і забаўлення;

е) цэласнасці;

ж) аб'ектыўнасці;

з) цяжка адказаць.

**6. Да спецыяльных функцый інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры адносяцца (выбраць некалькі варыянтаў адказу):**

а) эстэтычная;

б) пазнавальная;

в) інфармацыйнага забеспячэння адукацыі;

г) тэксталагічная;

д) духоўна-камунікатыўная;

е) гісторыка-літаратурная;

ж) аксіялагічная;

з) бібліятэрапеўтычная;

і) мемарыяльная;

к) этнагенетычная;

л) цяжка адказаць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**7. Да спецыяльных функцый інфармацыйных рэсурсаў літаратуразнаўства адносяцца (выбраць некалькі варыянтаў адказу):**

а) інфармацыйнага забеспячэння навукі;

б) літаратурна-крытычная;

в) гісторыка-літаратурная;

г) аксіялагічная;

д) эмацыянальная;

е) эстэтычная;

ж) уліковая;

з) мадэлюючая;

і) крыніцазнаўчая;

к) выхаваўчая;

л) цяжка адказаць.

**8. Да неабходных параметраў класіфікацыі інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры і літаратуразнаўства адносяцца:**

а) фармальныя, функцыянальныя, змястоўныя;

б) фармальныя, змястоўныя;

в) функцыянальныя, змястоўныя;

г) цяжка адказаць.

Адкажыце на пытанні.

**9. Якія прыметы з'яўляюцца неабходнымі для класіфікацыі ІРМЛЛ?**

________________________________________________________

**10. Як класіфікуюцца ІРМЛ па спосабе стварэння і выкарыстання ведаў у межах эстэтычнай і навуковай камунікацыі?** ___________

________________________________________________________

**11. Назавіце дзве падсістэмы, на якія падзяляюцца ўсе ствараемыя ІРМЛЛ:** __________________________________________

________________________________________________________

Выберыце правільны адказ.

**12. Адзначце тыпы выданняў мастацкай літаратуры:**

а) навуковае;

б) папулярнае;

в) навукова-масавае;

г) масавае;

д) навукова-папулярнае.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**13. Адзначце профільныя беларускія літаратурна-мастацкія перыядычныя выданні:**

а) «Нёман»;

б) «Роднае слова»;

в) «Полымя»;

г) «Маладосць»;

д) «Беларуская мова і літаратура».

**14. Выберыце сайты, на якіх размяшчаюцца творы беларускай мастацкай літаратуры:**

а) «Беларуская палічка»;

б) «Камунікат.org»;

в) «Літара.net»;

г) «Белорусская электронная библиотека»;

д) «Слоўнік.org»;

е) «Библиотека белорусской литературы»;

ж) «Беларуская кніжніца»;

з) цяжка адказаць.

**15. Ці існуе галіновы бягучы навукова-дапаможны паказальнік па беларускай мастацкай літаратуры?**

а) так;

б) не.

**16. Які жанр беларускай мастацкай літаратуры з'яўляецца самым распаўсюджаным?**

а) раман;

б) аповесць;

в) апавяданне;

г) паэма;

д) верш;

е) камедыя;

ж) трагедыя;

з) драма;

і) цяжка адказаць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адкажыце на пытанні.

**17. Акрэсліце асноўныя праблемы беларускай мастацкай літаратуры.** ______________________________________________

______________________________________________________________

**18. Назавіце формы мерапрыемстваў па папулярызацыі беларускай мастацкай літаратуры, якія праводзяцца ў айчынных бібліятэках.** ______________________________________________

______________________________________________________________

**19. Якім чынам бібліятэкі замежных краін робяць прамоцыю нацыянальнай літаратуры?** ______________________________________

______________________________________________________________

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*Асноўны*

1. *Антопольский, А. Б.* Информационные ресурсы России : науч.-метод. пособие / А. Б. Антопольский. – М. : Либерия, 2004. – 424 с.

2. *Беляева, Н. Е.* Интернет-ресурсы художественной литературы : практ. пособие / Н. Е. Беляева. – М. : Литера, 2012. – 144 с. – (Современная библиотека).

3. *Гордукалова, Г. Ф.* Мониторинг документального потока для информационной диагностики прогнозируемых объектов : учеб. пособие / Г. Ф. Гордукалова, Л. А. Юдина. – М. : ИПКИР, 1991. – 109 с.

4. *Давыдова, М. И.* Рекомендательная литературная библиография как средство формирования художественной культуры общества / М. И. Давыдова. – М. : МГИК, 1993. – 56 с.

5. *Коршунов, О. П.* Принципы библиографической деятельности / О. П. Коршунов // Мир библиографии. – 2000. – № 5. – С. 11–13.

6. *Леончиков, В. Е.* Информационные ресурсы. Теоретический аспект / В. Е. Леончиков // Інфармацыйныя рэсурсы бібліятэк і іх кадравае забеспячэнне : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 23–26 мая 2000 г. – Мінск, 2000. – С. 62–65.

7. *Раманава, Ж. Л.* Бібліяграфія твораў Янкі Купалы і літаратуры аб ім / Ж. Л. Раманава, В. Давідовіч // Янка Купала : энцыклапедыя : у 3 т. / рэдкал.: У. У. Андрыевіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2017. – Т. 1. – С. 126–129.

8. *Романова, Ж. Л.* Интернет-ресурсы белорусской художественной литературы и литературоведения как составляющая современной книжной культуры / Ж. Л. Романова // Берковские чтения. Книжная культура в контексте международных контактов: к 500-летию белорусского книгопечатания : материалы IV Междунар. науч. конф., Полоцк, 24–25 апр. 2017 г. – Минск, 2017. – С. 320–326.

9. *Раманава, Ж. Л.* Праблемы і перспектывы функцыянавання інфармацыйных рэсурсаў беларускай мастацкай літаратуры ў грамадстве / Ж. Л. Раманава // Современные проблемы книжной культуры: основные тенденции и перспективы развития : материалы V Междунар. науч. семинара, Минск, 19–20 апр. 2016 г. – Минск, 2016. – С. 197–202.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*10. Раманава, Ж. Л.* Уласцівасці інфармацыйных рэсурсаў мастацкай літаратуры / Ж. Л. Раманава // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2018. – № 1 (29). – С. 147–154.

*11.* Справочник библиографа / науч. ред.: Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – СПб. : Профессия, 2014. – 768 с.

*12. Столяров, Ю. Н.* Документный ресурс / Ю. Н. Столяров. – М. : Либерия, 2001. – 149 с.

*13. Шадриков, В. Д.* Новая модель специалиста: инновационная подготовка и компетентностный подход / В. Д. Шадриков // Высшее образование сегодня. – 2004. – № 8. – С. 26–31.

*Дадатковы*

*1. Антопольский, А. Б.* Проблемы классификации информационных ресурсов по критериям информационной безопасности / А. Б. Антопольский // Информ. ресурсы России. – 1997. – № 6. – С. 7–12.

*2. Беляева, Н. Е.* Применение литературно-художественных интернет-ресурсов в библиотечно-информационном обслуживании / Н. Е. Беляева // Книга и мировая культура : материалы V Междунар. науч.-практ. конф., Омск, 21–22 апр. 2010 г. – Омск, 2010. – С. 187–190.

*3. Берёзкина, Н. Ю.* Создание и использование электронных информационных ресурсов в библиотеках Беларуси : моногр. / Н. Ю. Берёзкина, Л. А. Авгуль, Б. Б. Невский ; науч. ред. Р. Б. Григянец. – Минск : Красико-Принт, 2002. – 144 с.

*4. Гордукалова, Г. Ф.* Документальный поток социальной тематики как объект библиографической деятельности : учеб. пособие / Г. Ф. Гордукалова ; Гос. ин-т культуры им. Н. К. Крупской. – Ленинград : ЛГИК, 1990. – 108 с.

*5. Давыдова, М. И.* Библиография художественной литературы и литературоведения: объект, специфика, функции, научная основа / М. И. Давыдова. – М. : МГУКИ, 2002. – 21 с.

*6. Давыдова, М. И.* Современная отечественная литературная библиография – направления и особенности развития / М. И. Давыдова. – М. : МГУК, 1998. – 18 с.

*7. Зубов, Ю. С.* Библиография и художественное развитие личности : моногр. / Ю. С. Зубов. – М. : Книга, 1979. – 144 с.

*8. Лотман, Ю. М.* Структура художественного текста / Ю. М. Лотман // Об искусстве / Ю. М. Лотман. – СПб., 1998. – С. 14–288.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*9. Паршукова, Г. Б.* Компетенции современного библиотекаря в контексте европейских квалификационных рамок / Г. Б. Паршукова // Библиотечное дело. – 2008. – № 20. – С. 22–25.

*10. Равен, Дж.* Компетентность в современном обществе: выявление, развитие и реализация : пер. с англ. / Дж. Равен. – М. : Когито-Центр, 2002. – 395 с.

*11. Сляднева, Н. А.* Библиография в системе Универсума человеческой деятельности: опыт системно-деятельностного анализа : моногр. / Н. А. Сляднева. – М. : МГИК, 1993. – 225 с.

*12. Суминова, Т. Н.* Информационные ресурсы художественной культуры (артосферы) / Т. Н. Суминова. – М. : Академический проект, 2006. – 480 с. – (Технологии культуры).

*13. Суминова, Т. Н.* Художественная культура как информационная система (мировоззренческие и теоретико-методологические основания) / Т. Н. Суминова. – М. : Академический проект, 2006. – 383 с. – (Технологии культуры).

*14.* Типология изданий. – М. : Книжная палата, 1990. – 231 с.

*15. Юхновец, Т. С.* Информационные ресурсы библиотеки: проблемы определения и классификации / Т. С. Юхновец // Менеджмент университетской библиотеки : материалы Междунар. семинара, Новополоцк, 21–23 мая 2002 г. / сост. Н. А. Яцевич. – Минск, 2002. – С. 130–135.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**Раманава** Жанна Леанідаўна

# ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ РЭСУРСЫ БЕЛАРУСКАЙ МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

*Вучэбна-метадычны дапаможнік*

Рэдактар В. А. Ляйкоўская
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2020. Фармат 60x84 $^{1}/_{16.}$
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 8,08. Ул.-выд. арк. 6,36. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ